Андрэй Жвалеўскі
Яўгенія Пастэрнак

# СІЯМЦЫ



Андрэй Жвалеўскі
Яўгенія Пастэрнак

# СІЯМЦЫ

*Пераклала з рускай*
*Станіслава Умец*

Мінск
Выдавец А. М. Янушкевіч
2020

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-44
Ж41

Пераклад з рускай Станіславы Умец
паводле выдання: Жвалевский А., Пастернак Е.
Сиамцы. М.: Время, 2017.

Мастачка Ганна Мельнікава

**Жвалеўскі, А. В., Пастэрнак, Я. Б.**
Ж41 Сіямцы : [аповесць] / Андрэй Жвалеўскі, Яўгенія Пастэрнак ; пер. з рус. Станіславы Умец. — Мінск : А. М. Янушкевіч, 2020. — 234 с.
ISBN 978-985-7210-33-6.

Калі двое шаснаццацігадовых людзей створаны адно для аднаго, але ўпарта не разумеюць гэтага, умешваюцца ірацыянальныя сілы. Родны горад Мінск намагаецца атуліць іх любоўю, зводзіць разам, падключае ўсё новых памочнікаў...

Аднак героі з дзіўнай упартасцю не хочуць бачыць відавочнае. Дачытайце гэтую гісторыю — і вы зразумееце, што ўсе містычныя супадзенні ў вашым жыцці былі невыпадковыя. Вас кахаюць, трэба толькі навучыцца не адштурхоўваць гэтае каханне.

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-7210-33-6**

© Жвалевский А. В., Пастернак Е. Б., 2017
© Умец С. В., пераклад на беларускую мову, 2020
© Афармленне, выданне на беларускай мове. Выдавец А. М. Янушкевіч, 2020

— Вітанкі! Ізноў вы на канале «Сіямцюб»!

— І з вамі зноўку мы, вашы сіямскія вядоўцы! Геула... — назвалася дзявочая галава.

— І Янула! — заківала хлапечая.

Вядоўцы ўсміхнуліся на ўсе свае шэсцьдзясят чатыры зубы. Дакладней, на шэсцьдзясят, бо ў Геулы ў яе шаснаццаць зубы мудрасці яшчэ не прарэзаліся. І памахалі левай (дзявочай) і правай (хлапечай) рукамі. Тулава сіямцаў ахутваў шырачэзны тоўсты швэдар з двума каўнярамі для дзвюх галоў.

— Пачынаем, як заўсёды, з пытанняў... — Ян стаў круціць колца мышкі, праглядаючы каменты да апошняга выпуску «Сіямцюба».

— І, як заўсёды, — уздыхнула дзявочая галава, — самае папулярнае пытанне: як мы вядзём блог разам?

— Разумееце, — патлумачыў Ян, — у нас адзін мозг на дваіх.

— Таму мы... — працягнула Геула.

— Папросту не можам пасварыцца... — перапыніў Ян.

— Гэта была б шызафрэнія, — сказала Геула.

— А мы цалкам нармальныя! — у адзін голас скончылі сіямцы і разам пырснулі смехам.

— І пра бацькоў, і пра аперацыю па раздзяленні, — уздыхнуў Ян, — мы ўжо сто разоў адказвалі. Каму цікава, паглядзіце чацвёрты або дзясяты выпуск... Што тут яшчэ?.. У якім класе навучаемся? У дзявятым... Гэта тупа... Пра гэта ўжо таксама пыталіся...

— А во нешта цікавае! — узрадавалася Геула. — «Увесь час вы ў сваім пекным швэдрыку...» Дзякі! Мы стараліся! «А не хочаце купіць нармальных шмотак?» Ян! Давай! Мне таксама гэты швэдар надакучыў! Давай пашопімся!

— Думаеш, варта? — насупіўся Ян. — У нашых крамах, здаецца, няма адзення для сіямскіх блізнят...

— А давай праверым! І пакажам, што атрымалася!

Ян і Геула кіўнулі адно аднаму, усміхнуліся ў камеру, секунду пачакалі — і Ян спыніў запіс.

— Слухай, — умольна папрасіў ён, — а давай і праўда нешта іншае апранаць! У мяне пасля твайго швэдра ўсё цела свярбіць!

— Памыем — будзе як новы! Давай фінал запішам!

Ян азвярэла паскроб шыю, тужліва ўздыхнуў і ўключыў запіс.

— Як бачыце, — засмяялася Геула, — эксперымент праваліўся!

— Не шыюць нічога на такіх, як мы, — зажурыўся Ян.

— Затое нарагаталіся! Якія твары ў іх былі! У прадаўшчыц!

— Калі ведаеце, як даць рады нашай праблеме, — Ян спяшаўся згарнуць запіс, — пішыце ў каментах!

— Падпісвайцеся на канал, стаўце падабайкі, з вамі былі вашы сіямцы, а тымчасам пакуль!

Геула развітальна памахала рукой, Ян спакутавана ўсміхнуўся і выключыў камеру. Потым сцягнуў з сябе колкі швэдар і пачаў з асалодаю чухацца. Геула таксама вызвалілася ад сіямскай уніформы і не ўтрымалася — ускочыўшы, пацерлася спінай аб шафу.

— Заўтра ж памыю! — пастанавіла яна, складаючы швэдар. — З якім-небудзь змякчальнікам. А ты сёння зробіш мантаж, так? Там і праўда файны рэпартаж у крамах атрымаўся!

— Тры гадзіны ў гэтым клятым швэдры, — прабурчаў Ян. — Калі б яшчэ і рэпартаж не атрымаўся...

Геула цмокнула напарніка ў макаўку і залыпала вочкамі.

— Але ж ты мантаж зробіш? Так? Так?

— Сёння не, — Ян стаў чухацца з падвоенай энергіяй. — У мяне справы.

— Ясна, — адразу здалася Геула і нявінна дадала: — Кашулю пераапрані. У цябе пляма на пузе.

— Навошта? — Ян дэманстратыўна пацепнуў плячыма. — У мяне сустрэча з рэпетытарам.

— Ага. І ў душ схадзі. Іначай будзеш чухацца ўвесь час. Не кожнаму... рэпетытару гэта даспадобы.

Ян чмыхнуў, але чухацца кінуў. Геула выцягнула тэлефон і тыцнула ў значок на галоўным экране.

— Хай, Кастусь! Ну што, хадзем куды-небудзь?.. Мы з Янам ужо ўсё на сёння... А я скуль ведаю? Куды запросіш, туды і пойдзем... О'кей, на Зыбіцкай праз паўгадзіны!

Геула выключыла тэлефон, прыязна ўсміхнулася і паўтарыла:

— А кашулю ўсё ж такі пераапрані, добра?

Геула сышла. Ян паказаў ёй у спіну язык і стаў расшпільваць кашулю.

* * *

Ян чакаў Дарыну каля сцяны з бразільскім графіці. У руках ён трымаў два кубачкі кавы.

— Здароў! — сказала Дарына і цмокнула Яна ў шчаку. — А ты чаму заўсёды такі выгалены?! Давай ты пару дзён не паголішся! Будзеш вожыкам! Давай?!

— Паспрабую неяк, — адказаў Ян.

«Калі хоць нешта на падбароддзі расці пачне», — падумаў ён.

Дарына тым часам сербанула кавы і прыжмурылася, бы котка:

— Латэ! З карамеллю! Ты такі файны! Спакойны заўсёды. Быццам ЦТ* зусім цябе не парыць!

— Падумаеш, — пацепнуў плячыма Ян, — неяк здам...

І зноў у думках скончыў: «Праз два гады».

— Я ўся на нервах, — паскардзілася Дарына, — зусім спаць не магу! Па пяць гадзін на дзень у рэпетытараў! Мне ж трэба гісторыю Расіі даздаваць! У маскоўскіх ВНУ ведаеш які прахадны бал...

Ян стрымана кіўнуў. За апошні месяц ён даволі шмат даведаўся пра розніцу паміж беларускім ЦТ і расійскім ЕГЭ**, пра цяжкі лёс мінскіх абітурыентаў у Расіі, рэпетытараў і нервы Дарыны. Ён павалокся вуліцаю і ўключыў рэжым «Так-так, я слухаю», час ад часу ківаючы.

Мінск быццам назнарок рассейваў ягоную ўвагу: на сцяне «Цэха»*** вісела яркая афіша «Глядзець

* Цэнтралізаванае тэсціраванне.

** Адзіны дзяржаўны іспыт (расійскі аналаг ЦТ).

*** Адзін з цэнтраў культурнага жыцця мінскай моладзі, арганізаваны ў апусцелым заводскім цэху. Тут ладзіліся нефар-

і бачыць: чытай знакі лёсу». Па рэйках прагрукатаў экскурсійны трамвай, поўны стымпанкераў. «Гайда з намі!» — гукалі з вокнаў дзіўна апранутыя людзі. Нейкая кампанія ўзялася рыхтаваць пляцоўку для гульні ў «гарадкі» і ўжо расцягнула транспарант «Вярніся да вытокаў!». Якраз насупраць увахода ў дом, дзе некалі знаходзілася «СІТРА»*. І дзе Ян з Геулай столькі ўсяго наздымалі.

* * *

«Добра было б тут, на Зыбіцкай, паздымаць, — думала Геула, спускаючыся сходамі на галоўную тусовачную вуліцу Мінска, — трэба Яну сказаць!»

І адразу ўбачыла Кастуся. Ацаніла спартыўную торбу цераз плячо.

— З трэніроўкі ці на? — спытала яна, падыходзячы.

— На, — уздыхнуў Кастусь. — Тата праз сорак хвілін падхопіць каля кансерваторыі.

— Значыцца, у нас паўгадзіны… Куды пойдзем?

Кастусь акінуў вокам шэраг кавярняў.

— Хадзем у «Дэпо», — прапанаваў ён. — Якія планы на лета?

* * *

— …Ты мяне ўвогуле чуеш? — Дарына паторгала Яна за рукаў так, што хлопец ледзь не расплюхаў каву. — Я кажу, з інтэрнатам там праблемы, а зды-

мальныя выставы, лекцыі ды інш.

* «Студыя інавацыйнага творчага развіцця і адукацыі».

маць пакой у Маскве ведаеш колькі каштуе?! Але я ўжо ўсё прыдумала! Здыму пакой з кім-небудзь. З кімсьці, хто таксама з Мінска. Удваіх мы пакой адужаем, так? — Дарына пагладзіла яго па шчацэ. — Не, напраўду, адгадуй шчэць! Мне спадабаецца!

Ян кіўнуў са спазненнем.

— Ты пра што думаеш? — Дарына патузала хлопца за нос.

— Ды так... — Ян заміргаў. — Куды паступаць.

— Ты ж, здаецца, збіраўся ў наш палітэх?

— Я пакуль не надумаў. Можа, таксама ў Маскву рушыць?

Ян уважліва паглядзеў на Дарыну.

— Ура! — яна залпам дапіла каву. — Хоць нехта знаёмы ў мяне там будзе!

Дарына працягвала нешта казаць, але Ян не слухаў. У яго спела ідэя.

* * *

У «Дэпо» было зашмат народу, і Кастусь пацягнуў Гэлю на вуліцу. Шукаючы іншую кавярню, ён разважаў пра мора, летні адпачынак і прыстойныя гатэлі, прыкладам, у Балгарыі. Геула слухала з усё большым здзіўленнем, але пагаджалася, што мора, адпачынак і гатэль — гэта было б добра.

— Слухай, — не вытрымала яна, калі Кастусь выйшаў на трэцяе кола. — Ты ўсё гэта да чаго?

— Сюды зойдзем! — Кастусь рашуча расчыніў дзверы.

Не паспелі яны сесці ў плеценыя фатэлі, як з'явіўся ўсмешлівы афіцыянт, запаліў свечку і сышоў з замовай на дзве кавы і адзін эклер.

— Выгадна цябе па кавярнях вадзіць, — сказаў Кастусь. — Салодкага ты не ясі...

— Дык што там з морам? — перапыніла Геула.

Кастусь адкрыў быў рот, але ў гэты момант Мінск кінуў сонечны прамень у адчыненую фортку, зайчык адлюстраваўся ад шкла і...

— Уі-і! — данёсся з вуліцы немы дзявочы віскат.

Наведнікі бліжэйшых кавярняў высыпалі вонкі.

Пасярод Зыбіцкай стаяла клаўнэса на дыбах. У руках яна трымала пустую скрынку, а па брукаванцы скакала змесціва — дзясяткі рознакаляровых каўчукавых мячыкаў.

— Я незнарок, — ледзь не плакала клаўнэса, — мне зайчык у вока бліснуў. Дапамажыце, людзі добрыя, мне праз пяць хвілін выступаць каля ратушы.

Добраахвотнікі — і Гэля ў першых шэрагах — кінуліся збіраць мячыкі і закідваць клаўнэсе ў скрынку.

А сонечны зайчык, адлюстраваўшыся шмат разоў, паспеў даляцець да Кастрычніцкай.

* * *

Ян ужо збіраўся падзяліцца сваёй ідэяй з Дарынай, калі раптам за сантыметр ад ягонай галавы нешта праляцела.

— Выбачайце! — закрычалі гульцы ў «гарадкі». — Мы незнарок! Алесю ў вока сонца засвяціла!

Ян усміхнуўся і памахаў ім рукой.

* * *

Калі мячыкі былі пазбіраныя, а клаўнэса сто разоў сказала «дзякуй» і пакрочыла ў бок ратушы,

Геула вярнулася да Кастуся. Выгляд у яго быў вельмі незадаволены.

— Ну дык што? — спытала Гэля, але Кастусь зноў не паспеў адказаць.

У заплечніку Геулы зазваніў тэлефон.

— Гэля, ратуй! — папрасіла маці. — Тэрміновая замова: мука і цукар.

— Сёння ж серада! — здзівілася Геула.

— Гэлечка, калі ласка, там цябе чакаюць чатыры бляхі на маім ложку і два на тваім стале.

— Зараз буду, — каротка адказала Гэля.

Стратэгічныя запасы мукі і цукру прывозілі ім дахаты па пятніцах. Калі ўсё скончылася ўжо ў сераду, значыць, поўны аншлаг з замовамі. Геула павярнулася да Кастуся.

— Слухай, мне трэба тэрмінова купіць маме прадукты...

Кастусь уздыхнуў:

— А прыедзеш заўтра да мяне? Кіно якое паглядзім... І ўвогуле...

— Добра! Прывітанне дзядзьку Чынгізу! — Геула цмокнула Кастуся ў шчаку і пабегла ў метро.

* * *

— Ну што, — спытаў бацька Кастуся, калі той сеў у машыну, — сказаў пра вандроўку?

Кастусь няпэўна хітнуў галавой.

— Колькі нумароў замаўляць? — удакладніў бацька.

— Адзін, — адказаў Кастусь.

Нешта ў сынавым голасе напружыла Чынгіза.

— Дакладна? Ніякіх праблем?

— Ніякіх, — сказаў Кастусь скрозь зубы.

— Значыць, Гэля не супраць таго, каб афішаваць...

— Тата, — перапыніў Кастусь, — годзе ўжо мяне грузіць! Усё ў нас нармальна!

— А як Геула адрэагавала?

— Нармальна адрэагавала! Пацалавала на развітанне!

Да самага Уручча яны маўчалі. І толькі ў канцы Чынгіз сказаў:

— Май на ўвазе, гэта твая зона адказнасці.

Кастусь, выходзячы, ляпнуў дзвярыма мацней, чым трэба.

* * *

Гэля не ела тарты. Не магла глядзець на піроржныя. Пры слове «капкейк» хваравіта моршчылася. Мама па сёння прыгадвае, як добрая суседка прынесла дачцэ скрыначку цукерак, а Геула, якой споўнілася чатыры, строга сказала:

— Наступным разам падары мне слоік салёных агуркоў.

Гадоў з дзесяці Геула пачала дапамагаць маці ўпрыгожваць замовы і з таго часу ўспрымала салодкае... як паперу. Або палатно. Нікому ж не прыйдзе ў галаву жаваць палатно і заядаць пэндзлікамі?!

Калі Гэля вярнулася дахаты, маці ўжо выцягнула з духоўкі чарговую партыю кексаў.

— На стале дваццаць восем капкейкаў — выпускны ў чацвёртым класе, — пракрычала маці, — толькі без авангарда, калі ласка, там чума, а не бацькоўскі камітэт. А з тымі, якія ў спальні, можаш рабіць што заўгодна, гэта дзеньнар у хлопца, двана-

ццаць гадоў, футбаліст, мама блогер, тата машынамі гандлюе... Ты есці хочаш?

— Пазней, — адмахнулася Гэля, — спачатку дамо рады кейкам.

28 штук. 15 дзяўчат, 13 хлопцаў. Выпускны.

Гэля зірнула на памадку, якую прыгатавала маці. Мярзотны ружовы і «вырвівока» блакітны.

«Ну нічога, — падумала Гэля, — на дзеньнародзінавых адарвуся».

І ўзялася маляваць на кексах кніжачкі і сшытачкі.

* * *

Ян ачомаўся ад кухталя.

— Ты на гадзіннік глядзіш, блогер хвігавы? — пацікавіўся бацька.

Ян паглядзеў.

Да пад'ёму заставалася шэсць гадзін.

— Ужо заканчваю, — буркнуў ён, працягваючы шчоўкаць мышкай.

Station Станіслаў Францавіч быў спрактыкаваным бацькам. Ён зачыніў ноўтбук перад сынавым носам, запхнуў камп'ютар пад паху і рушыў у спальню. Ян нават не пратэставаў. Усё, што трэба, ён ужо высветліў, засталіся сякія-такія дробязі, але іх можна ўдакладніць і заўтра.

Выключна ад шкадлівасці ён паведаміў бацькавай спіне:

— Я ў Маскву збіраюся. У тэхналагічны каледж пасля дзявятага бяруць!

Тата спыніўся і паглядзеў на сына з усмешкай. Яна такія позіркі заўсёды вар'явалі, ён чырванеў і пачынаў хаміць. Але цяпер варта было змоўчаць.

Бацька вытрымку ацаніў і дэманстратыўна агледзеў пакой.

— Калі ты наконт прыборкі... — не стрываў Ян, але тата яго перапыніў.

— Не, я наконт мадэлі лінкара.

Тата зняў з верхняй паліцы запылены каркас недабудаванага карабля.

— Колькі ты яго рабіў? Гадзіны тры? А ўжо тры гады ён... дарабляецца. Ці, прыкладам, маляванне на палатне...

Бацька кіўнуў на падрамнік, які тырчаў з-за шафы.

— Збіранне марак... Авіямадэляванне... Ты хоць нешта давёў да ладу за апошнія пяць гадоў?

— «Сокала тысячагоддзя» склаў! — абурыўся Ян. — Там некалькі сотняў дэталяў.

— «Сокала тысячагоддзя»... Я скончыў яго, калі памятаеш. Таму ён стаіць у маім пакоі. І пыл з яго рэгулярна выціраюць, між іншым!

— Мама выцірае, — адгыркнуўся Ян.

— Усё адно, — бацька зноў набыў зневажальна-паблажлівы выгляд. — Галоўнае, што я заўсёды ўсё даводжу да ладу. А ты?

— Я блог на юцюбе ўжо год вяду!

— Блог! — чмыхнуў тата. — Гэта, вядома ж, вялікая і важная справа!

— І ў Маскву паеду!

— Дык на здароўе, — адмахнуўся бацька. — Зарабляй грошы, каб было на што жыць, і едзь... Вандроўнік...

Ён пазяхнуў і выйшаў з пакоя.

Ян сумеўся. Пра грошы ён неяк не падумаў.

Не распранаючыся, паваліўся на скамечаную пасцель, узяў тэлефон, аўтаматычна палез на *YouTube*

правяраць, колькі праглядаў дадалося. Калі выскачыла дакучлівая рэклама, Ян хацеў адключыць яе, але палец спыніўся на паўдарозе...

* * *

— ...І праз месяц будзем грошы лапатай заграбаць! — сказаў Ян.

— Дай мне белую глазуру, — папрасіла Гэля. — Якія грошы? Якой лапатай?

— Вялікай, халера! — абурыўся Ян. — Ты мяне ўвогуле слухала?

— Не, — шчыра прызналася Геула, — выбачай, адключылася. Восем, дзевяць, дзесяць... Яшчэ тры кексы для хлопцаў, астатнія дзяўчатам.

Ян закаціў вочы.

— Так, усё з пачатку апавядаць не буду, але я зарэгіў наш блог на «Адсэнсе», і зараз нам за прагляды будуць плаціць грошы.

— Ачмурэць! — сказала Гэля, упрыгожыўшы чарговы капкейк. — А колькі за кожны прагляд?

— Ну, там, здаецца, не за прагляд, а за клік па рэкламе... — сумеўся Ян. — Я, шчыра кажучы, не да канца ўцяміў. Бацька ноўт адабраў, а з тэлефона ўсе гэтыя правілы чытаць задзяўбешся... Ды ўсё адно! Хто малайчына? Янчык малайчына!

Ён узняў далонь, і Геула асцярожна, каб не выпацкаць, дала яму «пяць». Аднак усё ж такі ўдакладніла:

— А калі і як плаціць будуць?

— Калі набярэцца пэўная сума... не памятаю... Але ж у нас па пяцьсот праглядаў на дзень! Думаю, праз тыдзень...

— А як гэтыя грошы забраць? — перапыніла Гэля.

— Слухай, — узлаваўся Ян, — былі б грошы, а як забраць — прыдумаем!

— Ясна, — уздыхнула Геула. — Дарэчы, зусім забылася сказаць: мне ўчора ў краме касметыкі прапаноўвалі пяцьдзясят рублёў гатоўкай за тое, каб мы пра іх сюжэт знялі і ў блог паставілі.

— Паўсотні? — Ян закапыліў губу. — Ды гэта ўвогуле несур'ёзна!

— Сапраўды? — здзівілася Геула.

— Слухай, гэта ж дзіцячы садок! — выгукнуў Ян. — Мы можам рабіць сюжэты кожныя два дні. Ты што, збіраешся працаваць за няшчасныя паўтары сотні на тыдзень?

Гэля заміргала.

— Трыста даляраў на месяц... — пачала яна, але Ян не даў ёй скончыць.

— Капейкі! — пагардліва кінуў ён. — Калі ў Маскве здымаць кватэру, дык гэта толькі на пражытак.

— Навошта здымаць кватэру ў Маскве? — не зразумела Гэля.

— Ды гэта я так, прыкладам, — сумеўся Ян.

І зноў пайшоў у наступ:

— Нам зараз трэба хутчэй сюжэты здымаць! Штодня!

Гэля пацерла вочы і скасавурылася на тры бляхі з нарыхтоўкамі, якія чакалі яе на стале.

— Добра, — пагадзілася яна. — Але давай заўтра. Сёння яшчэ на дзень народзінаў замову рабіць...

Ян надзьмуўся як мыш на крупы.

* * *

Кастусь, пазяхаючы, выйшаў у вітальню і пабачыў бацькоў за штодзённым рытуалам: маці праводзіла бацьку на працу. Занятак гэты быў для маці няцяжкім: прыхіліўшыся да вушака, дачакацца, пакуль муж апранецца, потым пажадаць яму добрага дня, пацалаваць і зачыніць за ім дзверы.

— Ма, — сказаў Кастусь, — дзе мае джынсы?

Маці схамянулася, але Чынгіз спыніў яе:

— Альбіна, адставіць! Няхай сам шукае. Ён у нас ужо вялікі, паненак на курорты возіць.

— Дарэчы, — прамовіла маці, — а калі мы Гэлі скажам? Абавязкова дня народзінаў чакаць?

— А сын ужо ўчора паведаміў, — Чынгіз паглядзеў на Кастуся з незразумелым выразам твару.

— Як добра! — узрадавалася Альбіна.

— Ма! — паўтарыў Кастусь. — Я джынсы ўчора на крэсле пакінуў. Зноў некуды схавала?

— Зараз!

Чынгіз праводзіў жонку позіркам і спытаў:

— А цётцы Лізе ты сказаў?

— А што цётка Ліза? — натапырыўся Кастусь. — Пра што ёй казаць?

— Ну, прыкладам, што ты з яе дачкой збіраешся жыць у адным нумары.

Кастусь надзьмуўся.

— Не, я разумею, што вы ўжо даўно сустракаецеся, — прымірэнча сказаў бацька, — але жыць разам — гэта зусім іншае.

— «Жыць разам»... — чмыхнуў Кастусь. — Я што, замуж ёй прапаную?!

— Слухай, ты, — у голасе Чынгіза чуўся метал, — сын маёй жонкі, кроў маёй крыві. У мясцінах, адкуль я родам, ты б спачатку ажаніўся, а ўжо потым...

Тут у вітальню вярнулася Альбіна з джынсамі ў руках.

— Трымай, — яна сунула нагавіцы сыну, ацаніла сітуацыю і падазрона запыталася: — Чаго сварымся?

— Нічога, — адказаў Чынгіз. — А ты, сын, скажы Лізе. Ці мне сказать?

— Сам, — буркнуў Кастусь.

Бацька кіўнуў і выйшаў. Кастусь вярнуўся ў свой пакой, падумаў секунду і набраў на тэлефоне: «Ты хутка?»

* * *

Да катэджнага пасёлка Тарасава Гэля дабралася хутка, але ў Кастусёў дом зайсці не атрымалася. Брамка была зачыненая. Геула адразу патэлефанавала цётцы Альбіне, бо ведала: тэлефон Кастуся заўсёды недзе валяецца на безгучным рэжыме.

— Выбачай, дагэтуль не адрамантавалі дамафон, — сказала цётка Аля, выбегла на вуліцу і адчыніла брамку, — заходзь! Я так рада, што ўсё атрымалася з гэтымі пуцёўкамі, шкада, што не дачакаліся дня народзінаў, сюрпрызу не будзе, але я табе што-небудзь мілае падару, ад сябе. А гэта будзе ад Чыны падарунак.

Гэля спрабавала запытацца, што здарылася, аднак цётка Аля сакатала, не сціхаючы.

— Гатэль вельмі добры, я па водгуках абірала! А галоўнае — мора, лета...

Тут Геула пачала здагадвацца, пра што спрабаваў ёй учора паведаміць Кастусь, і ўсміхнулася.

— Карацей, — цётка Альбіна падштурхнула госцю да пакоя сына, — заходзь, ён цябе чакае. А мне трэба на манікюр ісці.

Да Кастуся Гэля ўваходзіла, усміхаючыся да самых вушэй.

— А чаму адразу пра гатэль не сказаў? — спытала яна. — Партызан!

Кастусь адрэагаваў дзіўна. Нервова таргануўся, устаў з-за камп'ютара і зноўку бухнуўся на крэсла.

— Значыць, ты не супраць? — напружаным голасам удакладніў ён.

— Я? — здзівілася Геула. — Гэта ж мама зноў будзе вохкаць, што хросны мяне песціць, што нельга прымаць такія дарагія падарункі.

Кастусь сядзеў, не адрываючы вачэй ад манітора. Гэля зазірнула цераз ягонае плячо — звычайная стужка з коцікаў, сэлфі і пацешных карцінак. Насцярожылася, пакруціла галавой і ўбачыла на часопісным століку пульхны жоўты канверт з лагатыпам турфірмы.

— Гэта ён? — спытала Геула. — Наш падарунак?

Кастусь кіўнуў. Гэля адкрыла канверт.

— Балгарыя? Два тыдні? Пяць зорак, усё ўключана?!

Кастусь ізноў кіўнуў.

— Ура! — Гэля абняла Кастуся.

Кастусь у адказ злосна зашчоўкаў мышкай. Гэля ўважліва пераглядзела паперы.

— Твой нумар бачу... а мой... Яны хоць не ў розных карпусах?

— У нас адзін, — адказаў Кастусь. — Двухмесцавы...

Геула збянтэжана глядзела на аркушык з бронню нумара.

— У сэнсе двухмесцавы? — удакладніла яна. — І два асобныя ложкі?

— Слухай, Гэлька, — Кастусь павярнуўся да яе разам з крэслам, — можа, годзе ўжо, га?! Мы колькі з табою знаёмыя?

— З радзільні, але...

— Што «але»? Я твой хлопец ці не?

Геула павярнулася і амаль пабегла да выхаду.

— А калі я твой хлопец, — крычаў ёй наўздагон Кастусь, — дык адзін ложак — гэта нармальна!

Гэля ўжо скочвалася вітымі сходамі.

— А ты — дурніца! — данеслася з другога паверха.

* * *

Ян ліхаманкава корпаўся ў архівах ноўтбука. Рукі ўсё ніяк не даходзілі пачысціць, таму тут захоўваліся не толькі гатовыя ролікі, але і куча непатрэбшчыны: чарнавыя запісы, віншаванні дзяўчатам да 8 Сакавіка ды проста розныя дурыкі...

Ён ужо збіраўся вычысціць гэтыя аўгіевы стайні адным махам, калі ў вочы кінуўся файл праекта «Няўдалыя дублі».

Адкрыў.

У файле быў толькі адзін фрагмент — у самы нязручны момант у пакой праслізнула котка Нора і пачала праходжвацца перад камерай, ганарыста задзёршы хвост. Было вельмі смешна. Меркавалася, што Ян злучыць няўдалыя дублі — і ўрэшце атрымаецца пацешны ролік. Але неяк вылецела з галавы.

Ян узбадзёрыўся. Гэта магло падвысіць наведвальнасць. Ён стаў запускаць адзін чарнавы запіс за адным. Во забыліся словы — пасуе. Тут Нора ўлезла

паласатай пыскай у аб'ектыў — таксама ніштавата. А во тут бачна, што ніякія яны з Гэлькай не сіямскія блізняты — гэта пакуль адкладзём. Выкрыццё іхняй таямніцы трэба зрабіць асобнай падзеяй...

У пакой увайшла маці з Норай на руках. Котка дзеля ўсяго дзеля прынюхалася: ці не пахне ежай. Есці Нора магла безупынна, што ніяк не ўплывала на зграбнасць яе паставы.

— Урокі робіш? — асцярожна пацікавілася маці, сядаючы збоку.

— Якія ўрокі, мама? У мяне дзявяты клас, а не адзінаццаты!

— Але іспыты...

— Ды хто парыцца праз гэтыя іспыты! Не ЦТ ж! Здам як-небудзь! Мама, не замінай, га?!

— Добра-добра, — паспешліва прамовіла маці. — Але тата сказаў, нібы ты хочаш у Маскву паехаць у нейкі тэхнікум?..

— У каледж! Тэхналагічны!

— А хіба можна беларусам пасля дзявятага класа ў расійскі каледж?

— Мама, ты хоць не нудзі!

— Але як ты там? Адзін?

Замест адказу Ян начапіў навушнікі і паглыбіўся ў мантаж.

* * *

— Гэлька, колькі разоў я прасіла цябе браць ключы! — абурылася маці, з цяжкасцю адчыняючы дзверы локцем.

Рукі яна трымала ўзнятымі, як хірург. Яны былі ў цесце.

Альбіна ўварвалася ў кватэру з такім энтузіязмам, што Ліза ледзь паспела адскочыць ад дзвярэй, торкнулася носам у цеста на руцэ і стала падобнай да клоўна.

— Ліза, Гэля не прыходзіла?

— Яна ж да вас паехала, — сказала Ліза. — Што здарылася?

— Так, спакойна, нічога страшнага, — пачала тлумачыць Аля і, убачыўшы, што сяброўчын твар увачавідкі бялее, засакатала: — Усе жывыя, усё добра, проста мы з Чынам напартачылі. Два дарослыя ідыёты. І Кастусь... малы ідыёт!

— Дзе Гэля? — ціха спытала Ліза.

— Прабач, я двойчы ідыётка, — прастагнала Альбіна. — Давай я ёй патэлефаную, ты пачуеш, што яна жывая. Толькі набіраць трэба з твайго тэлефона, мне яна не адказвае.

Ужо праз некалькі хвілін сяброўкі сядзелі на кухні. Аля мітусілася, запарваючы свежую гарбату, а супакоеная, але знясіленая Ліза замерла, утаропіўшыся ў акно.

— Даруй, — працягвала выбачацца Альбіна, — ну няма глуздоў, ну ты ж мяне ведаеш, я не паспяваю думаць — адразу вывальваю... Замоў шмат? Табе дапамагчы гатаваць ці не замінаць?

— Размінаць. Цеста. У мяне замова на тры «Напалеоны», — млява адказала Ліза.

— Зараз зробім! — радасна пагадзілася Аля.

— Рукі памый! Валасы падвяжы! Фартух надзень! — закамандавала Ліза.

— Во зануда! — Альбіна ўздыхнула і без паўзы працягнула: — Слухай, ты магла сабе ўявіць, што ў Кастуся з Гэляй яшчэ нічога не было?

— У сэнсе? — перапытала Ліза.

— Ды разумееш, — пачала апавядаць Аля, — Чына даўно вырашыў падарыць Гэлі з Кастусём на шаснаццаць гадоў вандроўку на мора. Каб удваіх, без бацькоў...

— Гэта такія грошы! — ахнула Ліза.

— Ды не ў грашах праблема! Гэты... Чынгіз... чагосьці запытаўся ў гэтага... Кастуся, колькі нумароў замаўляць!

— Як так? — не зразумела Ліза. — Іх жа двое...

— А Кастусь сказаў адзін! І Чына, як гэты... узяў ды замовіў адзін! Я патэлефанавала ўжо яму і дала прачуханца, але ты ж ведаеш Чыну... «Вырашаць павінен мужчына...» А што ён можа вырашыць, гэты «мужчына», у шаснаццаць гадоў? У яго замест глуздоў — гармоны! Не каб са мной параіцца! Ці хоць бы з Гэляй! Карацей, Геула, як даведалася, псіханула... І правільна зрабіла...

Альбіна вінавата паглядзела на разгубленую Лізу.

— А ў нас і ў думках не было пакрыўдзіць, ты ж ведаеш. Гэлька — хросніца мая... Ну, не зусім мая, але я жонка хроснага бацькі, таму люблю яе нібы родную. Як цяпер у Гэлі прасіць прабачэння?

— Ну добра, — Ліза ўзялася раскочваць замяшанае Альбінай цеста. — З Гэляй я разбяруся. Патлумачу, што гэта непаразуменне.

— Патлумач! — узрадавалася Альбіна. — А другі нумар мы сёння ж замовім!

— Калі Геула ўвогуле захоча паехаць, — уздыхнула Ліза.

— А не захоча — мы з табою паедзем! — прапанавала Аля. — Гэта ж наша свята! Шаснаццаць гадоў знаёмства!

Ліза сумна ўсміхнулася.

— Цяжкі быў дзень, — прамовіла яна.

— Ліза... — пачала Альбіна, але сяброўка яе перапыніла.

— А ўсё адно добра! — упэўнена сказала яна.

І Аля прыкусіла язык.

* * *

Ян сустрэў Гэлю каля ліфта.

— Ну?! — патрабавальна спытаў ён. — Што за пажар?

— Пусці, — буркнула Геула, — не на лесвіцы ж размаўляць...

Ян ацаніў агульны стан Гэлі і адразу павёў на кухню.

— Тут недзе гарбата была... супакаяльная. Зараз зраблю.

Геула ўздыхнула, адштурхнула Яна, які корпаўся сярод пакетаў з макаронай, адчыніла шуфлядку з рознымі відамі гарбаты і папрасіла:

— Чайнік пастаў.

Знайшла нешта духмянае, насыпала ў фрэнчпрэс.

— Ну дык што? — не вытрымаў Ян. — Чаго рыдала?

Адказаць Гэля не паспела — у Янавым пакоі дзылінкнуў ноўтбук, і яе «сіямскі брат» панёсся правяраць пошту.

— Ур-р-ра! — данеслася з пакоя. — Нас зарэгілі ў рэкламнай службе! Цяпер трэба кантэнтам народ задушыць! Хадзі сюды, я сёння такі ролік забацаў!

Тут якраз і чайнік закіпеў. Геула ўздыхнула і заліла заварку кіпнем.

— Ды хадзі ж хутчэй! — надрываўся Ян.

Ролік быў сапраўды пацешным: ляпы ішлі адзін за адным з калейдаскапічнай хуткасцю, Нора была проста на вышыні.

— Гадзіну таму выклаў, — пахваліўся Ян, — а ўжо сто дваццаць праглядаў! Дарэчы, а колькі ў нас грошыкаў?

Ён пераключыўся на іншае акно браўзера і расчаравана працягнуў:

— Напэўна, проста абнавіцца не паспела...

Ян націснуў F5, але ў графе «Разліковы даход» па-ранейшаму вымалёўвалася «0,00 $».

— Ну, калі ты ўжо тут, — страпянуўся Ян, — давай што-небудзь хуценька запішам!

— У меня адна ідэя была... — сказала Гэля. — Дарэчы, гарбату бяры.

* * *

Дадому Геула вярнулася гадзіны праз тры. Яны з Янам запісалі відэа, а прыдумляючы другі ролік, так нарагаталіся, што Гэля дагэтуль ікала.

Ян выйшаў яе праводзіць, але ўбачыў, што ўздоўж вуліцы пашыхтаваліся пустыя тралейбусы.

— На лініі абрыў, — патлумачыў адзін з кіроўцаў, што нудзіліся ў чаканні рамонтнікаў.

— А давай я цябе дахаты правяду! — прапанаваў Ян.

І ў гэты момант на мінскім небе разышліся рэдкія аблокі, вызваляючы месца яркаму вясноваму сонцу.

Яны ішлі доўга: чамусьці кожны святлафор сустракаў іх чырвоным. Але Гэля з Янам не засмучаліся — болей часу на пагутарыць і пасмяяцца.

Дома Гэлю сустрэлі таксама весела. Маці з цёткай Альбінай дапяклі «Напалеоны», адкаркавалі бутэльку віна, запусцілі навагодняе інтэрнэт-радыё і цяпер, прытанцоўваючы, упрыгожвалі тарты.

— Цёткі, вы чаго?! — збянтэжылася Гэля. — Травень на дварэ!

— Во, я ж казала, што яны неўзабаве паміраццца, — радасна прамовіла маці.

Гэля ікнула. Яна ўжо і забылася, што пасварылася з Кастусём.

— Гэлечка, прабач нам, ідыётам, — загаласіла цётка Аля, — мы не хацелі цябе пакрыўдзіць. А Кастусь... Ты ж ведаеш Кастуся! Слухай, ты не бойся, я папярэдзіла яго, што калі зняважыць цябе, дык я яго па сцяне размажу... Ён хлопец добры...

Геула ікнула.

— Аля, не бянтэж мне дзяўчынку! — усклікнула маці.

— Ды чаго тут бянтэжыцца? — здзівілася цётка Аля. — Гэта жыццё, ім ужо па шаснаццаць гадоў. Гэлька, ты ж ведаеш, я заўсёды на тваім баку. Кастусік — мой сын, але ён хлапец, і часам ён проста невыносны!

Геула ікнула яшчэ раз.

— Гэлечка, патэлефануй яму, сонейка, ён жа, дурань, сядзіць дома ды рубіцца ў комп, ён ідыёт, як і ўсе мужыкі...

— Аля! — абурана ўсклікнула маці.

— Ну добра-добра, не ўсе мужыкі, не заўсёды ўсе мужыкі, часам і ў іх здараецца прасвятленне, але гэта так рэдка...

Гэля пераззірнулася з маці, і яны разам засмяяліся.

— Што вы рагочаце?! — пакрыўдзілася Альбіна. — Жывяце ўдзвюх, добра вам! А ведаеце, як гэта — жыць з двума мужчынамі? Га?

Аля ўзялася ў бокі і абурана пераводзіла пагляд з Геулы на яе маці і назад.

Гэля ікнула.

— Весяліцеся, — сказала яна і пайшла ў пакой.

І там на кампе яе ўжо чакала паведамленне ад Кастуся.

«Карацей, не хочаш — не трэба, я ўсе паперы падраў».

* * *

Ян грыз пазногці, пакуль тата вывучаў табліцу на экране сынавага ноўтбука.

— Але ж, — нарэшце сказаў бацька, — вялікую касу ты падняў. Дванаццаць даляраў.

— За тры дні! — абурыўся Ян. — Ты на дынаміку паглядзі: першы дзень — пяць цэнтаў, другі...

— Тры дні, — пацепнуў плячыма тата, — так сабе паказчык. Трэба глядзець... ну хоць бы за паўгода. Лепей за год.

— Я ўжо падлічыў! — Ян пераключыўся на *Excel*. — Калі трэнд захаваецца, праз паўгода будзе пятнаццаць тысяч баксаў!

— «Трэнд»! — чмыхнуў бацька. — Слоў нахапаў... А мне ты навошта ўсё гэта паказваеш?

— Мне наяўныя грошы трэба! А для гэтага... во...

Ян ізноў пашчоўкаў клавішамі, адкрываючы даведачную службу рэкламнага сайта.

— «Пазначце нумар рахунку», — прачытаў бацька. — То бок хочаш атрымліваць гатоўкаю праз мяне?

— Ну так!

— Ты хоць уяўляеш, колькі з мяне падаткаў возьмуць?

— Трынаццаць адсоткаў! — упэўнена адказаў Ян. — Я даведваўся.

— Даведваўся ды не даведаўся... — тата пакруціў галавой. — А яшчэ фонд сацабароны. І падатак на прыбытак. І...

— Які прыбытак?! — здзівіўся Ян. — Ты ж мне ўсё аддаваць будзеш, прыбытку ніякага!

— Нічога ты не цяміш у фінансах, — уздыхнуў бацька.

Яму вельмі не хацелася важдацца з усёй гэтай драбязою. Але, з іншага боку, сын загарэўся ідэяй, ужо некалькі дзён нешта робіць... Такі шанс шкада было не скарыстаць.

— Добра, — пастанавіў тата, — табе патэлефануе Грыша... дакладней, Рыгор Пятровіч. Ён ІП, праз яго будзеш свае мільёны адмываць.

Яну захацелася падскочыць, але ён стрымаўся.

— Пакуль не мільёны, — сказаў ён з усёй магчымай самавітасцю. — Тысячы. А там... як пойдзе!

Бацька іранічна пакруціў галавой, але змоўчаў.

Калі ён выйшаў, Ян дазволіў сабе некалькі разоў бязгучна падскочыць на месцы — і адразу напісаў Гэлі: «Праблему з гатоўкай вырашыў. Будзем з грашыма!»

Гэля не адказала.

Гэта Яна зусім не задавальняла: яму неабходна было тэрмінова падзяліцца радасцю. Ён схапіў тэлефон і набраў Геулу.

— Гэлька! — зароў ён. — Неўзабаве ў мяне будзе куча грошай!

Ян сцісла апісаў сітуацыю. Слухаўка змрочна засапла.

— Ты што, — усклікнуў Ян, — не рада за сябра?

— А чаму грошы толькі ў цябе?! — нечакана рэзка адказала Гэля. — Гэта наш агульны канал!

— Табе што, таксама трэба? — здзівіўся Ян. — Навошта?

Ён неяк не падумаў, што ўвесь прыбытак ад рэкламы давядзецца дзяліць напалам.

— Ды каб розныя багаценькія бурацiны не думалі, што мяне можна купіць! За пуцёўкі! І ўвогуле...

— Гэй! — Ян нічога не разумеў. — Стоп! Хто цябе хоча купіць? Якія пуцёўкі?!

— А ты не тыч носа! — адказала слухаўка, і сувязь перарвалася.

Ян паспрабаваў набраць Геулу зноў, пачуў кароткія гудкі.

«Дурніца псіхаваная! — падумаў ён. — Навыдумляла сабе невядома чаго!»

* * *

Званок на ўрок заспеў Геулу на падаконні. Яна спрабавала зачыніць фортку, якая ў кабінеце геаграфіі ўвесь час адчынялася.

Аксана Віталеўна, увайшоўшы, падціснула вусны.

— Можа, ты ўсё ж такі зробіш ласку і сядзеш на месца? Я разумею, што Геулам Вегірэйка закон не пісаны, але...

— Вегірэйкам, — папраравіла яе Гэля.

— Што? — папярхнулася завуч па выхаваўчай працы, па сумяшчальніцтве — настаўніца геаграфіі.

— Я прашу скланяць маё прозвішча, — прамовіла Геула і саскочыла з падаконня.

Завучыха на момант замерла.

— Калі ты такая разумная, дык ідзі адразу да дошкі, — сказала яна.

— Аксана Віталеўна, скланенне прозвішчаў — гэта не геаграфія, а беларуская мова, — паспрабавала пажартаваць Гэля, але настаўніца жарт не падтрымала.

— Да дошкі, я сказала, — закамандавала яна.

Геула ўздыхнула і пайшла да дошкі.

— Пералічы мне асноўныя кірункі развіцця прамысловасці Расіі.

Гэля закаціла вочы. Эканамічная навука ёй не давалася.

— З фактамі, з канкрэтнымі прыкладамі, — смакавала сітуацыю настаўніца.

— Аксана Віталеўна, вы ж мяне на мінулых занятках выклікалі, — паспрабавала выкруціцца Геула.

— Сядай, двойка! — адрэзала Аксана Віталеўна.

* * *

Маці сустрэла Гэлю ровам міксера.

— Задзяўбла мяне твая Аксана! — крыкнула Гэля.

— Яна не мая! — адказала маці.

— Каб не ты са сваёй дурной падпіскай, яна б мяне не чапала!

— Гэта не мая дурная падпіска.

— Гэта твая дурная ўпартасць!

— Гэля, не пачынай! — выгукнула маці.

— Слухай, чаму ты заўсёды рэвалюцыю чыніш? Чаму іншыя бацькі сядзяць спакойна, а ад цябе

неўзабаве будуць дату бацькоўскага сходу ўтойваць? Чаму табе заўсёды больш за ўсіх трэба?

Маці выключыла міксер, і на кухні зрабілася ціха.

— Што? — спытала яна. — Я нічога не чула.

— Я не ведаю, што ў мяне будзе па геаграфіі за год, — змрочна паведаміла Геула.

— Ну і не ведай, — весела сказала маці, — і мне не кажы. А Аксане я заўтра піражныя аднясу. У яе проста стрэс, канец навучальнага года, трэба з'есці салодзенькага. Пакаштуй крэм, нерэальна смачны сёння.

Геула зрабіла крывую міну.

— І каму я перадам сямейны бізнес? — уздыхнула маці.

— Мужа сабе завядзі, — буркнула Гэля.

* * *

Ян пакутаваў за кампом. Ён тройчы тэлефанаваў Гэлі, двойчы напісаў — ніякай рэакцыі. «Калі так, — пастанавіў ён, — дык няхай сама тэлефануе і піша! Істэрычка!»

Ён хацеў запіць гора гарбатай, але і тут яго чакала неспадзяванка: гарбата ў фрэнч-прэсе скончылася. Ян пайшоў на кухню і знайшоў там бацьку, які ўтаропіўся ў тэлефон. У самім гэтым факце не было нічога нязвыклага, але гукі, якія даносіліся з дынаміка...

— У вас ёсць што-небудзь для сіямскіх блізнят? — пытаўся звонкі голас Гэлі.

— Не, — разгублена адказваў барытон крамніка, — але ў нас ёсць новая калекцыя вялікіх памераў...

Тут і бацька заўважыў Яна, які застыў пасярод кухні.

— Сядай, — закамандаваў тата, ставячы відэа на паўзу.

Ян сеў, дзеля ўсяго дзеля надаўшы твару выраз «катуй мяне — усё адно нічога не скажу!».

— Цікавы ролік, — зазначыў бацька.

Ян не адказаў. Ён пакуль не разумеў, за што на яго будуць сварыцца, таму аддаў ініцыятыву.

— А крама вам нешта заплаціла? — спытаў тата.

— Не... а мусіла?

— Безумоўна! Гэта ж продакт-плэйсмент. Я толькі што тэлефанаваў ім, уласнік знаёмым аказаўся. Калі вы гэты ролік вывесілі?

Ян тыцнуў у дату на экране. Тата размаўляў даволі міралюбна, і гэта насцярожвала.

— Так, усё супадае, — кіўнуў бацька. — На другі дзень быў невялікі ўсплёск наведвання. І рост продажу амаль на пятнаццаць адсоткаў. Таму насамрэч маглі заплаціць.

— Абыдземся! — ганарліва адказаў Ян. — Што нам тыя капейкі!

— Дык ты бізнесмен, як бачу! — бацька ўключыў звыклы іранічны тон. — Стратэг! А як перад Дзяржкантролем адбрэхвацца будзеш?

— А пры чым тут Дзяржкантроль?

Размова перайшла ў звыклае рэчышча. Яна адпусціла, можна было адгырквацца.

— Ды таму што парушэнне Закона «Аб рэкламе» Рэспублікі Беларусь. Дзе дамова з крамай пра аказанне рэкламных паслуг?

— Якіх паслуг? Ніхто нікому нічога не аказваў!

— Ага, пракурору будзеш тлумачыць! І дарэчы, не ты, а мой Грыша, які за цябе падпісаўся...

— Слухай, тата! — Ян устаў і дэманстратыўна заняўся чайнікам. — Не лезь туды, дзе табе не трэба.

— А я што, лез? — здзівіўся бацька. — Ты, на хвілінаку, сам да мне прыйшоў. Дык што, я Грышу кажу, каб ён табе рахунак не даваў?

Ян злосна засоп. Тата, безумоўна, меў рацыю, і гэта раздражняла. А яшчэ словы бацькі нагадалі пра ідэю Гэлькі браць грошы з крамаў — а гэта ўвогуле вар'явала.

«Увесь свет супраць мяне», — падумаў Ян.

— Ды не пераймайся, — сказаў тата. — Не будзе Дзяржкантроль такой лухтой цікавіцца. Пакуль. Але, мяркуючы па тэндэнцыях, мы неўзабаве на больш-менш нармальныя абароты выйдзем. Май на ўвазе.

«Якія яшчэ "мы"?!» — хацеў абурыцца Ян, але не стаў. Гэтае «мы» прагучала... паважліва.

— Толькі давай дамовімся, — працягваў бацька, — калі зноў будзеце здымаць у камерцыйных аб'ектах, скажы мне. Прыдумаем, як максімізаваць прыбытак. І прыкрыць азадак... у сэнсе забяспечыць законнасць. О'кей?

— О'кей, — нехаця пагадзіўся Ян.

— А ўвогуле ты мне сякія-такія ідэі падкінуў, дзякуй!

Ян падазрона паглядзеў на бацьку. Той быў цалкам сур'ёзны.

У гэты момант татаў тэлефон зазваніў.

— Алё, — сказаў бацька, выходзячы з кухні. — Я прасіў пакуль прытрымаць рэкламны бюджэт... Што ты думаеш пра юцюб?.. Не, як пра рэкламную пляцоўку?

Ян трохі паганарыўся — і зноў засмуціўся. Гэула другі дзень не перателефаноўвала. Два дні

на канале не было абнаўленняў! Ян набраў нумар, пераканаўся, што мабільнік ягонай «сіямскай сястры» па-ранейшаму адключаны, і вырашыў нанова перакапаць архівы.

* * *

«Ну і як з ёю жыць?!» — напісала Геула.

Акрамя Кастуся (і гэтага барана Яна), ёй не было каму паскардзіцца на цяжкае жыццё з маці, але, на шчасце, перад адпраўкай яна усё ж такі зірнула на экран. Гэля зусім забылася, што пасварылася з Кастусём.

Апошняе паведамленне ў іхнім чаце — пра тое, што ён падраў дакументы.

— Ма-а, — загукала Гэля, — ну і што мне зараз рабіць з Кастусём?

— Не ведаю! — адгукнулася маці.

— Дзякуй, ты мне вельмі дапамагла! — з'едліва сказала Гэля.

— Калі ласка, звяртайся, — не менш з'едліва парыравала маці.

Геула села перад кампом і ўтаропілася ў экран.

У дзверы пазванілі.

— Адчыні, гэта ваду прывезлі! — крыкнула маці, і Гэля пасунулася да дзвярэй.

Але гэта была не вада. За дзвярыма стаяў Кастусь уласнай персонай. У руках ён трымаў пакеты.

— Здароў, — буркнуў ён. — Мама сказала, каб я прывёз. Гэта ўсялякія харчовыя фарбавальнікі. З Польшчы. І нешта яшчэ. Для мамы тваёй.

Кастусь таптаўся ў парозе, Геула тапталася ў дзвярах.

— Кастусік, як добра, што ты прыйшоў! — узрадавалася маці. — Гарбаты ці кавы?

— Торцік, — пажартаваў Кастусь.

— Торцік я табе з сабою дам, у мяне сёння садавінавыя, Альбінка такія любіць.

Кастусь з пакетамі нязграбна абышоў Геулу і патупаў на кухню. Гэля спачатку пайшла ў свой пакой, але, пакідаўшыся з кута ў кут, надумала вярнуцца.

А маці як нічога ніякага шчабятала пра сваю працу, потым прывезлі ваду — і Кастусь цягаў на балкон цяжкія бутлі, потым дапамагаў маці перасыпаць муку, потым даставаў з антрэсоляў мяшок з сухафруктамі.

Гэля спярша пачувалася няёмка, не ведаючы, як паводзіцца, а пасля расслабілася, і, пакуль Кастусь не згадаў, што яму трэба бегчы на трэніроўку, яны цудоўна пагаманілі.

Геула выйшла правесці сябра, і няёмкасць узнікла толькі падчас развітання. Кастусь сумеўся на момант, не ведаючы, куды падзець рукі, а потым нерашуча адступіў да дзвярэй і хутка выскачыў за парог, прамармытаўшы нешта кшталту «да заўтра». Гэля выдыхнула з палёгкай. Абдымацца з Кастусём яна была не гатовая.

* * *

Ян быў у роспачы.

Наведвальнасць канала зніжалася другі дзень запар. А Ян разлічваў на заўсёдны рост.

Гэлька была патрэбная як паветра. Але ж ён пастанавіў! Няхай сама тэлефануе і просіць прабачэння.

Ён вырашыў трохі паганяць у «Танкі», аднак у самы адказны момант на стале матэрыялізавалася Нора і ўлеглася проста на клавіятуру.

— Жывёліна! — зароў Ян, намагаючыся разгледзець поле бою за кашэчай спінай. — Апсік!

Нора пачала вылізвацца, зменшыўшы поле агляду амаль да нуля. Вядома ж, Яна падбілі праз дзесяць секунд. Ён паспрабаваў сапхнуць нахабную істоту з клавы, Нора пусціла ў ход кіпцюры і зубы. Ян схапіў котку за шкірку і панёс маці, якая захоплена чытала нешта з тэлефона.

— Мама! — Ян сунуў Нору гаспадыні. — Яна зноў мне працаваць замінае!

Котка паспрабавала драпануць крыўдзіцеля за руку.

— Дзверы зачыняць трэба, — адказала маці, беручы Нору. — І ўвогуле, з дзяўчатамі лепей быць пяшчотнымі. Так, Норышча? Так, прыгажуня?

Котка адразу заваркатала і расплылася па маміных каленях. Ян зірнуў на яе і спытаў:

— Слухай, мама, а вось калі дзяўчына на роўным месцы на цябе пакрыўдзілася... нават не на цябе, а проста ўвогуле! Ні за што. Што тады рабіць?

— Прасіць прабачэння, — лагодна адказала маці, чухаючы котку.

— За што? — абурыўся Ян. — Я ж ні ў чым не вінаваты!

— Усё адно. Папрасі прабачэння. А ты што, з кімсьці пасварыўся?

— Не лезь у маё жыццё! — узлаваўся Ян і пайшоў да сябе.

Дзверы ён дзеля ўсяго дзеля зачыніў на засаўку.

Без асаблівай надзеі ў соты раз прагледзеў архіў запісаў.

І на адной тэчцы раптам заліп.

* * *

Геула прачнулася ад цішыні. Не гудзеў міксер, не шыпела мульціварка, нават кавай не пахла.

— Мама, на сёння замоў няма? — здзівілася Гэля.

Яна выйшла на кухню і спалохалася. Яе мама, якую яна ніколі ў жыцці не бачыла без справы, сядзела і глядзела ў пусты кубачак перад сабою.

— Ма-а! — выгукнула Гэля. — Што здарылася?

Ліза ўзняла вочы.

— Я не разумею, як так можна, — ціха сказала маці. — Трэба было табе паверыць, напэўна.

— Так, — загадала Геула. — Зараз жа. Кажы. Што. Здарылася.

А здарылася подласць. Ліза, якая заўсёды добра думала пра людзей, пайшла-такі ў школу і падарыла Аксане Віталеўне невялікую скрынку кексаў. З нагоды прымірэння і ўвогуле «з блізкім заканчэннем навучальнага года». Аксана Віталеўна скрынку ўзяла і нават паўсміхалася, але потым пайшла і накрэмзала скаргу ў санстанцыю, што скрынка брудная, у кексе знайшоўся волас і ўвогуле змесціва, відаць, пратэрмінаванае. Маўляў, разбярыцеся і пакарайце, каб не труцілі нашых дзяцей.

— Не можа быць! — усклікнула Геула. — Не можа яна быць гэткай падлюкай!

— Я таксама не паверыла, — сказала маці, — але скарга падпісаная, прычым з усімі рэгаліямі. Настаўнік першай катэгорыі, намеснік дырэктара

па выхаваўчай і ідэалагічнай працы, пераможца чагосьці там. Ананімку не сталі б разглядаць.

— А ты адкуль даведалася? — спытала Гэля.

— Мне патэлефанавала Алеська Змяеўская, дакладней, Аляксандра Гаўрылаўна, яна ў выканкаме даўно працуе, гэтую скаргу ёй на стол паклалі. Яна сказала, што прытрымае, — пахавальным голасам паведаміла маці.

— Ну дык і выдатна! — узрадавалася Геула, у яе адлягло ад сэрца. — Прытрымае ж!

Маміны вочы наліліся слязьмі.

— Алеська сказала, каб я пакуль нічога не гатавала. Што трэба часова замерці і нічога не прадаваць. І на што мы будзем жыць? І ўвогуле, Гэлька, як ты не разумееш, гэта жахліва! Калі чалавек бярэ і так во проста робіць паскудства! Ёй жа з гэтага ніякай карысці, я б зразумела яшчэ, каб за грошы...

Ліза ўсхліпнула. Сэрца ў Геулы стукнулася аб горла.

— Мама, ты можаш паказаць мне гэтую скаргу? — папрасіла яна.

— На стале ляжыць, — усхліпнула маці, — але не рабі глупстваў!

— Глупстваў... не буду, — працадзіла скрозь зубы Гэля.

* * *

Перад першым урокам у настаўніцкай было шматлюдна.

Геула не сумнявалася ні хвіліны, яна ўсё вырашыла ў той момант, як узяла ў рукі раздрукоўку з мамінага стала.

Зайшоўшы ў настаўніцкую, яна рушыла ў цэнтр і гучна сказала, што ёй трэба зрабіць важную заяву.

Настаўнікі глядзелі на яе хто з цікаўнасцю, хто з раздражненнем. Потым Геула зачытала скаргу Аксаны Віталеўны і асобна, вельмі разборліва, подпіс. І сказала, што гэта хлусня. Што ў яе маці ніколі не бывае брудных скрынак, а наконт валасоў у яе пункцік да істэрыкі. Што яшчэ ніколі яны з мамай не сутыкаліся з тым, каб за падарунак чалавек плаціў подласцю. Што яна лічыць гэта помстай за тое, што маці падбухторыла ўвесь клас не здаваць грошы на падпіску, а Аксана Віталеўна як завуч па выхаваўчай працы атрымала за гэта па галаве ад нейкіх там цётак з упраўлення адукацыі.

— На маю думку, чалавек, здольны на подласць, чалавек, які хлусіць, каб адпомсціць, не можа працаваць у школе. Гэта прафнепрыдатнасць, — сказала Геула, — і я лічу, што ўсе вы, яе калегі, павінны пра гэта ведаць.

У магільнай цішыні Гэля выйшла з настаўніцкай. Дайшла да кабінета матэматыкі. Зразумела, што ўнутры яе вулкан і што яна ведае толькі адзін спосаб яго згасіць. А дзеля гэтага трэба, каб яшчэ адзін чалавек прагуляў сёння школу.

«Ян, давай што-небудзь здымем. Зараз жа», — напісала яна.

Ян адказаў імгненна: «Хадзем на коўзанку. Чакаю ў "Кароне"».

І праз секунду: «Прыхапі швэдар».

* * *

Звычайна Гэля мусіла чакаць Яна, але сёння ён прыбег на коўзанку загадзя. 77-ы тралейбус спазніўся на тры хвіліны, каб Ян паспеў у яго заскочыць. Паспеў ён і канькі нацягнуць, і камеру каля борта ўладкаваць, і пераканаць адміністратарку, што ён ніякі не журналіст, а школьнік, які здымае відэа для рэферата па фізкультуры.

Адміністратарка — суровая жанчына гадоў шасцідзесяці — ужо паддалася красамоўству хлопца, але бровы яшчэ супіла:

— Па фізкультуры? Рэферат? Што за навіны?!

— Ну што вы! — маляўніча здзіўляўся Ян. — Цяпер па фізры столькі тэорыі! Мы нават залікі здаём тэарэтычныя. І рэфераты во.

У адміністраткі зазваніў тэлефон, і яна адсунулася ад Яна.

— Уяўляеш, Ніна, у школах цяпер ужо рэфераты па фізкультуры пішуць...

Далей Ян не слухаў, бо з'явілася Геула.

— Нарэшце! — адначасова ўзрадаваўся і ўзлаваўся Ян. — Колькі можна чакаць?!

— Дык яшчэ без пяці... — паспрабавала запярэчыць Гэля, але Ян замахаў на яе рукамі.

— Апранай швэдар, хутка! Будзем здымаць сюжэт «Сіямцы на коўзанцы».

Геула трохі пабурчала, але падпарадкавалася. Ёй падабалася, калі Ян такі мэтанакіраваны. Можна спрачацца з ім, капрызіць — ён усё адно давядзе справу да канца. І дасягне нейкай сваёй мэты, пра якую Гэлі можна і не думаць.

Павесяліліся яны як мае быць. Удзельнікі масавага коўзання скручвалі галовы, назіраючы за дзіўным фігурыстам: дзве галавы, дзве рукі і чатыры нагі. Геула баялася, што яны з Янам будуць увесь час спатыкацца, але ўжо на другім коле злавілі рытм. Нават трошачкі разагналіся, але адразу гэпнуліся на азадкі. Рагаталі што дурныя.

Зумер, які абвясціў канец сеанса, заспеў іх знянацку. Яны ледзь паспелі выбрацца з лёду перад машынай, якая выехала чысціць пляцоўку.

— Файна! — у распранальні Ян схітрыўся адначасова сцягваць канькі і праглядаць зняты матэрыял. — Асабліва фізіі ў людзей. Адразу бачна — не падстаўныя! Зараз бягу дахаты — і рабіць мантаж! А то ў нас на канале трэці дзень наведвальнасць зніжаецца!

Апошні папрок быў у бок Геулы.

— Ну выбачай, — пакрыўдзілася яна, — у мяне тут невялікія непрыемнасці! Мама без працы засталася!

Яна выплюхнула на «сіямскага брата» ўсю гісторыю з нападам на маці, але Ян быў занадта ў гуморы. Ён гэтак з'едліва і трапна каментаваў, што Гэля не магла ўтрымацца ад смеху. І напрыканцы аповеду сама ўпэўнілася, што нічога страшнага не адбылося. Падумаеш, старая дурніца ўзвяла паклёп! Цяпер з ёю ніхто вітацца не будзе! А маці пару дзён адпачыць нават карысна.

— Слухай, — сказала Гэля, адсмяяўшыся, — а што там з манетызацыяй? Шмат мы на рэкламе зарабілі?

— Разумееш, якая штука, — паморшчыўся Ян, — народ жа капрызлівы. Ён свежага кантэнту патрабуе. А цябе не было...

Геула ўзялася ў бокі.

— Ды я не ў тым сэнсе! — паспешліва дадаў Ян. — Я разумею... цяпер. А гледачам жа не патлумачыш. Я ўжо розную лухту выкладаць пачаў.

Ён выцягнуў з кішэні тэлефон і стаў паказваць Гэлі.

— Гэта мы дзяўчатам нашым ролікі рабілі на Восьмага сакавіка... Во Наталка...

— Нішто так, — ацаніла Геула.

— Менавіта, «нішто», — уздыхнуў Ян. — Дваццаць два прагляды... Волька трохі лепей... Сто сорак восем. Ну, у яе вочы выразныя...

— Гм... — здзівілася Гэля. — А як ты ёй прышчы прыбраў?

— Паўдня пудрылася, — прызнаўся Ян. — І ўсё адно... І астатнія, пэўна, гэткія ж... Ну нічога, от зраблю мантаж «Сіямцаў на коўзанцы»...

Тут тэлефон у Янавых руках пачаў вібраваць — ён ледзь не выпусціў апарат, але здолеў злавіць і адказаць:

— Так, тата... На коўзанцы... Колькі?.. Нішто сабе... Так, вядома ж... Лепей гатоўкай! Зараз буду!

Ян адключыў тэлефон і збянтэжана паглядзеў на Геулу.

— Там ужо нешта манетызавалася... Дзіўна.

* * *

У бацькавым офісе Ян заўсёды пачуваўся няёмка. Усе навокал так старанна мітусіліся, прабягалі міма з такім заклапочаным выглядам, што адразу рабілася зразумела: людзі занятыя Вялікай і Важнай Справай. Бацька хвілін дзесяць вёў яго ў свой кабінет, бо ўсю дарогу падначаленыя падсоўвалі паперы: «Вось

справаздача, якую вы прасілі, Станіслаў Францавіч», «Падпішыце, Станіслаў Францавіч» і «Гэта тая заяўка, пра якую я казаў падчас нарады».

Большасць падначаленых бацька адпраўляў да сакратара, але ўсё адно яны з сынам пасоўваліся, як скрозь кісель.

Нарэшце яны замкнуліся ў кабінеце з лаканічнай таблічкай «Дырэктар», і бацька з гонарам уручыў Яну сто даляраў.

— Трымай, Грыша выдаў гатоўкаю. У цябе мінулай ноччу на канале нейкі бум наведвальнасці здарыўся. Што ты там такое выклаў?

Ян пакруціў у руках купюру і прамармытаў:

— Ды так... нічога асаблівага. Усяго патрохі.

Насамрэч ён, едучы ў бацькаў офіс, ужо высветліў, што выклікала бум, але чамусьці не хацеў пра гэта апавядаць.

— Кумулятыўны эфект, — кіўнуў бацька. — Але ўсё адно малайчына, не чакаў. Ведаеш, калі так пойдзе далей, я табе пару замоў падкіну. З джынсай.

— Ты ж, здаецца, ацяпляльным абсталяваннем гандлюеш? — здзівіўся Ян.

— Джынса, — засмяяўся тата, — гэта схаваная рэклама! Я з юрыстамі ўжо абмеркаваў, як закон аб рэкламе абысці...

— А... — Ян працягваў круціць сотку ў руках. — Ясна.

— Ясна яму... Калі ўсё пойдзе нармалёва, зможаце падымаць у месяц баксаў пяцьсот! Што з такімі шалёнымі грашыма рабіць будзеце?

Ян у чарговы раз склаў і разгладзіў купюру, згадаў, які ролік выклікаў ажыятаж... і аддаў грошы бацьку.

— Тата, — сказаў Ян, — а ты можаш размяняць па пяцьдзясят?

— А, сапраўды, — скеміў бацька, — вас жа двое... Трымай!

Але Ян забраў толькі адну купюру.

— Гэта Гэлі. А мае схавай у свой сейф... Я ж змарную на штосьці. А мне ўвосень спатрэбяцца ўсе мае грошы.

— Разумнееш, сын, — праз іронію ў бацькавым голасе прагучала здзіўленне.

І, здаецца, павага.

Ян запхнуў купюру ў кішэнь і хутка выйшаў.

У калідоры выцягнуў мабільнік і набраў Дарыну:

— Занятая?.. Ды проста сустрэцца хацеў... Навіны ёсць...

* * *

Выглядала Дарына зусім ачмурэлай. Калі Ян адстаяў чаргу і прынёс каву, яна паспрабавала пакрышыць у кубачак замест цукру зубачыстку.

Ян з усмешкай забраў паламаную палачку і высыпаў у каву цукар. Побач з Дарынай ён часта пачуваўся вельмі арганізаваным мужчынам.

— Авоечкі, дзякуй! — Дарына пагладзіла свайго кавалера па руцэ. — У мяне ўжо ад гэтай матэматыкі вочы на лоб! А ты да ЦТ рыхтуешся? Я во...

Ян зразумеў, што зараз Дарына ўстане на пратаптаную сцежку, і паспешліва перапыніў яе:

— Так, я ў курсе. Слухай, я хацеў наконт кватэры паразмаўляць.

— Кватэры? — сяброўка паглядзела на яго са здзіўленнем. — Якой кватэры?

— Ну, якую ў Маскве давядзецца здымаць.

— А-а-а! — зразумела Дарына. — Гэтай... Ды рана яшчэ думаць. Трэба паступіць спярша. Аказваецца, абітурыенты з Беларусі ў Расіі...

— Ды ведаю я! — Ян пачынаў траціць цярплівасць. — Я ж таксама ў Маскву паступаю, забылася?

— І праўда... зусім я ўжо. А ты круты! Не хвалюешся нават. А мой рэпетытар...

— Так, — Ян злёгку стукнуў далонню па стале, — вернемся да кватэры. У цябе ёсць пажаданні?

Дарына сербанула каву і насупілася.

— У сэнсе?

— Ну, — Ян намагаўся казаць як мага павольней, — у якім раёне мы будзем яе здымаць. Колькі пакояў... Які паверх...

— Пачакай! — Дарына ўтаропілася на Яна. — Што значыць «мы»?

«Гэнае ЦТ зусім ёй мазгі высушыла», — падумаў Ян і патлумачыў яшчэ больш цярпліва:

— Мы з табою. Ты ж сама сказала, што адна кватэру не пацягнеш. Таму мы дамовіліся, што будзем жыць разам.

— Мы? Разам?

З тварам Дарыны рабілася нешта незразумелае. Збянтэжанасць змянілася недаверам, потым яна быццам паспрабавала засмяяцца — і зноў збянтэжылася.

Ян западозрыў нядобрае.

— Мы дамовіліся, — з націскам паўтарыў ён. — Мы будзем здымаць адну кватэру.

Дарына, здаецца, нарэшце ўцяміла.

— Адну кватэру? — удакладніла яна. — І спаць... разам?

Ян збіраўся адказаць абыякавым «ну так», але ў роце вельмі недарэчы перасохла, таму ён адно хітнуў галавой.

Дарына замерла на секунду, а потым разрагаталася.

— Янчык... ну ты што, зусім ужо?!

Ачомаўся Ян каля выхаду з «МакДональдса».

«Ну і на здароўе, — падумаў ён, — яшчэ пашкадуеш!» Ён загадаў сабе не думаць пра падступную ашуканку, але на душы было пагана.

Працягваючы ўнутраны дыялог з подлай Дарынай, ён дайшоў амаль да цырка і нечакана пачуў дзіцячы голас:

— З Гэляй хачу! Хачу з Гэляй!

Ян азірнуўся і ўбачыў пяцігадовага хлапчука, які канькаў, закапыліўшы ніжнюю губу.

— Ніякага гелію! — адказаў яму тата. — Ты яго зноўку выпусціш!

— Так! — радасна адгукнуўся хлапчук.

— Не! — тата пацягнуў сына ў бок метро. — Нельга выпускаць! Трэба моцна трымаць!

Тут Ян згадаў, што час аддаць доўг.

* * *

З коўзанкі Гэля вярнулася шчаслівая. Толькі яна збіралася выдаць маці ўсе свае навіны, як тая сама выйшла да яе ў калідор. Выглядала яна жахліва. Следам за ёю з'явілася незнаёмая жанчына, таксама заплаканая.

— Ну што, змагарка за справядлівасць, дамаглася свайго? — грозна спытала маці.

— Што?! — здзівілася Геула.

— Я цябе, здаецца, прасіла не рабіць глупстваў! — крыкнула маці. — Я ж цябе прасіла!

Маці ніколі раней не падвышала голасу. Геула спалохалася.

— Я нічога дрэннага не зрабіла, — прамовіла яна, — я сказала, што Аксана — падлюка, але гэта праўда!

— Праўда? — з'едліва спытала маці. — А ты падумала, што падставіла мяне? І Алеську падставіла, якая скаргу прытрымала? Гэтая падлю... Аксана патэлефанавала Алесінаму начальству, і цяпер не толькі мяне закрыюць, але і ў яе непрыемнасці!

Незнаёмая жанчына шморгнула носам, і Геула зразумела, што Алеська — гэта яна.

— Мама, ты ж заўсёды вучыла, што трэба казаць праўду, — пачала апраўдвацца Гэля, але маці перапыніла яе.

— Геула, ты ўжо дарослая дзяўчына, магла б і падумаць! І змоўчаць іншым разам!

— Хто б казаў! — завялася Гэля. — Хто б на бацькоўскім сходзе іншым разам змоўчаў, га? Пэўна ж нічога такога і не нарабілася б!

— Я дарослы чалавек, я сама адказваю за свае ўчынкі! — усхадзілася маці. — А праз цябе пакутуюць іншыя людзі!

— Ну дык і адказвай, калі дарослая! — канчаткова ўзлавалася Геула і, ляпнуўшы дзвярыма, выскачыла з кватэры.

Яна прабегла пару лесвічных пралётаў і з разгону ўрэзалася ў Яна.

— Гэлька, — выгукнуў ён, — усё файна! У нас першыя сто баксаў! Уяві! Якія мы ідыёты, трэба было раней рэкламу ставіць!

— Сто баксаў? — уразілася Гэля і хліпнула.

— Ты чаго равеш? Усё ж файна! Яшчэ пара тыдняў — і мы мільянеры! І маме сваёй перадай, што яна можа не працаваць больш ніколі! І мы з табою камеру новую купім, будзем па ўсім свеце здымаць! Залезем на Пізанскую вежу, у Паўночным моры плаваць будзем!

— Лепей у Паўднёвым, — папрасіла Гэля і ўсміхнулася скрозь слёзы.

— У Паўднёвым дык у Паўднёвым, — радасна пагадзіўся Ян, — а я навучуся кіраваць рэактыўным самалётам. Нам жа з табою патрэбны будзе рэактыўны самалёт, каб хутка перамяшчацца паміж мацерыкамі?

— Патрэбны, — кіўнула Гэля і зноў хліпнула.

Гэлю зусім развезла, і яна ўткнулася носам Яну ў плячо.

— Яна заўсёды казала, што трэба праўду, а сама на мяне крычыць... Ёй Алеська даражэйшая за мяне! Яе шкада, а я... Што мне настаўнікі ўвесь час мозг дзяўбуць праз яе, дык мяне не шкада...

— Ды годзе табе, — Ян абняў Геулу, — затое цяпер ты будзеш забяспечваць маму, а яна стане жаласна кленчыць у цябе грошы на касметыку. А ты такая скажаш: «У цябе ўжо адна памада ёсць...»

— Ёй не патрэбная касметыка, — сказала Геула.

— А што тады? — здзівіўся Ян.

— Міксер.

— Ну добра, значыць, будзе кленчыць новы міксер, а ты скажаш: «Навошта табе міксер, у цябе ўжо пяць ёсць!»

Геула засмяялася. Ёй зрабілася цёпла і хораша, і яна ўтулілася носам у Янаў швэдар. У яго ён быў

зусім не колкі, у адрозненне ад «сіямскага». Гэля расслабілася. І дарма. Бо непрыемнасці і не думалі заканчвацца.

— Геула, што гэта значыць?

Гэля адсунулася ад Яна і ўбачыла Кастуся, які стаяў на лесвіцы з букетам у руцэ.

— Калі ты не хацела ехаць праз... во гэтага, так бы і сказала, — прамовіў ён.

— Ды якога «гэтага»?! Кастусь, ты з глузду з'ехаў! Гэта ж Ян! Ты ж яго ведаеш! У нас з ім увогуле нічога не можа быць!

— Вы што, — абурыўся Ян, — змовіліся?! Я вам дэфектыўны ці што?

— Ян, ты чаго? — Гэля здзіўлена ўтаропілася на Яна.

Гэтак жа, як і Дарына паўгадзіны таму.

Ад крыўды і роспачы Ян зароў і кінуўся на Кастуся.

* * *

Геула ачомалася каля Опернага тэатра.

«Нішто сабе я пагуляла», — падумала яна.

Гэля цьмяна памятала, як сюды трапіла. На пачатку шляху яна душылася слязьмі і, хаваючыся пад башлыком байкі, ішла не разбіраючы дарогі. Потым слёзы скончыліся, і яна проста ішла. Хутка. Наперад.

Геула сцягнула з галавы навушнікі і адключыла плэер. Выняла з кішэні мабільнік — пяць прапушчаных ад маці і сем ад цёткі Алі. Гэля зразумела, што давядзецца азвацца, і абрала цётку.

— Ты дзе? — цётка Аля была лаканічная.

— Каля Опернага.

— Чакай, я буду праз сем хвілін.

Прыехала Альбіна праз пяць.

— Па сустрэчцы перла? — здзівілася Гэля, сядаючы ў машыну.

— Хочаш дахаты? — удакладніла цётка Аля, ігнаруючы пытанне.

— Не ведаю, — шчыра адказала Геула.

— Я запрасіла б цябе да нас, але Кастусь прыйшоў з «ліхтаром», замкнуўся ў пакоі і нічога не кажа.

Альбіна вытрымала паўзу, але Гэля маўчала.

Цётка Аля ўздыхнула.

— Гэля, ну даруй ты яму ўжо! — жаласна папрасіла яна. — Гэта я Кастуся прымусіла пайсці да цябе. Гэта я кветкі абірала. Слухай, ты скажы, калі ён цябе нечым пакрыўдзіў, я яго... не, забіваць не буду, але ведай: я на тваім баку.

— Не крыўдзіў ён мяне, — змрочна адказала Гэля.

— Тады завошта ты яго па мысе?

Геула адкінулася на спінку сядзення і заплюшчыла вочы. Тлумачыць да смерці не хацелася.

— Гэта не я, — сказала яна. — Гэта Ян, мой сябар. Кастусь ўсё не так зразумеў. Мы проста стаялі на лесвіцы і абдымаліся. Ян мне грошы прынёс за рэкламу. А Кастусь вырашыў, што я з ім... А Ян здурнеў — і біцца.

— А што за Ян? — з удаванай абыякавасцю спытала цётка Аля.

— Ды ў нас з ім увогуле нічога не можа быць! — усхадзілася Гэля. — Мы сто гадоў знаёмыя! Мы ў дзесяць гадоў разам у летніку былі, памятаеце, гэта ж вы мне пуцёўку падарылі. А потым шмат ра-

зоў у «Калекцыі прыгод»* сустракаліся, ён мне як брат, разумееш?

Альбіна доўга маўчала, стукаючы пальцамі аб руль.

— Слухай, а можна асабістае пытанне? — наважылася яна. — Але ты маеш права не адказваць, калі я не ў сваю справу лезу.

Геула кіўнула.

— Гэля, а чаму вы з Кастусём... Ты не думай, я не... я проста здзіўляюся... Калі б мне ў шаснаццаць гадоў прапанавалі такую пуцёўку... Я разумею, што варта было ўсё зрабіць не так, што Кастусік дурань і трэба было запытацца ў цябе. Але... Карацей, чаму вы яшчэ не гэта... не разам?

У пытанні Альбіны не было цікаўнасці або кпінаў, і Гэля вырашыла адказаць. Да таго ж яна была ўпэўненая, што цётка Аля не перадасць іхнюю размову Кастусю.

— Шчыра? — уздыхнула яна. — Мне гэта папросту не прыходзіла ў галаву.

Альбіна зноў надоўга змоўкла.

— Але вы хоць цалаваліся? — спытала яна праз нейкі час.

— Ну так, — пацепнула плячыма Гэля, — але я неяк і не думала... Мы ж яшчэ кшталту непаўналетнія...

— Зразумела, — сумна сказала Альбіна і рушыла з паркоўкі. — Я завязу цябе дахаты. Кастусю, мяркую, патрэбны пэўны час — астыць.

* Мінская фірма, якая займаецца дзіцячым і падлеткавым адпачынкам. Мы яе вельмі любім.

* * *

— Янік! — гукнула маці, тыцкаючы пальцам у смартфон. — У мяне тэлефон глючыць. Не дапаможаш?

Адказу не было. Зрэшты, сын рэдка адгукаўся на галасавыя сігналы. Маці ўздыхнула і пайшла ў Янаў пакой.

— Мне твая класная напісала, — паведаміла яна, расчыняючы дзверы, — а я ў чат зайсці не магу.

Ян не адказаў, ён быў вельмі заняты: ляжаў на тахце ў позе эмбрыёна. Маці здзівілася яшчэ болей — ён ніколі не клаўся спаць так рана. Дзеля ўсяго дзеля падышла і памацала лоб. Ян нервова таргануўся, але, здаецца, лоб быў халодны. Маці яшчэ раз уздыхнула і падняла з падлогі байку. Брудную і трохі падраную.

— Так! — падскочыў Ян. — Я біўся! Ясна?! І не пытайся чаму! А байку новую куплю, зараблю! І ўвогуле, стукаць трэба!

Маці выйшла, стараючыся як мага цішэй зачыніць дзверы.

У калідоры сутыкнулася з мужам, які толькі вярнуўся з працы.

— Ян дома? — спытаў ён. — У мяне да яго справа!

— Дома... але ты яго не чапай пакуль.

Станіслаў Францавіч выцягнуў з партфеля планшэт і сунуў жонцы ў рукі.

— Я высветліў, адкуль у яго бум наведвальнасці! — ён прагартаў некалькі ролікаў і спыніўся на адным. — Глядзі!

Яна спачатку хацела зірнуць адным вокам, але не здолела адарвацца, пакуль не даглядзела.

Кадры мільгацелі. Геула ўсміхалася. Супілася. Грызла аловак. Камера выхоплівала яе ў нечаканых ракурсах. Відаць, Ян здымаў сваю «сіямскую сястру» цішком. Музыка — пяшчотная і дзёрзкая адначасова — вельмі дакладна падкрэслівала кожны рух Гэлі. І толькі ў фінале мітульга кадраў рэзка спынялася, а ў музыцы заставалася адна пяшчота. Геула спала. Яна ляжала, скруціўшыся абаранкам, на Янавай тахце.

Апранутая.

І ўсё адно мурашкі пабеглі па скуры.

А калі Гэля, прачынаючыся, пацягнулася, мурашкі знерухомелі.

Ролік скончыўся.

Янавы бацькі яшчэ некалькі секунд працягвалі глядзець на згаслы экран.

— Трэці раз гляджу, — прызнаўся Станіслаў Францавіч. — І кожны раз праймае... Цікава, дзе ён такую... Шамаханскую царыцу знайшоў?

— Гэта ж Гэля, — задуменна адказала Барбара.

— Якая Гэля?! — адмахнуўся муж. — Бачыў я тую Гэлю... Смаркачка недаробленая. А тут... Карацей, трэба, каб ён яшчэ пару разоў яе зняў! Толькі на фоне... — бацька пайшоў да пакоя Яна: — Дык ён, кажаш, у сябе?

— Не трэба, Стасік! — папрасіла Барбара.

Але муж быў настроены рашуча. Барбара далей ад граху схавалася ў гасцёўні.

Праз пару секунд да яе данеслася:

— Што разлёгся, Кустурыца? Справа ёсць!..

Станіслаў Францавіч прычыніў дзверы, і размова чулася толькі як бубненне.

Барбара абудзіла планшэт і зноў запусціла ролік з Гэляй.

Муж меў рацыю: з другога разу ролік прабіраў нават мацней, чым з першага. А з трэцяга — яшчэ мацней.

Яна ачомалася, калі пачула сярдзітае:

— Ды якое «адчапіся»?! Ты, дурань, намацаў залатую жылу. Трэба яе цяпер даіць! Дакладней... распрацоўваць!

— Адвяжыся! — голас Яна гучаў істэрычна. — І не ўваходзь у мой пакой без стуку! Ясна?!

Станіслаў Францавіч выйшаў угневаны:

— Не, ты чула? Як ён увогуле бізнес весці збіраецца? Аднойчы пашанцавала на рынак трапіць — а ён, бач ты, не ў гуморы! Калі б я на свой гумор глядзеў, мы б даўно з торбамі пайшлі!

Барбара не спрачалася.

* * *

— Вітанкі, парназорка! — выгукнула Смірнова, і ўсе засмяяліся.

Геула азірнулася. Ёй зрабілася цікава, каго так весела вітаюць аднакласнікі.

— Што азіраешся? — зарагатала Смірнова. — Поспех падкраўся неўпрыкмет?

— Ты пра што? — змрочна спытала Гэля.

Яе жыццё апошнім часам з цяжкасцю можна было назваць поспехам. З маці яна так і не замірылася, з Янам і Кастусём было скончана. Цётка Аля, вядома, вельмі добры чалавек, але сяброў яна не заменіць.

— А шмат плацяць за здымкі ў порна? — з'едліва пацікавіўся Прысмакоў.

— Якое порна, вы што, усе абкурыліся? — абурылася Геула.

— Ды годзе табе, не саромейся, — чмыхнула Смірнова. — Хлопцы вунь зранку круцяць, разоў пяцьдзясят паглядзелі ўжо.

— А вам аператар не патрэбны? Вы наступным разам вазьміце мяне, я здымаць умею, будзе паўнавартасны відос, а тут тэма недараскрытая...

Прысмакоў пацягнуўся рукой да праймы Гэлінай блузкі і праз секунду ўжо вішчаў і падскокваў.

— Ты што, зусім дурная — кусацца? — зароў ён.

— Толькі крані, — скрозь зубы працадзіла Геула.

— Ды годзе ўдаваць з сябе цнатліўку! — выгукнуў Прысмакоў.

Геула шпурнула ў яго заплечнікам.

— Гэй, ратуйце мяне ад гэтай псіхапаткі! — крыкнуў Прысмакоў.

А Геулу схапіла за руку Смірнова.

— Бач, а што ты хацела? Такія ролікі выкладаць — і каб у хлопцаў сківіца не адвісала?

Гэля ў думках палічыла да пяці. Лічыць да дзесяці цярплівасці не хапіла.

— Я. Нічога. Не. Выкладала, — сказала яна. — Я ўвогуле не разумею, пра што размова.

Відаць, яна была вельмі пераканаўчая.

Смірнова міргнула і пацягнулася па тэлефон.

— Я табе ўчора спасылку кідала, ты бачыла? — спытала яна.

— Мне ўчора трохі не да таго было, — змрочна адгукнулася Гэля.

— Дык во! — Смірнова тыцнула ў смартфон. — Дзіўна... напісана, што заблакавана.

Гэля паглядзела на адрас заблакаванага відэа і зразумела, што прыдушыць Яна голымі рукамі, што б ён там ні выклаў. Зараз жа.

— Я скажу класнай, што ты захварэла, — крыкнула Гэлі наўздагон Смірнова.

Геула нават не азірнулася.

Чакаць тралейбуса ў яе не ставала цярплівасці. Гэля неслася праспектам Прытыцкага, на хаду набіраючы Янаў нумар.

«Абанент часова недаступны...»

Геула прыспешыла крок. На мінскае неба імкліва і велічна, як Зорка Смерці, напаўзала шэрая хмара. Калі Гэля дабегла да дома Яна, з хмары паваліў снег.

* * *

У дзверы званілі.

Ян ляжаў.

У дзверы працягвалі звaніць.

Ян ляжаў і згадваў, што хвіліну таму ён чуў дамафон. Тады не ўстаў і цяпер уставаць не збіраецца.

Назойлівы тыпус перайшоў на кароткія трэлі.

«Пайду і заб'ю, — падумаў Ян, — чым-небудзь цяжкім».

Званок пачаў перадаваць нешта азбукай Морзэ. Да какафоніі далучылася Нора.

Ян устаў. Нічога цяжкага не знайшлося, затое на вочы трапілася адкрутка.

З адкруткай у руцэ ён расчыніў дзверы.

— Ты што, зусім ужо?! — спытала Геула і пайшла проста на Яна.

Ян ачмурэў ад гэткага нахабства, але пасунуўся ўбок.

— Я зусім ужо? Гэта ты зусім ужо! — Ян трос адкруткай, быццам дрэўкам ад вельмі маленькага сцяга. — Спачатку валачэ свайго хахаля, які бойкі ладзіць, потым прад'явы нейкія кідае...

— Ты сам бойку пачаў! І ўвогуле, не пра бойку размова! Ты што пра мяне наздымаў там?!

— А твой сам гузака на лоб шукаў! З'явіўся ўвесь такі з кветкамі...

— Не змяняй тэму!

— Сама не змяняй!

Яны схітраліся сварыцца і перамяшчацца ў пакой да Яна.

— Што! Ты! — ледзь не крычала Геула. — Пра мяне! Зняў?!

— А навошта! Ты! — у тон адказваў Ян. — Свайго ёлупня! Да мяне прывалакла?!

Гэля зразумела, што так яны ні пра што не дамовяцца. Пакуль Ян не выкажацца па набалелай тэме, ад яго ні ладу ні складу.

— Так! — сказала яна, як ёй падалося, з ледзяным спакоем. — Давай разбяромся. Я Кастуся да цябе не прыводзіла. Згадай, дзе мы перастрэліся?

Ян насупіўся.

— І нічога такога Кастусь пра цябе не сказаў.

— Затое ты сказала! — усклікнуў Ян.

— Я?! — здзівілася Геула.

— Ага! Сказала, што я даўбак і ты з такім даўбаком не хочаш мець ніякіх стасункаў!

— Ды не называла я цябе даўбаком!

— Ну... мо́жа, не даўбаком. Але яно так прагучала!

«Ды што ж ты за ідыёт такі!» — ледзь не прамовіла Гэля ўголас, але ў яе хапіла сілы волі замест гэтага сказаць:

— Прабач... Я не хацела цябе пакрыўдзіць. Прабач, шчыра...

Ян стаў у позу «гнеўны адчай». Гэля падлезла яму пад руку і паказытала. Ян таргануўся, але выраз крыўды на твары застаўся.

— Ну як сабе хочаш! — не вытрымала Геула. — Злуйся, хоць лопні. Ты патлумач, што за ролік пра мяне зняў парнаграфічны?

Ян так здзівіўся, што забыўся на крыўду.

— Што?! Там нават эротыкі не было! Ты сама хоць бачыла?

У Гэлі адлягло ад сэрца. Усё ж такі аднакласнікі ў яе дурні.

— Зараз, — Ян шчоўкаў мышкай, адкрываючы *YouTube*. — Глядзі... гоп...

— Так, — пацвердзіла Геула, — у мяне таксама не адкрываецца.

Ян ліхаманкава адкрываў адзін «сіямскі» ролік за адным, але паўсюль замест відэа выскоквала таблічка з нейкім дробным тэкстам.

— Яны ўвогуле канал заблакавалі! За «сур'ёзнае парушэнне правілаў»! Ат халера! Я зараз ім ліст напішу...

Гэля яшчэ трохі пасядзела побач з Янам, які набіраў паведамленне, чытаў даведку, шукаў братоў па няшчасці. Геула ўздыхнула і спытала:

— Можа, гэта якраз праз мой ролік? Усё ж такі там было нешта... непрыстойнае?

— Ды клянуся! — адказаў Ян. — Нічога такога! Ты паўсюль апранутая! Ну смяешся... ну злуешся... А напрыканцы ўвогуле спіш.

— Чаго?!

— Ды памятаеш, ты ўсю ноч з мамай нешта гатавала, а потым прыйшла да мяне і задрамала? Але там таксама ніякай парнухі! Проста ляжыш...

Нядобрыя прадчуванні зноў заварушыліся ў Гэлінай душы.

— Янік... а ролік у цябе на кампе захаваўся, так? Дай зірнуць.

— Гэлька, родная! Пачакай! Яны якраз адказалі! Дай мне паўгадзіны, я ўсё разблакую!

Гэля зразумела, што варта пакінуць Яна разбірацца з праблемай. Яна ведала свайго «сіямскага брата» даўно і здагадвалася, што за паўгадзіны ён не разбярэцца... але за пару дзён дасць рады. А пакуль... якая розніца, што там было на відэа, калі яно ўсё адно заблакаванае?

Геула выйшла ў калідор і ўбачыла, што падчас сваркі яны з Янам не зачынілі ўваходныя дзверы. Лямант Норы даносіўся аднекуль з пад'езда. Гэля вылавіла котку каля смеццеправода і вярнула ў кватэру.

— Ян! — гукнула Геула. — Нора ледзь не збегла!

Адказу яна не дачакалася.

Калі яна выйшла на вуліцу, ніякіх слядоў хмары на мінскім небе не засталося. І снег, які выпаў, паспеў цалкам растаць.

* * *

Гэля адчыніла замок у кватэру, налегла плячом, а потым мусіла пазваніць: выявілася, што дзверы зачыненыя на засаўку.

Адамкнула Геуле бледная маці.

— Прабач мне, — прамовіла яна, — я не павінна была на цябе крычаць.

— Я таксама не павінна была, — сказала Гэля, — можна ўвайсці?

Маці пасунулася і прапусціла Гэлю ў калідор.

— А ты навошта зачынілася? — пацікавілася Геула.

— Я баюся, — ціха адказала маці, — мне такіх жахаў нарасказвалі. Розныя нягоднікі ўрываюцца ў кватэры...

— Навошта?

— Ну, кажуць, калі не могуць даказаць незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць, дык нацкоўваюць бандытаў, і тыя робяць пагром.

— Навошта? — здзівілася Гэля.

— Не ведаю, — шэптам адказала маці.

— Зразумела, — сказала Гэля, — збірайся. Паедзем да Ады.

* * *

У Ады было спакойна. У будні дзень на могілках не бывае шмат наведнікаў.

— Глядзі, — сказала маці, — неўзабаве півоні заквітнеюць. Колькі бутонаў сёлета!

Гэля выдрала нахабны дзьмухавец, які прарос проста праз плітку, і паглядзела на куст.

— Ага. Ёй было б даспадобы.

— Што значыць «было б даспадобы»? — абурылася маці. — Ёй даспадобы. Іначай яны б тут не квітнелі! Ты ж памятаеш Аду, вакол яе ўсё было якраз так, як яна хацела.

Гэля зразумела, што маці вярнулася да звыклага стану.

— А цяпер кажы, — загадала яна, — што за бандыты? Скуль ты гэта ўзяла?

— Я пакуль у чарзе ў выканкаме сядзела, наслухалася...

— Ты б яшчэ тэлевізар паглядзела! — чмыхнула Геула.

— Табе ўсё жартачкі, — зноў пачала заводзіцца маці, — а я сёння адмовілася ад дзясятка замоў. А тры мне трэба зрабіць ну проста абавязкова, інакш я людзей падвяду, а я баюся.

— Чаго? — здзівілася Гэля.

— Ну раптам суседзі знюхаюць, скаргу напішуць...

— Мама, у цябе паранойя, — сказала Гэля, — ты столькі гадоў пячэш, і ніколі ніхто з суседзяў не скардзіўся.

— Сапраўды! — ледзь не заплакала маці. — Я столькі гадоў увогуле не думала, што такое магчыма! Але цяпер ужо ведаю!

Гэля прысела каля магільнай пліты.

— Баба Ада, — папрасіла яна цалкам сур'ёзна, — скажы ты ёй, каб не псіхавала!

Напэўна, гэта проста наляцеў вецер, але півоні калыхнуліся нераскрытымі бутонамі.

— Бачыш! — усміхнулася Гэля і зноў звярнулася да каменя: — Баба Ада, а я грошы зарабляць пачала. Невялікія пакуль... Ян пяцьдзясят даляраў аддаў... Але ён кажа, што далей будзе больш. Я малайчына?

Гэтым разам вецер дыхнуў мацней, півоні радасна загайдаліся.

Геула ўзнялася.

— Усё, мама, не хвалюйся. Неўзабаве будзеш ляжаць на канапе і чытаць кніжкі. А я буду зарабляць.

Маці выцерла слёзы тыльным бокам далоні.

* * *

На вячэру Ян выйшаў сам, маці яшчэ і паклікаць не паспела.

Плюхнуўся на крэсла і ўтаропіўся ў цукарніцу.

Маці насцярожылася, але вырашыла пытанняў пакуль не задаваць. Вялікі жыццёвы досвед падказваў, што мужчыну ў такім стане спярша трэба накарміць.

Дый у любым іншым стане.

Яна паставіла перад сынам талерку з печанай бульбай і адбіўной. Ян механічна ўзяў відэлец і пачаў есці бульбу. Маці ўзяла нож і яшчэ адзін відэлец і нарэзала адбіўную. Цяпер сын паглынаў гарнір уперамежку з мясам. Нора неўпрыкмет забралася Яну на калені і цярпліва чакала, калі ёй што-небудзь дастанецца. Маці села насупраць і падперла галаву рукой.

Калі талерка амаль апусцела, Ян зірнуў на яе і сярдзіта адсунуў.

— Цярпець не магу бульбу!

Пыса Норы асвятлілася надзеяй. Котка асцярожна пацягнулася да рэштак адбіўной і атрымала па лапе ручніком.

— Ну хоць мяса даеш! — папрасіла маці.

— Наеўся ўжо, — Ян адсунуў відэлец як мага далей.

— Зараз гарбаты налью.

Маці прыбрала відэлец у ракавіну. Талерку вырашыла пакуль пакінуць.

— Скажы, мама, — спытаў сын, пакуль маці важдалася з імбрыкам, — яны нармальныя?

— Хто?

— Ну гэтыя... на юцюбе! Уяві, яны мяне за парнуху заблакавалі! Ведаеш, за які ролік? Дзе я Гэльку здымаў! Я зараз пакажу, у мяне застаўся...

Ян хацеў ускочыць, але котка ўчапілася ў ягоныя калені.

— Ты скуль тут?! — Ян сярдзіта скінуў Нору на падлогу.

Маці суцяшальна паклала руку яму на плячо.

— Я бачыла ўжо. Тата паказаў учора.

Ян убачыў перад сабою кубачак гарбаты і цукарніцу з лыжкай. Насупіўся, але пачаў насыпаць цукар у кубак.

— У іх, бач ты, трыццаць дзве скаргі ад нейкіх ёлупняў! Што яны там убачылі, дурні заклапочаныя?

Маці зноў села пры стале і падрыхтавалася слухаць, але дачакалася толькі пытання:

— От скажы: дзе там парнуха?!

— Ну, — працягнула маці, — па-мойму, вельмі... пачуццёва атрымалася...

— Ды проста з мантажом пацэліў! — Ян сёрбаў гарбату вялікімі глыткамі, не адчуваючы тэмпературы. — І саўндтрэк добра лёг... Там жа не бачна нічога: ні цыц...

Ян асекся і скасавурыўся на маці, але тая зрабіла выгляд, быццам нічога не заўважыла.

— Янік, — сказала яна, — а табе Гэля падабаецца? Як дзяўчына...

— Мне?! — ад абурэння Ян ледзь не папярхнуўся гарбатай. — Гэлька? Ты што, мама?! Яна проста ў кадры добра глядзіцца... І грае ніштавата... І, зрэшты, «Сіямцюб» мы з ёй удваіх прыдумалі... Але каб падабацца?! Ды не падабаецца яна мне аніколькі! Мне ўвогуле на яе начхаць!

Ян стаў нервова хапаць з талеркі астылую бульбу, потым пад трывожным позіркам Норы ўзяўся за мяса.

— Сыне... — асцярожна пачала маці, але Ян зноў ускочыў.

— Ды годзе ўжо лезці да мяне з гэтай лухтой! «Ах, Геула!», «Ах, прыгажуня»... Ды яна ўвогуле... Не сімпатычная нават!

— Я не пра тое, — здолела ўставіць слова маці, — мо яшчэ бульбачкі з мясам?

— Ды не ем я тваю бульбу! — заявіў Ян. — І ўвогуле, мне кавалак у горла не лезе! І ты не лезь!

Ян забраў гарбату і ганарыста сышоў, адсунуўшы нагой котку. Маці пахітала галавой і ўзялася мыць посуд. Нора, не спяшаючыся, даядала пад сталом скрадзены кавалак адбіўной.

* * *

Геула драмала на матэматыцы і ад рэзкага груку дзвярыма ледзь не звалілася з крэсла.

— Усе памятаюць, што сёння пасля заняткаў вы едзеце на свята моладзі і вясны, — са сцвярджальнай інтанацыяй прамовіла Аксана Віталеўна.

— Чаго?! — спытаў Прысмакоў.

— Я асабіста праверу спісы, — цвёрда сказала завуч, — і нават не спадзявайцеся збегчы, кантроль будзе падвойны. І з майго боку, і з боку раённага кіраўніцтва.

— Але дождж! — шэптам паскардзіўся нехта з дзяўчат.

— Не з цукру, не растанеш, — адрэзала завуч. — Гэта гарадское мерапрыемства, будзе выступленне

мастацкай самадзейнасці, конкурсы на развіццё вашых фізічных здольнасцей, установы адукацыі нашага раёна возьмуць удзел у розных спаборніцтвах...

— Аксана Віталеўна, я не магу, у мяне трэніроўка, — сказала Смірнова.

— Смірнова, у цябе заўсёды трэніроўкі! А ў нас спартыўна-масавыя мерапрыемствы, і ў мяне справаздачнасць.

— Ну дык і рабіце справаздачу, — ціха прамовіла Геула. — Навошта нас туды цягнуць?

— Хто сказаў? — раўнула завуч.

У класе павісла напружаная цішыня.

— Я разумею, што некаторым начхаць на школу, — з'едліва сказала завуч, — начхаць на тое, што ўва ўсіх нас і ў мяне асабіста будуць непрыемнасці, ім толькі б... толькі б...

Аксана Віталеўна не знайшла слоў і закашлялася.

— Я магу працягваць заняткі? — спытала настаўніца матэматыкі.

— Працягвайце, — велічна махнула рукой завуч і выйшла.

Клас злосна засыкаў ёй услед.

— Ну вы ж разумееце, — быццам просячы прабачэння, сказала матэматычка, — вы ведаеце, у якой сістэме мы жывём. На жаль, мы не здольныя яе змяніць.

— Чаму? — спытала Гэля.

— Чуеш ты, заторкніся! — закрычаў Прысмакоў. — Калі б твая мамка ад падпіскі не адмовілася, Аксана на нас не мела б зуб. «Бэшак» сваіх яна наўрад ці пад дажджом праз увесь горад пагоніць!

Клас загудзеў.

— Ды годзе вам, — прымірэнча прамовіла настаўніца, — вам карысна прагуляцца. Падыхаеце паветрам, пабачыце, як выступаюць вашы равеснікі. І да гімназіі ніхто не будзе чапляцца. Нам у наступным годзе атэстацыю праходзіць! А дождж, можа, яшчэ і скончыцца.

* * *

Але дождж быў упарты.

Як заўсёды падчас свят, да «Мінск-Арэны» прыгналі пяток аўтазакаў і некалькі дзясяткаў амапаўцаў.

— Зноўку свята на зоне, — змрочна пажартаваў нехта ў чарзе да рамкі.

На яго зашыкалі.

Амапаўцы здранцвела стаялі з каменнымі тварамі, моклі, выконваючы свой абавязак, іхнія калегі каля рамак былі больш гаваркія.

— Ваду пакінулі, ключы, тэлефоны з кішэняў павыкладалі, заплечнікі паказваем у раскрытым выглядзе...

— А вы каго ад нас ахоўваеце? — весела спытаў нехта з натоўпу.

— Пагавары мне яшчэ, — абсек змрочны міліцыянт. — Ваду пакінулі тут, я сказаў.

— Вы чагось баіцеся? — не сунімаўся жыццярадасны хлопец.

— Я нічога не баюся, — з націскам адказаў амапавец і пайграў мускуламі, нібы намякаючы.

Каб не глядзець на ягонае квадратнае падбароддзе, Гэля адвярнулася і натрапіла позіркам на дзяўчынку, якая ўсхліпвала непадалёк. Побач

з ёй стаяла валіза на колцах — памерам з палову дзяўчынкі. Геула падышла да яе, працягнула пачак сурвэтак і спытала:

— Чаго румзаеш?

— Мне на трэніроўку трэба, у мяне лёд... На мяне трэнер сварыцца будзе, калі спазнюся!

Гэля ўзяла дзяўчынку ў адну руку, валізу — у другую і пратараніла чаргу.

Чарга супраціўлялася. Усім хацелася як мага хутчэй увайсці, адзначыцца ў раённага кіраўніцтва і збегчы на фудкорт у гандлёвы цэнтр насупраць. Але Геула строга пакрыквала:

— Прапусціце! Чалавеку на трэніроўку трэба!

Народ бурчаў, але расступаўся. Гэля і фігурыстка ўперліся ў амапаўца.

— Раскрыць валізу! — закамандаваў ён.

— У мяне там канькі, у мяне трэніроўка, я спазняюся!

— Раскрыць валізу! — гыркнуў міліцыянт.

— Слухайце, у вас тут нібы спартыўнае свята, а яна акурат спортам займаецца! — не вытрымала Гэля. — Адзіная з усіх, хто тут у чарзе стаіць! Прапусціце дзіця, што вы, не чалавек?!

— Я пры выкананні! — адсек амапавец.

Дзяўчынка, размазваючы слёзы і дождж па твары, узялася расшпільваць маланку валізы.

— Я з табою пайду, скажу, каб трэнер не сварыўся на цябе, хочаш? — спытала Гэля.

Дзяўчынка заківала часта-часта.

Дождж узмацніўся, чарга заскуголіла і паціснулася ўперад.

* * *

— Дзе каву знайшла? — спытала змрочная Смірнова.

— Трэба часцей рабіць дабро, — сказала Геула. — Суцешыла малую, а малая паказала мне, дзе кава-аўтамат.

На вялізнай пляцоўцы паміж двума лядовымі палацамі знаходзілася сцэна, на якой жаласна пішчалі, імітуючы спеў, пяць дзяўчат. Некалькі груп выступоўцаў не змясціліся пад павеццю. Дарослыя, якія суправаджалі іх, раскрылі над імі парасоны. Гледачоў было няшмат. Яны таксама трымаліся чародкамі, хаваючыся пад парасонамі.

Сваіх Гэля знайшла пад брылём галоўнай арэны. Твары аднакласнікаў не абяцалі нічога добрага.

— Кава? — змрочна спытаў Прысмакоў.

Далейшы ягоны спіч цалкам складаўся з мацюкоў, але Геула здолела зразумець сутнасць. Прыходзіла Аксана, усіх адзначыла, Гэлі не было, і зараз увесь клас будзе за гэта расплачвацца. Аксана сказала, што асабіста адзначыць іх яшчэ раз праз дзве гадзіны. Ці раней. І таму ўсе гэтыя дзве гадзіны яны павінны тырчаць тут і атрымліваць асалоду ад свята спорту. А Геуле зараз мала не будзе.

Гэля павярнулася і сышла. Дакладней, перад тым яна сказала нешта кшталту:

— Я нікому не дазволю размаўляць са мной такім тонам.

А потым павярнулася і сышла. Яна цьмяна памятала, што амапавец спрабаваў яе спыніць і скіраваць да выхаду праз рамку, але яна адмахнулася ад яго, пераскочыла цераз агароджу і пабегла на прыпынак.

Смартфон разрываўся. Аднакласнікі дасылалі ёй праклёны адзін за адным. Яна адключыла гук і запхнула тэлефон як мага глыбей у сумку.

* * *

У школу Ян не пайшоў. Маці патэлефанавала класнай і напляла, што ён хворы, а потым разам з бацькам сышла на працу, паабяцаўшы вярнуцца крыху раней.

Ян зачыніўся ад Норы і паспрабаваў паганяць у «Танкі», але настрою не было нават на гэта. Ён заваліўся на тахту і стаў утыкаць у тэлефон. Карцінкі і відэа мільгалі ў стужцы, ствараючы суцяшальны эфект.

Раптам мабільнік зазваніў. Ад нечаканасці Ян адказаў, не паспеўшы заўважыць, хто тэлефануе.

Гэта была Дарына.

— Янчык, — з пакаяннем у голасе прамовіла дзяўчына, — ты прабач мне. Я не хацела цябе пакрыўдзіць.

— Добра, — адказаў Ян без усялякай інтанацыі.

— Ты праўда не крыўдуеш?

— Праўда.

— Не, — уздыхнула Дарына, — ты дакладна крыўдуеш. А давай сустрэнемся, пагутарым. Я не хачу, каб табе было дрэнна.

— Давай.

— А дзе? У нашай кавярні?

Ян зразумеў, што кудысьці выходзіць ён не ў стане.

— Я дома, — сказаў ён. — Хварэю.

— Авой, бедненькі! Гэта праз мяне? Я зараз прыеду! Табе садавіну можна? А дзе ты жывеш?..

Да прыходу Дарыны Ян хацеў быў прыбрацца ў пакоі, але абмежаваўся тым, што накінуў покрыўку на пасцель. Госця з'явілася з пакетам апельсінаў, ківі ды іншых «вітамінаў». Нора дзеля ўсяго дзеля круцілася каля ног, пакуль Дарына не наступіла ёй на хвост.

— Аёй, прабач, котачка! А ты моцна хварэеш? — сакатала Дарына, пакуль Ян вёў яе ў пакой. — Ты не заразны? А ты да ЦТ ачуняеш? Я, пакуль ехала, загугліла: гэта называецца псіхасаматыкай, калі чалавек ад хвалявання захворвае...

Ян пачынаў ужо шкадаваць, што не меў моцы адразу адмовіцца ад сустрэчы.

— Во табе вітамінкі, еш! Хочаш, я грэйпфрут абяру? Яго трэба абіраць ад гэтых... перапонак, яны гаркавыя...

Нора, пераканаўшыся ў неядомасці гасцінцаў, пазяхнула і сышла спаць на кухню. Ян зачыніў дзверы і стаў чакаць моманту, калі госця скончыць клапаціцца пра яго і зваліць.

Ён сядзеў і назіраў, як Дарына абірае грэйпфрут, слухаў, як яна апавядае пра падрыхтоўку да ЦТ і пра тое, што яна вельмі вінаватая... Адчуванне было амаль такое ж, як ад прагляду стужкі: шмат бязглуздай інфармацыі, але супакойвае.

Ачуўся ён на словах:

— ...А сэкс... Я проста не гатовая! Я разумею, ты мужчына, табе васямнаццаць, у цябе, напэўна, не аднойчы гэта было... А я... Карацей, я не з цябе смяялася, шчыра! Гэта проста нервовае!

Дарына падсела да Яна і ўзялася карміць яго грэйпфрутам. Ян адчуў яе цёплы бок. І сцягно, якое

прыціснулася да ягонай нагі. І мяккія грудзі, што ўпіраліся яму ў плячо.

Апатыя імгненна знікла.

А калі Дарына, смеючыся, пачала выціраць яму рот, Ян не вытрымаў, абхапіў яе ды імпэтна прыціснуў яе вусны да сваіх. Дарыну быццам паралізавала. Вусны ў яе былі нерухомыя, але Ян не мог спыніцца. Цалаваў штосілы, аднак дзяўчына не рэагавала. І толькі калі Ян страціў надзею і пачаў адсоўвацца, вусны Дарыны раптам адказалі на пацалунак. Зусім трошкі.

Гэтага хапіла, каб у Яна адкрылася другое дыханне. Яму падалося, што трэба пераходзіць да рашучых дзеянняў, але якіх? Ролікі «для дарослых», якія Яну даводзілася бачыць, не давалі адказу на гэтае пытанне. Там дзяўчаты былі ці аголеныя, ці ахвотна распраналіся самі. Ну, ці іх распраналі гвалтам, але да гэтага Ян не быў гатовы. Таму ён працягваў мучыць вусны Дарыны, нічога ўжо не цямячы.

Тут дзверы пакоя расчыніліся, і ён пачуў голас маці:

— Янік, у цябе госці?

Дарыну катапультай адкінула ад Яна. Дзяўчына адляцела на другі канец канапы і адвярнулася ад дзвярэй, завесіўшы твар валасамі. Ян адхіліўся ў процілеглы бок, выцяўшы патыліцу аб сцяну. Маці збянтэжана пераводзіла позірк з Яна на Дарыну і назад.

— Я толькі хацела, — узрушана прамовіла яна, — паглядзець, як ты...

— Стукацца трэба! — абурыўся Ян.

— Я проста ўзрадавалася, што Гэля прыйшла цябе наведаць, — сказала маці.

— Мама! — зароў Ян. — Выйдзі адсюль!

Маці здрыганулася, але выйшла і нават зачыніла за сабою дзверы.

Ян ускочыў, не ўзнімаючы вачэй і не ведаючы, куды падзець рукі, пamітусіўся па пакоі, а потым сеў на самае далёкае ад Дарыны месца — за камп'ютар. А гульню запусціў машынальна, проста ад нерваў.

— Хто такая Гэля? — пацікавілася Дарына.

Ян не адказаў, ён пачаў злосна біць па клавіятуры.

— А навошта табе столькі падручнікаў за дзявяты клас? — спытала Дарына. — Ты колькі прадметаў рыхтуеш? Авой...

Усталявалася цішыня.

Ян скасавурыўся і схаладнеў: Дарына трымала ягоны дзённік.

— Ты ў дзявятым? — спытала яна.

Ян ад роспачы ледзь не заплакаў.

— Але навошта ты мне хлусіў?

Ян апусціў галаву. І сядзеў так, пакуль за Дарынай не зачыніліся дзверы.

* * *

На інфармацыйную гадзіну Геула прыйшла са спазненнем, адчыніла дзверы і натрапіла на магільную цішыню.

Усе глядзелі на яе.

Святлана Фёдараўна, іхняя класная, даволі ціхая і лагодная, ачулася першай.

— Не чакала ад цябе, Вегірэйка, — з націскам сказала яна.

— Чаго? — здзівілася Гэля.

Яна агледзела клас. Смірнова сядзела, утаропіўшыся ў парту, Прысмакоў жа, наадварот, нахабна шчэрыўся, не зводзячы вачэй з Геулы.

— Праз цябе ў Святланы Фёдараўны вымова, — паведаміў ён, — за зрыў важнага мерапрыемства.

— Мы дзве гадзіны пад дажджом тырчалі!

— Ужо ўсе сышлі, толькі мы...

— Ты ведала, што Аксана не прыйдзе! Мы як дурні...

— І гэта вы яшчэ не ведаеце, што Гэлечка ў нас парназорка!

Геула пераводзіла позірк з аднаго аднакласніка на другога. Яна дрэнна разбірала, хто што крычыць, але нянавісць, якая з іх перла, прыпячатала яе да дзвярэй.

Святлана Фёдараўна ўзняла руку, каб супакоіць клас, але ў яе нічога не атрымалася.

Геулу ахапіла паніка. Яна выскачыла з кабінета і ў тую ж секунду зразумела, што больш не вернецца ў гэтую школу. Ніколі.

* * *

Ян псіхаваў, уяўляючы, як маці будзе дапытвацца: «А што гэта за дзяўчына?», «А чаму Гэля не прыйшла?», «Чаму ты на мяне накрычаў?» Ён прыдумаў ужо, як будзе паводзіцца — адразу заявіць, каб не чапіліся. Бо гэта іх не датычыць! І ўвогуле!..

Але маці ні пра што не пыталася. Увечары Ян не вытрымаў і пайшоў падслухоўваць, што яна скажа бацьку, аднак маці абмежавалася сціслым: «У сябе сядзіць...» А потым патэлефанавала класнай і папярэдзіла, што Янік захварэў і заўтра ў школу не прыйдзе.

Ад гэткай тактоўнасці зрабілася моташна. Ян сцягнуў на кухні пачак крэкераў, урубіў «Танкі». Пашанцавала: трапіў у топ. Адвёў душу — зняў два «пазікі», адну «шашлычніцу» і «мазайца»*.

Стала трохі лягчэй. Таму, калі ў пакой зазірнуў тата (дэманстратыўна пастукаўшыся!), Ян амаль не раззлаваўся.

— Слухай, — пачаў бацька з парога, — калі ўсё адно дома сядзіш, запішы мне пару ролікаў.

— Тата, я ж казаў табе! У мяне канал заблакаваны!

— Ды бог з ім, з каналам тваім! — адмахнуўся бацька. — Для мяне запішы. Усё адно што, каб толькі на фоне майго абсталявання.

— Якога яшчэ абсталявання?! — здзівіўся Ян.

— Секунду! — бацька выскачыў і неўзабаве вярнуўся з велізарным цеплавентылятарам, на якім красаваўся лагатып татавай фірмы.

Ён паставіў «абсталяванне» на стол, ледзь не цалкам яго заняўшы, і патлумачыў:

— Здымай што хочаш. Толькі на фоне гэтага агрэгата.

— Тата! Лета на парозе! Каму патрэбныя твае награвальнікі напрыканцы траўня?!

Бацька сеў на ложак і пачаў цягаць крэкеры з пачка.

— Напрыканцы мая — нікому. А напрыканцы кастрычніка — сама тое.

І тата пачаў падрабязна тлумачыць, з чаго Ян зразумеў, што сані (у сэнсе рэкламу абагравальні-

* «Пазік» — нямецкі танк Pz-IV, «шашлычніца» — нямецкая супрацьтанкавая самаходка з адкрытай рубкай (нагадвае мангал) Pz Sfl.IVc, «мазаяц» — амерыканскі танк M4A3E8.

каў) трэба рыхтаваць улетку, каб назапасіць гэтай рэкламы паболей, а ў кастрычніку-лістападзе вываліць у інтэрнэт магутнай плынню.

— Мне тут падлічылі, — бацька натхнёна жэстыкуляваў крэкерам, раскідваючы крошкі, — што ролікаў трэба каля сотні. Але кароткіх. Секунд па дзесяць. Максімум — паўхвіліны. Галоўнае, каб пацешныя былі. І на фоне гэтай бандуры...

Ян быў крыху агаломшаны татавым націскам, а той захапляўся ўсё болей.

— Не, лепей бы гэты агрэгат неяк абыграць. Толькі як-небудзь смешна... Напрыклад, ты кажаш: «Гэля, у цябе што, тэмпература?», а яна такая...

— Ніякай Гэлі, — перапыніў Ян, — не будзе! Зусім! Ніколі!

— Сур'ёзна? — здзівіўся бацька. — Добра, тады без Гэлі... Напрыклад, у пачатку роліка кладзеш на вентылятар пару кавалкаў хлеба, а праз хвіліну дастаеш тосты!

Тата рассмяяўся, задаволены прыдумкай, але, убачыўшы пахмурны твар сына, абарваў сябе.

— Ну добра, чаго я лезу са сваім крэатывам... Гэта твая праца. Карацей. Паслязаўтра мне патрэбныя тры ролікі. Рознага кшталту. Пакажу аддзелу маркетынгу. Калі нашы спецы ўхваляць, заключаем з табою дамову адразу на сотню... А там як пойдзе.

Ян ужо збіраўся адмовіцца ў максімальна рэзкіх выразах, але бацька нечакана перайшоў на звыклы іранічны тон:

— Ці не адолееш?

Ян моўчкі выключыў «Танкі» і запусціў відэарэдактар.

— Значыцца, паслязаўтра, — сказаў тата, узнімаючыся. — Тры ролікі. А лепей пяць!

* * *

Мінск, відаць, зразумеў, што трэба дзейнічаць рашуча.

Хоць стары каштан яму было вельмі шкада, але што зробіш...

Геула ішла... не, не куды вочы глядзяць. Вочы ў яе не глядзелі нікуды. Ногі самі неслі ў патрэбным кірунку. На скрыжаванні яна ўперлася ў агароджу. Давялося працерці вочы і ўбачыць, што ўпоперак дарогі ўпала дрэва. Вакол яго мітусіліся працаўнікі, але яны пакуль паспелі толькі перакрыць тратуар і паставіць таблічку «Абход».

Геула паслухмяна пайшла, куды паказвала стрэлка. І ўперлася ў дом Яна. Патэлефанавала, але мабільнік Яна быў адключаны. Гэля ўзлавалася. Чаму яму ніколі не дазваніцца? Галоўнае, калі Геула занятая, дык крыку потым! А як сам, дык тэлефон адключае.

Геула ўзняла вочы і паглядзела на вокны Яна. Тэарэтычна ён мусіў быць у школе, але Гэля чамусьці была ўпэўненая, што ён дома.

Гэля адвяла вочы і не заўважыла, як у акно Янікава пакоя ўрэзалася птушка. Ачмурэлы верабей яшчэ хвілін пяць сядзеў на падаконні, намагаючыся зразумець, як ён сюды трапіў.

Мінск у думках выбачыўся перад птушкай. Зрэшты, калі б вецер трохі не змяніў траекторыю птушынага палёту, верабейчык прызямліўся б на дах, а там бадзяўся кот Халімон, які ўцёк з трэцяга паверха.

Верабей ажыў, пакруціў галавой, пацокаў лапкамі па падаконні. Але Ян сядзеў спінай да акна, да таго ж у навушніках. І нават калі б птушка пачала выбіваць азбукай Морзэ: «Паглядзі ў акно, дурань!», ён бы нічога не пачуў.

«Кастусь, мне вельмі дрэнна», — напісала тым часам Геула.

«У мяне матэматыка», — адказаў Кастусь.

«Я пайду да цябе пешшу».

«Усё так дрэнна?»

«Так».

«Праз гадзіну буду дома».

Кастусь не любіў хадзіць пешшу, тата з дзяцінства вазіў яго машынаю — нават у садок, хоць тады яны жылі за два крокі ад яго. Геула і цётка Аля пацвельваліся з іх, аднак Альбіна запэўнівала Гэлю, што гэта не самы страшны мужчынскі недахоп. І з гэтым можна жыць.

Таму, калі Геуле было дрэнна, яна спярша круцілася па Захадзе, а ўжо потым утыкалася ў Кастусёва плячо — паплакаць.

Кастусь плячо падстаўляў заўсёды. Падставіў і цяпер. І Гэля нарэшце выплакала з сябе дурняў аднакласнікаў, сваю ідэю больш ніколі не хадзіць у школу і тое, што стасункі з маці сапсаваліся і жыццё ўвогуле страціла сэнс. Кастусь моўчкі гладзіў яе па галаве, а потым, калі слёзы скончыліся, пайшоў па свежую гарбату.

Геуле стала лягчэй настолькі, што яна пачала заўважаць навакольны свет. Яна паднялася, каб закрыць Кастусёў ноўтбук, які безупынна «квакаў» новымі паведамленнямі, і скамянела.

Кастусь у гэты самы момант на кухні перапісваўся з нейкай Алесечкай. Яны дамаўляліся сустрэцца ўвечары. Алесечка фліртавала, абяцала, што ўвечары будзе дома адна, і сумавала, што Кастусь кінуў яе нудзіцца ў школе.

І Гэля сышла. І думала пра тое, што сюды, відаць, таксама ніколі не вернецца.

* * *

Толькі Альбіна адчыніла дзверы ў дом, як яе ледзь не знёс Кастусь. Ад яго патыхала ядранай туалетнай вадой.

— Ты куды? — строга спытала маці, загароджваючы выхад.

— У мяне справы! Пусці!

— Калі ты да Гэлі, дык май на ўвазе, што...

— Ды адчапіся ты са сваёй Гэляй, — сказаў сын. — Яна неадэкватная...

Лагодна сказаў, без злосці. Гэта непакоіла.

— Яна — твая дзяўчына! Ці мала што паміж вамі было...

І зноў Кастусь не даў дагаварыць.

— Ды нічога не было. І не будзе. Яна дурніца ненармальная. Патэлефанавала сёння, захацела сустрэцца. Ну, я думаў, выбачацца будзе за сябе... і псіха свайго. А яна мне на жыццё скардзіцца пачала.

— І ты, вядома ж, — уздыхнула мама, — зноўку нешта недарэчнае ляпнуў.

— Ды маўчаў я! — Кастусь усё ж такі пачаў злавацца. — А потым па гарбату для яе пайшоў. Вярнуўся — а яе няма. Ну скажы, мам, яна нармальная?

— У яе проста цяжкі перыяд! — Альбіна спрабавала казаць пераканаўча. — Цяпер яе можа каўбасіць!

— Можа, — пагадзіўся Кастусь. — Толькі без мяне, добра? Слухай, пасунься ўжо, га? Мяне чакаюць!

Альбіна пасунулася. Кастусь збег, зносячы з сабою пахкі шлейф. Альбіна ўвайшла ў вітальню, села на пуфік і доўга так сядзела, утаропіўшыся ў сцяну.

* * *

Ян пачаў трохі стамляцца ад свайго раслиннага жыцця. Ад манітора рэзала вочы, бакі ад доўгага ляжання забалелі. Спрабаваў чытаць «Трох мушкецёраў», якіх падарылі яшчэ на Новы год. Адолеў старонак дзесяць, потым не вытрымаў, стаў прагортваць, каб даведацца, чым скончацца ўсе гэтыя гутаркі і дуэлі. А яшчэ котка — варта было толькі прачыніць дзверы, як яна прабіралася ў пакой і ўзлятала на шафу, адкуль сцягнуць яе не было ніякай магчымасці.

Дайшло да таго, што вырашыў падумаць пра ролікі для таты. Накідаў з дзясятак ідэй. Усе былі быццам і неблагія, але чамусьці не чаплялі. Ян збіраўся ўжо махнуць рукой на гэтую задуму і паспрабаваць знайсці ў сеціве кіно, якое яшчэ не бачыў, калі патэлефанаваў бацька.

— Ну што, працуеш? — спытаў ён адрывіста (напэўна, паралельна рабіў нешта тэрміновае).

— Ага, — адказаў Ян, не ўдаючыся ў дэталі.

— Сёння ўвечары пакажаш! — закамандаваў тата і адключыўся.

Ян уздыхнуў, усталяваў камеру і ўтаропіўся ў спіс ідэй. Цяпер яму не падабалася аніводная.

Згадаў пра дзіўную татаву прыдумку з тостамі ў цеплавентылятары і вырашыў паспрабаваць.

Увечары бацька зазірнуў у Янаў пакой і міжволі прысвіснуў з павагай.

— Уга!

Ян агледзеўся. Апроч звыклага непарадку, вакол валяліся «паўфабрыкаты» творчасці: некалькі тостаў (адзін надкусаны), паўздзьмутыя балёнікі, фігуркі лега, пакамечаныя папяровыя жоравы. Перад цеплавентылятарам на стале грувасціўся недабудаваны лінкар.

— Працую, — паныла патлумачыў Ян.

— Бачу, — бацька пашукаў вачыма, куды сесці, і застаўся стаяць. — Давай паказвай. «БАТЭ» праз паўгадзіны гуляе.

— Што паказваць?

— Здзекуешся? — здзівіўся тата. — Ты ж цэлы дзень працаваў! Вынік дзе?

— Ну... — Ян абвёў рукой пакой. — Во... І яшчэ во!

Ён працягнуў бацьку некалькі спісаных аркушаў. Той паспрабаваў разабрацца ў абрывістых запісах, уздыхнуў і спытаў:

— Але ж ты памятаеш, што дэдлайн заўтра?

— Чаго? — не зразумеў сын.

— Дэдлайн. Смяротная лінія. Апошні тэрмін.

— Ды зраблю я ўсё! — узлаваўся Ян. — Калі замінаць не будзеш...

— Кепскаму танцору... — тата абарваў сябе і сышоў, ляпнуўшы дзвярыма мацней, чым трэба.

Ян з нянавісцю зірнуў на касцяк лінкара і ўзяўся яго даломваць.

* * *

«У мяне такое адчуванне, быццам свет наўкол пачаў мігцець. Толькі ўчора ён быў сапраўдны. Трывалы. А цяпер усё нібы знікае, нібы выпараецца».

Геула набрала гэтыя радкі і ўтаропілася ў экран. Ніколі яшчэ яна не зневажала сябе публічнымі споведзямі, але ў яе проста не было іншых ідэй. Сядзець і плакаць? Нажэрціся піроржных? Слёз не было, салодкага Геула не ела. Калі б маці працавала, Гэля занялася б упрыгожваннем пары соцень капкейкаў. Калі б яна магла патэлефанаваць Яну, яны разам знялі б што-небудзь вясёлае.

«Мне здаецца, нібы пад нагамі багна. Яна засмоктвае мяне, я ўжо па калені ў жыжцы, а ўсе стаяць наўкол і смяюцца. С. намагаецца не глядзець. П. гатовы выліць на мяне вядро бруду. А. з радасцю яму дапаможа, а тыя, каго я любіла, яны ўсе недзе далёка-далёка. К. на спатканні з дзяўчынай, яны там займаюцца сэксам, бо яна не дурніца. Я., пэўна, гуляе і не згадвае пра мяне, а мама...»

На кухні нешта грымнула.

Геула пайшла паглядзець, што здарылася, і заспела бледную маці, разбіты кубачак на падлозе, а пры стале па-вайсковаму падцягнутага маладога чалавека.

— Сяргей Анатолевіч, — назваўся ён Геуле. — Я рады, што мы дасягнулі паразумення, мне было вельмі прыемна пазнаёміцца.

Геула паглядзела на маці, тая стаяла з каменным тварам.

— Дзякуй за каву, але я пайду, усяго добрага!

Маці не варушылася, і Гэлі давялося правесці маладога чалавека да дзвярэй.

— Хто гэта быў? — пацікавілася яна.

— Следчы, — сказала маці.

— І што зараз будзе? — спытала Гэля.

Маці паказала ёй паперку, на якой было напісана «1000».

— Што гэта? — здзівілася Гэля.

— Пэўна, даляры, — глуха адказала маці.

— Ты будзеш плаціць?

Маці пацепнула плячыма.

— У мяне няма гэтых грошай.

І Гэля падумала, што ў багне не толькі яна, што побач з ёю маці. І тонуць яны разам.

* * *

Ян амаль скончыў місію, калі па плячы паляпалі.

Ян сцепануўся і сцягнуў навушнікі.

— Я стукаў, — сказаў бацька, — але ты не чуў. Мантаж ролікаў, я так разумею, ужо зроблены?

— Ну-у-у... — прастагнаў Ян, скасавурыўшыся на экран, дзе ягоны танк уздрыгваў ад трапных удараў.

— Ты здзекуешся? — абурыўся тата. — Заўтра трэба вынік паказваць, а ты тут у вайнушку гуляеш? Зараз жа рабі мантаж!

— Ды няма з чаго мантаж рабіць, — прызнаўся Ян, назіраючы, як нямецкая самаходка ператварала ягоны «ІС»* у друшляк. — Я не зняў нічога.

Бацька ўзлавана тыцнуў у кнопку манітора і павярнуў сына разам з крэслам тварам да сябе.

* Савецкі цяжкі танк; абрэвіятура азначае «Іосіф Сталін».

— Спадзяюся, гэта такі жарт? — спытаў ён.

Ян глядзеў у падлогу.

— Зразумела, — уздыхнуў тата. — Зрэшты, я так і думаў.

Бацька выйшаў, вельмі акуратна зачыніўшы за сабою дзверы. Яну было сорамна, як у той дзень, калі ён — другакласнік! — насікаў ноччу ў ложак. На яго тады таксама не сварыліся, але пачуццё ён запомніў назаўсёды.

Ян уключыў манітор, выйшаў з гульні і пачаў ліхаманкава далучаць камеру да кампа. USB уставіў правільна толькі з пятага разу — рукі трэсліся.

Ён пачынаў здымаць адно, кідаў, браўся за іншае. Яму дакладна не ставала Геулы. Яна б хутка спыніла ягоны мандраж: «Ян, ну ты што! Вырашылі з тостамі — значыць, давай з тостамі!» І кадр без яе не выбудоўваўся. Ян зняў некалькі тэставых запісаў, і паўсюль былі хібы то з асвятленнем, то з кампазіцыяй, а ў апошнім ён схітрыўся зрэзаць сабе паўгалавы...

Праз паўгадзіны ў дзверы пастукалі. Голас маці прамовіў:

— Там да цябе... дзяўчына.

Ян ледзь не падскочыў ад радасці. Ён нават не стаў удакладняць, чаму гэта маці называе Геулу дзяўчынай.

Але гэта была не Геула.

Гэта была Дарына.

Ян утаропіўся ў яе, нібы ў жывую мумію. Маці тактоўна зачыніла дзверы.

— Я спярша патэлефанаваць хацела, — прамармытала Дарына. — А потым зайсці вырашыла...

Ян маўчаў. Ён не разумеў, што яна тут робіць і як на яе рэагаваць.

— А ў Маскву я не еду, — уздыхнула Дарына. — Бацькі палічылі грошы і... Карацей, буду ў эканамічны паступаць... На эканамічны я дакладна балаў набяру.

— Ну... добра... — толькі і здолеў прамовіць Ян.

— А ты што робіш? — спытала Дарына, разглядаючы кампазіцыю на стале: камера, цеплавентылятар і тры крываватыя самалёцікі.

— Ролік здымаю. Рэкламны. Для бацькі.

— Супер! — Дарына ўзрадавалася крыху больш энергічна, чым належала. — Ты працуеш ужо?! З маіх аднакласнікаў толькі адзін зарабляе, праграмы піша...

Ян зразумеў, што ў Дарыны ўключыўся звыклы фантан слоў, і спыніў яе ўзмахам рукі.

— Так-так, усё ясна. Але ты прабач, у мяне тут праблемы.

— Сур'ёзна? А якія?

Выявілася, што Дарына ўмее не толькі балбатаць. Яна хуценька перарабіла самалёцікі — і яе аэрапланы паляцелі больш роўна, чым выробленыя Янам пачвары. Потым яна прапанавала трохі змяніць фон. Акуратна вынесла Нору. Прычасала Яна. Вынесла Нору. Пагадзілася, што ідэя з самалёцікамі бязглуздая, а вось калі прымусіць лятаць пух... Дапамагла адагнаць котку ад разадранай пуховай падушкі. Падмяла і выкінула пух. Намалявала на балёніку пыску, якая смешна дэфармавалася пры надзіманні. Звабіла Нору з шафы кілбасой.

У выніку яны наздымалі матэрыялу няхай і не на тры ролікі, але як мінімум на адзін. Праўда, Ян адчуў, што ў ім набралася зашмат гарбаты.

— Хвіліну! — сказаў ён і выскачыў з пакоя.

Дарына агледзелася. Ёй хацелася зрабіць яшчэ што-небудзь карыснае. На вочы трапіў тэлефон Яна, на якім ён выключыў гук, калі пачалі здымаць. На экране свяцілася: «Прапушчаных выклікаў — 5». Дарына не ўтрымалася і праверыла. Усе званкі ад аднаго абанента — «Геула». Дарына вагалася літаральна секунду, а потым даслала эсэмэску з шаблону: «Выбачайце, я заняты,ператэлефаную пазней».

Ян уварваўся ў пакой з талеркай, поўнай лёду з лядоўні.

— Я ўсё зразумеў! Зараз мы яго растопім! Давай хутчэй, пакуль ён сам не растаў!..

* * *

— Гэля, я знайшла выйсце! — сказала маці.

Геула сцягнула навушнікі і праміргалася. Калі вочы трохі адаптаваліся да святла, якое ўключыла маці, а вушы да цішыні, якая ўсталёўвалася ў яе галаве без музыкі, Гэля пацікавілася:

— Выйсце куды?

— Геула, не тупі! — сказала маці строга.

— Не туплю, — уздыхнула Гэля, — кажы.

— Мы пераязджаем у Маладзечна! — заявіла маці.

— Зараз жа? — спытала Гэля.

— Геула! — даволі рэзка сказала маці. — Не да жартаў.

Гэля напружылася. Відаць, мама казала сур'ёзна.

— Слухай сюды, — маці села на Гэлін ложак. — Калі мы прададзім кватэру ў Мінску і купім у Маладзечна, у нас застануцца грошы. Мы зможам

жыць на іх нейкі час, пакуль я не знайду працу. Хабар дадзім, усе справы ў Мінску закрыем. Пачнём усё спачатку.

— Значыцца, ты сур'ёзна? — удакладніла Гэля.

— Абсалютна, — сказала маці, — я не спала ўсю ноч. Я думала. Гэта найлепшы варыянт.

— Але чаму Маладзечна?

— Гадзіна маршруткаю да Мінска. Сувязь добрая. Ёсць дзе вучыцца. Што яшчэ трэба?

Гэля сур'ёзна задумалася. «З Янам трэба развітацца», — пранеслася ў галаве. З іншага боку, пасля ягонага «выбачайце, я заняты» можна і не развітвацца. З ім усё зразумела. Як і з Кастусём, з якім лепей не сустракацца. Як і са школай.

— Я ў гэтую школу болей не пайду! — сказала Геула.

— Добра, — нечакана лёгка пагадзілася маці. — Рыхтуйся да іспытаў дома. А потым атрымаеш пасведчанне і рабі што хочаш.

— Ок, — прамовіла Геула, нацягнула навушнікі і выйшла з дому без аніякай мэты.

Ёй было ўсё адно куды ісці.

Мінск усхваляваўся.

Малгажата Півоньска, прадстаўніца Польскай культурнай суполкі, захацела пазнаёміцца са славутасцямі беларускай сталіцы.

Індывідуальны прадпрымальнік Рыгор пасварыўся з жонкай і пайшоў «таксаваць».

На станцыі метро «Спартыўная» манцёр кінуў анучу, прамочаную алівай, на падлогу.

Геула яшчэ не здагадвалася, што ўсё гэта неяк паўплывае на яе маршрут.

* * *

Яну было сумна і сорамна адначасова. Настолькі сумна, што ён не праганяў з каленяў Нору. І настолькі сорамна, што захацелася нешта тэрмінова зрабіць.

Пакуль яны з Дарынай здымалі сюжэты, здавалася, што ўсё добра, матэрыялу працьма. Але ранкам ён пераглядзеў знятае... Усё было нейкай лухтой і дзіцячым садком. Жартачкі натужлівыя. Ян прамаўляе, нібы драўляны салдацік. Усміхаецца, як ідыёт...

Ён наўздагад выцягнуў з архіва выпуск «Сіямцаў». Гэта быў адзін з самых недарэчных ролікаў — Геула і Ян адказвалі на пытанне, як сіямскія блізняты ходзяць у прыбіральню. (Пытанне, дарэчы, было рэальным.) Яны тады схітрыліся і аблічча не страціць, і ніжэй за плінтус не ўпасці. Безліч жартаў — і ніводнай непрыстойнасці...

Ян ледзь не расплакаўся. Котка на ягоных каленях ператварылася ў бясформеннае цеста. Гэта была пэўная прыкмета. Нора — як і ўсе коткі — мела звышнатуральны нюх і прыціскала сабою чалавека, якому неабходна было тэрмінова ўстаць і сысці.

Ян зразумеў, куды яму трэба.

* * *

Гэля імкліва рушыла ўздоўж вуліцы Прытыцкага, з зайздрасцю пазіраючы на спіны раварыстаў, якія яе абганялі. Увушшу грымеў N.R.M. Каля вялікага храма саўндтрэк скончыўся, Геула спынілася, каб пашукаць у тэлефоне што-небудзь гэткае ж маршавае.

Пакуль стаяла, звярнула ўвагу на машыну, прыпаркаваную амаль насупраць храма. З адчыненага акна даносілася гучная лаянка. Бялявая хударлявая жанчына няпэўнага веку хутка і таму зусім неразборліва сварылася на кіроўцу па-польску. Той адгыркваўся па-руску, сцісла і злосна:

— Я не понимаю... И по-английски тоже... Сама сказала, к церкви... Да пошла ты!*

Ён перахіліўся цераз пасажырку і расчыніў ёй дзверы:

— Жена дома мозг вынесла, теперь ты... Выметайся!**

Хударлявая жанчына выскачыла, з пачуццём ляпнула дзвярыма і выплюнула фразу, у якой Геула зразумела толькі «пся крэў». Машына рванула з месца.

І тут Гэля нешта адчула — ці то ветрык, ці то погляд, ці то лёгкі штуршок у спіну.

— Я магу вам дапамагчы? — спытала яна ў полькі.

— Так ест! — замежніца імгненна змяніла лютасць на ўсмешку. — Пшэпрашам, пані, называм се Малгажата... То ест моя карта...***

І яна выцягнула з сумачкі пакамечаную турыстычную мапу. Як казаў дзядзька Чынгіз: «Бог пераблытаў нашы мовы, але пакінуў нам указальны палец». Праз пяць хвілін тыцкання ў мапу і гутаркі на жудаснай сумесі польскай, рускай, беларускай і англійскай Геула зразумела, што Малгажата хоча

* Я не разумею... І па-англійску таксама... Сама сказала, да царквы... Ідзі ты! (*рус.*)

** Жонка дома галаву зачмурыла, цяпер ты... Вымятайся! (*рус.*)

*** Так! Прашу прабачэння, пані, мяне завуць Малгажата... Гэта мая мапа... (*пол.*)

пабачыць Кафедральны сабор, той, што побач з Нямігай. А зноў сядаць у таксоўку Малгажата нізавошта не жадае.

Гэля давяла польку да метро, але туды не пускалі.

— Задымленне, — патлумачыў ахоўнік, — разбіраемся.

— Тралейбус, — прапанавала Геула Малгажаце, — трынаццаць... тшынасце. Да канца. Ту фініш. А там юж* недалёка.

Госця адказала такім жаласным позіркам, што Гэля ўздыхнула:

— Добра, паехалі.

* * *

Камеру Ян вырашыў не браць. Мінулым разам, калі яны з Гэляй паспрабавалі здымаць у Верхнім горадзе, ні стуль ні ссюль з'явіўся амапавец памерам з Халка і запатрабаваў дазволу на здыманне. Калі б не Геула, не адбалбаталіся б. Таму сёння Ян збіраўся абысціся камерай смартфона.

* * *

Гэля давяла Малгажату да сабора, выслухала палымяныя падзякі на польскай мове і пайшла куды вочы глядзяць.

Яна не гуляла, а проста ішла па горадзе. Яна тут нарадзілася. Тут яна амаль месяц балансавала паміж жыццём і смерцю, лежачы ў кюветцы ў «сямёр-

* Ужо (*пол.*).

цы»*. Маці не любіла размаўляць на гэтую тэму, але аднойчы Гэля ўсё ж такі вытрасла з яе падрабязнасці. У Мінску яна першы раз усміхнулася, тут яна загаварыла, тут яна танчыла сняжынкай у садку і пайшла з гладыёлусамі ў першы клас. Тут яна баялася ў метро турнікетаў. Тут у яе жыцці быў Кастусь. Заўсёды быў. З Кастусём звязаныя ўсе паркі, усе цэнтральныя вуліцы. Вунь там, за рагом, яны хаваліся ад Кастусёвага трэнера, бо Кастусь прагульваў трэніроўку.

А яшчэ яны каталіся на катамаране па Свіслачы, Кастусь няўдала саскочыў, сам прамок і яе абліў вадой. І афіцыянты ў кавярні насупраць далі ёй плед і нават прынеслі бясплатна гарбату. Яны потым да гэтых афіцыянтаў яшчэ колькі разоў забягалі. Проста так, пабалбатаць. І аднойчы ўбачылі меланхалічную жанчыну, якая плыла па Свіслачы, стоячы на дошцы для сёрфінга і журботна вяслуючы.

А каля сабора да іх некалі прычапілася бабця, казала, што ў джынсах хадзіць грэх, трэба толькі ў спадніцы. Адчапілася, толькі калі Гэля паабяцала зараз жа пераапрануцца. Каля ратушы яны танцавалі падчас фестывалю вулічных тэатраў і Гэлю да ікаўкі напалохала (а пасля насмяшыла) «жывая статуя» камінара.

Гэля дайшла да плошчы і агледзелася. Сэрца шчымела. Як выявілася, яна вельмі любіла Мінск. Магла тыднямі не вылазіць са свайго «Захаду-3», магла сварыцца на тое, што «адстой і правінцыя», у Вільні бурчала: «Калі ў нас будзе гэтак жа», а як

* Мінская радзільня № 7, Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Маці і дзіця».

толькі высветлілася, што адсюль давядзецца з'ехаць, ёй зрабілася вельмі сумна. Так, Маладзечна не канец свету, гадзіна — і ты ўжо тут. Але што рабіць увечары? Ці можна адтуль паехаць патусіць на Ноч музеяў?

Геула згадала, што ў іх з Янам была файная ідэя — рабіць анонсы гарадскіх свят. Што, да прыкладу, думае пра вечарыны класічнай музыкі конь, які стаіць у вупражы каля ратушы?

Гэля паглядзела на вупраж. На каня. І зусім не здзівілася, убачыўшы там Яна. Ён спрабаваў зняць храпу каня, але з такога ракурсу яна не ўлазіла ў камеру смартфона.

Гэля абурылася.

— Ну ты хіба не бачыш, што ён глядзіць у іншы бок, быццам адварочваецца?! Давай здымем адсюль, будзе адчуванне, што яго ўсе дасталі, а тут яшчэ і ты са сваімі пытаннямі!

* * *

Ян быў настолькі паглыблены ў працэс, што ўспрыняў з'яўленне Геулы як нешта само сабою зразумелае. Пастаноўка кадра — гэта заўсёды была зона Гэлінай адказнасці. І як толькі ён перамясціўся туды, куды параіла «сіямская сястра», карцінка адразу атрымалася.

— Ага, — задаволена кіўнуў Ян. — Зараз трэба нешта ў рот соваць!

Парачка мінакоў захіхікала, аднак Гэля адразу зразумела праблему. Яна пакорпалася ў заплечніку і выцягнула масажную шчотку. Павярнула яе так, каб не было бачна зубцоў — атрымаўся мікрафон. Геула тыцнула яго ў зубы бронзаваму каню.

— Гэй! — закамандаваў Ян.

Гэля зрабіла крок убок, так што ў кадры засталася толькі рука з мікрафонам.

— Ноч! — сказаў Ян. — Матор!

І Геула засакатала:

— Дзень добры, паважаны конь! Праз два дні ў Мінску пройдзе традыцыйная Ноч музеяў. Што вы можаце сказаць з гэтай нагоды?

— Гэта цікава, — адказаў конь голасам Яна, — але чаму так мала ўвагі нам, коням?..

* * *

Гэля ўвогуле не зразумела, як гэта адбылося. Але за дзве гадзіны яны з Янам наздымалі столькі, колькі раней не маглі зрабіць за ўвесь дзень з падрыхтаваным сцэнарыем.

Гэта быў суцэльны экспромт. Конь справа размаўляў па-руску, быў пахмурны, скардзіўся на жыццё і казаў, што, маўляў, ежы даюць мала, усе намагаюцца залезці на шыю, ніхто не шануе, а жыццё поўнае нягод. Конь злева быў бадзёры, вясёлы, размаўляў па-беларуску, жартаваў з усімі мінакамі і кідаў двухсэнсоўныя рэплікі.

Фіналам праграмы мусіла стаць размова з войтам — ахоўнікам, які трымае ў руках ключ ад горада, і левы конь нават скіраваў усіх да яго, але раптам неба праяснела і сонца так прыгожа высвеціла і самога войта, і ключ у ягоных руках, што да яго можна было і не хадзіць. Ён проста стаяў удалечыні і быццам прапаноўваў ключ усім, хто цяпер знаходзіўся тут, каля ратушы.

— Наперад! — выгукнуў нейкі хлопец, скокнуўшы ў воз.

Нехта прысвіснуў, нехта запляскаў у ладкі. Гэля і Ян здымалі з двух тэлефонаў. Сонца свяціла, людзі ўсміхаліся, жыццё было цудоўнае.

* * *

У «Штоле» яны рагаталі так, што нават стукнуліся лбамі. Цётачка, якая забрала пусты імбрычак, уздыхнула нібы з зайздрасцю.

— А во гэтае вунь тое! — папрасіла Геула, і Ян адразу зразумеў, пра што яна.

Запусціў ролік, дзе кітаец іграў азадкам на музычнай лаўцы Агінскага*. Дакладней, на загад Яна і Гэлі ён то сядаў на лаўку, то ўскакваў. Паводле задумы сцэнарыста Яна і рэжысёра Геулы ў выніку мусіў атрымацца «рэп Агінскага», але лаўка была неслухмяная, яна не жадала спыняцца, калі чалавек з яе ўставаў. Зрэшты, усё адно атрымалася смяхотна — дзякуючы цярпліваму кітайцу, які мужна прысядаў і ўставаў, а потым яшчэ і цырымонна кланяўся.

У Яна жывот забалеў ад смеху, а Гэля стала азірацца, ці не перашкаджаюць яны каму. Але гэтая частка кавярні сёння была пустая. І на вокнах віселі такія шчыльныя парцьеры, што не разгледзець было, дзень звонку ці ўжо вечар.

Геуле раптам падалося, што яны не ў Мінску, а дзе-небудзь у Празе. Ці ў Кракаве. І гадоў ім нашмат болей.

* Лаўка ў Верхнім горадзе, прысвечаная кампазітару Міхалу Агінскаму. Калі сесці на яе, пачынае граць знакаміты паланэз Агінскага.

І Яну прымроілася тое ж самае. Ягоная нястомная фантазія вытлумачыла, як яны сюды трапілі — прыехалі на кінафестываль. Прывезлі свой новы фільм. Толькі што быў закрыты паказ, і ўсе журналісты бралі ў іх інтэрв'ю, а журы перазіралася так, што стала зразумела — яны амаль перамаглі.

«Добра, — падумала Гэля, — што мы ад іх змыліся! Тут яны нас не знойдуць!»

«Ты ж хацела перамагчы? — падумаў Ян. — Хацела, каб усе пабачылі, які мы геній!»

«Не, — запярэчыла Геула, — я хацела, каб у нас атрымаўся выдатны фільм. І ён атрымаўся!»

І тады Ян нахіліўся да Гэлі і пацалаваў яе ў вусны. Вельмі пяшчотна. Ён і не ведаў, што так умее. І Геула не ведала, але пацалавала яго ў адказ.

Увесь гэты час — а прайшло, пэўна, некалькі дзён, пакуль яны цалаваліся, — Ян і Геула былі тымі самымі дарослымі паспяховымі людзьмі з умоўнага Кракава.

Ляпнулі дзверы, нехта праслізнуў у прыбіральню. Ян і Геула адначасова адвярнуліся адно ад аднаго і схапілі кубачкі, але тыя былі пустымі.

— Я заўтра зраблю мантаж, — сказаў Ян, устаючы, — і выкла...

Ён абсекся, узгадаўшы, што выкладаць няма куды. Геула таксама ўсхапілася, вельмі старанна шукаючы нешта ў сумачцы.

— Ведаеш, — сказаў Ян, — а давай новы канал завядзём. «Сіямцюб» шкада, але пакуль яго яшчэ разблакуюць...

Гэля не адказала. Не ўздымаючы галавы, яна хутка выйшла.

«Шкада, — падумаў Ян, — што тут наперад плацяць. Так бы афіцыянта пачакаў».

Ён памарудзіў хвіліну, каб даць магчымасць Геуле сысці, і пайшоў следам.

Але Гэля не сышла, стаяла каля шкляных дзвярэй і глядзела на залеву. Ян падышоў і стаў трохі ззаду.

— Не атрымаецца новы канал, — сказала Геула, — мы з Мінска з'язджаем.

— А, — прамовіў Ян.

Гэля адчыніла дзверы і выскачыла вонкі. Яе спіна вельмі хутка зрабілася нябачнай за сцяной дажджу.

* * *

Мінск заўсёды быў вельмі добрым горадам. Але іншым разам у яго заканчвалася цярплівасць. Вось і цяпер ён хвастаў Геулу халоднымі струменямі, злосна дзьмуў у твар, кідаў ёй пад ногі лужыны і намагаўся ўбіць ва ўпартую галаву: «Назад! Вярніся!»

Усё было дарма.

Ачомалася Геула ў Серабранцы. Ад холаду. Дождж даўно скончыўся, але джынсы былі мокрыя да калена і куртка на плячах наскрозь.

Гэля ўключыла навігатар. Яна прашыбавала пад дажджом шэсць з паловай кіламетраў. Да бліжэйшага метро — каля двух.

У кішэні тры рублі драбязою, хопіць на каву. Пытанне толькі, дзе бліжэйшая кавярня? Гэля пайшла ў бок Партызанскага праспекта.

«Цікава, ці ёсць кавярні ў Маладзечна? — думала Геула. — Раздурыліся мы тут у Мінску, кава нам не тая, пенка недастаткова ўзбітая, свежых ягад у меню няма... Трэба будзе з'ездзіць паглядзець. Маральна падрыхтавацца...»

«Цікава, а чым там людзі займаюцца вечарамі? Куды яны ходзяць? Зноўку давядзецца ўсім тлумачыць, чаму ў мяне такое імя».

«Цудоўны сёння быў дзень. Я запомню Мінск вось такім. Добра, што было сонца».

«Трэба патэлефанаваць маме».

Думкі ў Гэлі скакалі, яна не магла ні на чым засяродзіцца.

«Цікава, а колькі часу спатрэбіцца на пераезд? Добра было б нікуды больш не хадзіць. Зашыцца дома і выйсці, толькі калі трэба будзе пераязджаць».

«Цікава, а як людзі ў Маладзечне паміраюць? А шпіталі там ёсць?»

«Там ёсць інтэрнэт, можна весці свой блог з Маладзечна. "А ў нас сёння зноўку нічога не здарылася..." Нуль праглядаў».

— Так, мама, я жывая. Неўзабаве прыеду. А як ты думаеш, у Маладзечне ёсць шпіталь?

Гэля выслухала маміну тыраду пра тое, што гэта раённы цэнтр, буйнейшы за некаторыя еўрапейскія гарады, што ўсё там ёсць і каб яна не рабіла з сябе «сталічную штучку».

Геула ўтаропілася ў кубачак з кавай.

Блог будзе называцца «Сталічная штучка ў Маладзечне». Зрэшты, маці заўсёды кажа, што «ўсе жывыя — і гэта галоўнае». Прарвёмся.

* * *

Увечары ў Яна нешта здарылася з маніторам — малюнак паплыў, рэзкасць знікла. Ян паспрабаваў патыцкаць у кнопкі наладак, але ўбачыў, што подпісы да іх невыразныя. Ён перавёў позірк на шафу.

Тая пагойдвалася. Толькі тут Ян адчуў, што ў яго страшэнна рэжа вочы — быццам ён паўгадзіны глядзеў на зварку. З цяжкасцю сфакусіраваўся на гадзінніку — не паўгадзіны глядзеў, а восем гадзін запар. Няхай і не на зварку, а на экран, але таксама адурэць можна. Ян хацеў дзеля ўласнага заспакаення пераглядзець ролік, але зразумеў, што тады вочы проста выбухнуць. Ён усыпіў комп і паваліўся на ложак.

Прачнуўся, калі за акном ужо кіпеў дзень. Прыслухаўся — Нора настойліва скрэблася да яго. І злёгку стукалася галавой аб дзверы. Так яна рабіла, толькі калі бацькі адсутнічалі. Ян збегаў у прыбіральню, памыўся, прыхапіў на кухні талерку з бутэрбродамі і гарбату.

На свежую галаву ролік глядзеўся яшчэ лепей, чым учора. Ян пастараўся як мае быць — дадаў цітры, стоп-кадры і нават просценькім спецэфектам прымусіў варушыцца губы бронзавых коней. Ён даслаў ролік тату і адкінуўся на спінку крэсла.

«Ну вось, — падумаў ён, — я вольны».

Аднак думка чамусьці не ўзрадавала. Захацелася тэрмінова нечым заняцца.

Ян абвёў строгім позіркам пакой...

Калі маці вярнулася з крамы, генеральная прыборка ішла поўным ходам. Каля дзвярэй пакоя Яна стаялі тры пакеты са смеццем, ложак быў ідэальна засланы, а сам Ян завіхаўся з анучкай, праціраючы ўсё, што можна было працерці.

— Сынуля... — войкнула маці.

— Смецце я зараз вынесу! — бадзёра адгукнуўся сынуля.

— Штосьці здарылася?

— Ды ўсё нармуль. Проста прыбрацца вырашыў. Вы ж самі ўвесь час мне глузды выносіце!

Маці заўважыла каля стала вядро і швабру.

— Янчык! Ты і падлогу будзеш мыць?

— Ну так, — пацепнуў плячыма Ян. — Зараз пыл вытру. Пыласосам я прайшоўся ўжо, але памыць жа лепей, так?

— Сынуля, — маці паспрабавала казаць як мага больш цвёрда, — што здарылася? Ты зноў пасварыўся з Гэляй?

— Ды ідзіце вы ў пень са сваёй Гэляй! — з паўпаварота завёўся Ян. — Я проста прыбіраю пакой! Самі ж ныеце ўвесь час! А цяпер... Карацей, не замінай!

Ён дэманстратыўна ўрубіў музыку на камп'ютары. З калонак грымнуў рэп.

Маці пацягнулася была па смецце.

— Не чапай! — зароў Ян, перакрыкваючы скаргі простага хлопца на недарэчнасць існавання. — Сам вынесу!

Маці знікла на кухні. Упершыню яна пашкадавала, што не пазнаёмілася з бацькамі Геулы і нават не ведае іхніх тэлефонаў. Дзяцей трэба было неадкладна ратаваць.

* * *

Геула выйшла са свайго пакоя, каб паглядзець, хто гэтак настойліва звоніць у дзверы.

Спачатку ў дзвярным праёме з'явіліся два пакеты. Потым яшчэ два. Потым пакет з сокамі. Апошнім зайшоў дзядзька Чынгіз са скрынкай яблыкаў.

Маці стаяла, уціснуўшыся ў сцяну, з вельмі змрочным тварам.

— Карацей, — сказаў Чынгіз, — мне зараз няма калі, я вярнуся ўвечары, і мы наконт справы пагутарым.

— Што гэта? — спытала Геула.

— Пяць кіло грэчкі, пяць кіло рысу, макароны, мука, цукар, замарожаная гародніна, вунь там бульба, морква, буракі, сокі асобна, яблыкі так сабе, ды лепшых не знайшоў. Малако, кефір у «тэтрапаках» па пяць літраў, на тыдзень вам хопіць. Масла, соусы ўсялякія... Гэты пакет не ведаю з чым, яго Альбіна збірала.

— Але навошта? — ціха спытала Ліза.

— Ты ж грошы не возьмеш, — адказаў Чынгіз, — а прадукты возьмеш, нікуды не падзенешся. Цяпер мы ведаем, што Геула пад'еўшы. Я ж хросны? Значыцца, абавязаны пра яе клапаціцца. Гэля, а ты паклапаціся пра сваю някемлівую маці, якая замест таго, каб адразу падзяліцца праблемай, ладзіць нейкі цырк з пераездам.

— Я не вазьму ў вас грошай, — сказала Ліза.

— А я і не даю табе грошы, — з націскам адказаў Чынгіз, — разбірайце прадукты, увечары пагутарым.

* * *

— Палічы, колькі мы ім вінныя, — усхліпнула Ліза, разбіраючы пакеты, — я аддам адразу, як змагу.

— Угу, — сказала Гэля.

— Я ведаю, ты думаеш, што яны не возьмуць. Значыцца, трэба аддаць так, каб узялі.

— Угу, — сказала Гэля.

— Так, я ведаю, ты думаеш, што гэта іхняя справа, але я дарослая самастойная жанчына і павінна навучыцца пераадольваць свае цяжкасці.

— Угу, — сказала Гэля.

— Чаго ты са мной увесь час згаджаешся? — чмыхнула Ліза.

Геула ўздыхнула.

— Вы з Кастусём зусім пасварыліся? — спытала маці.

— Я, відаць, з усімі зусім пасварылася, — прамовіла Геула. — Паехалі ўжо хутчэй у тваё Маладзечна, я хачу ўсё спачатку.

— Ведаеш, з працай засада. Я з'езджу туды на тым тыдні, але пакуль нічога не магу знайсці. Мне народ на форуме піша, што яны самі ўсе ў Мінску працуюць. Можна, вядома, прадавачкай уладкавацца, але прадавачкай я і ў Мінску магу...

Геула заплюшчыла вочы і перастала слухаць. Яна дакладна ведала, што маці што-небудзь прыдумае. Маці заўсёды што-небудзь прыдумляе.

* * *

Ян праз бацькава плячо ў чарговы раз пераглядаў ролік, зняты ў Верхнім горадзе. З кожным разам ролік падабаўся яму ўсё болей і болей.

— Супер, — сказаў тата нудным голасам. — А абсталяванне?

— Якое абсталяванне? — не зразумеў Ян.

— Во гэтае, — тата тыцнуў пальцам у цеплавентылятар на стале, насцярожыўся. — Ты што, пафарбаваў яго?

— Пыл сцёр. Тата, ну пры чым тут цеплавентылятар! Там жа пра іншае...

— А мне патрэбны іміджавы ролік, — адрэзаў бацька і ўстаў з-за камп'ютара. — Але гэты таксама

дашлі, пакажу маркетынгу проста як прыклад вашай творчасці.

Ян утаропіўся ў экран і зноў стаў корпацца ў знятым учора матэрыяле. Вядома ж, тое, што яны з Дарынай «нафільмавалі», паказваць людзям было нельга. Але сама Дарына магла яму зараз спатрэбіцца.

Яны сустрэліся на Нямізе. Дарына з нагоды цёплага надвор'я была ў яркай спадніцы і блузцы з аголенымі плячыма. І ў басаножках на такой высокай платформе, што Ян адразу папярэдзіў:

— Мы не ў клуб, калі што!

— Ды я ведаю. Але ж ты казаў нешта пра здымкі!

Дарына ўсміхнулася, і Ян зразумеў, што яна яшчэ і шчодра нафарбаваная. «Калі толькі паспела?» — здзівіўся ён, але вырашыў не зважаць.

Ян прывёў Дарыну да ратушы і паспрабаваў дадзымаць яшчэ пару дзясяткаў секунд, каб неяк далучыць да сюжэта бацькава абсталяванне. Неўзабаве ў Яна скончылася цярплівасць.

— Ты павінна рабіць выгляд, што табе холадна! — крычаў ён на Дарыну. — Не ў прыбіральню ты хочаш, а мерзнеш! А зараз глядзі вунь туды, там цеплавентылятар! Ды не на каня! І не на гітарыста... Дзядзька, адыдзі, будзь чалавекам! Во сюды! Тут ён стаіць!

— Але ж тут нічога няма, — разгублена лыпала Дарына накладнымі вейкамі.

— Я потым зраблю мантаж! — Яну хацелася прыдушыць дурнаватую асістэнтку. — Так... Рукі трохі ўбок... Ды не туды!

Ён зразумеў, што зараз яго затрымаюць за нецэнзурную лаянку ў грамадскім месцы. Таму што Гэля адразу здагадалася б, што «ўбок» насамрэч значыць «угару».

Ян выключыў тэлефон і пакрочыў у метро, спрабуючы супакоіцца. Каля сабора не вытрымаў і азірнуўся: гітарыст стаяў побач з Дарынай і нешта казаў. Дзяўчына няўважліва слухала, не адводзячы вачэй ад спіны Яна. Але як толькі Ян звярнуў на Дарыну ўвагу, яна павярнулася да гітарыста і пачала шчабятаць і ўсміхацца.

* * *

— Нікуды ты не паедзеш, — дзясяты раз паўтарыў Чынгіз і залпам выпіў шклянку мінералкі, — пакуль я не разбяруся, што здарылася.

Ліза свідравала яго позіркам.

— Вось не трэба мне тут гэтых жаночых штучак, ты рот адкрывай і кажы. Што здарылася?

Ліза дэманстратыўна ўтаропілася ў акно.

— Добра, — сказаў Чынгіз, — пайду ў Гэлі спытаю.

— Не смей ублытваць дзіця! — сказала Ліза.

— Знайшла дзіця! — чмыхнуў Чынгіз. — Цікавая ў цябе логіка. А ты падумала, ува што ты яе ўблытваеш? Дзе яна там вучыцца будзе? Ад сяброў яе адрываеш.

— Геула хоча з'ехаць! — з выклікам сказала Ліза.

— Геула не разумее, што такое «з'ехаць». А ты павінна разумець!

— Чына, я не магу сядзець у вас на шыі...

Чынгіз — высокі шыракаплечы казах — узняўся з зэдліка, заняўшы сабою ўсю кухню.

— О богі! — узвыў Чына, заламаўшы рукі над галавой. — Алах, Буда, Хрыстос і ўсе астатнія, паглядзі на маю шыю! Дзе ты там бачыш сябе?

Ліза ўсміхнулася. І тут жа пачала выціраць слёзы.

— О, сапраўды, цяпер давай будзем плакаць! — бушаваў Чына. — Я стаміўся тлумачыць табе адно і тое ж. Умееш аддаваць, умей і браць.

— Але Гэля з Кастусём пасварыліся, — замармытала Ліза, — і я не хачу быць абавязанай.

Тут Чына пачаў мудрагелістую прамову па-казахску з украпваннем беларускіх слоў, і Гэля, якая прыйшла на гукі сваркі, не ўтрымалася ад смеху.

— О, дзіця прыйшло, — здзекліва зазначыў Чына, — карацей, так, пакуль вы мне пра ўсё не раскажаце, я буду сядзець тут у вас. А з Альбінай потым разбірайцеся самі. І карміць мяне трэба тры разы на дзень. А зранку я пачну працаваць, і мне будуць званіць па сорак разоў за хвіліну па трох тэлефонах, а я...

Гэля цяжка ўздыхнула і ўзялася апавядаць з самага пачатку. З таго дня, калі маці надумала аднесці ў школу капкейкі.

* * *

Як выявілася, вельмі цяжка рабіць справу, якую ненавідзіш. Увесь суботні ранак Ян спрабаваў уставіць татаў цеплавентылятар у сюжэт з коньмі і сто разоў збіраўся паслаць усё лесам, але адразу ў галаве гучаў здзеклівы голас бацькі: «Я так і думаў». Цеплавентылятар упарта не лез у кадр. А калі пасля доўгіх пакут у Яна атрымалася яго больш-менш увапхнуць і нават больш-менш падсвяціць, ноўтбук крэкнуў і памёр.

Вядома ж, менавіта ў гэты момант ляпнулі ўваходныя дзверы і пачуўся бацькаў голас:

— Барбара?

Маці не адказала — відаць, выскачыла ў краму. Ян баязліва кінуўся ў ложак і схаваўся пад коўдрай, але тата да яго нават не зазірнуў. Ян паляжаў трохі, але сорам быў мацнейшы за страх. Ян узняўся і пайшоў у гасцёўню.

Бацька з пахавальным тварам чытаў нешта ў тэлефоне.

Ян сеў насупраць, набраўся смеласці і прызнаўся:

— Не магу ўставіць яго ў кадр.

Бацька не адказаў, працягваючы метадычна прагортваць экран смартфона.

Ян дакрануўся да бацькавай рукі.

— Я кажу, не магу ўставіць яго ў кадр!

Бацька з намаганнем перавёў позірк на сына.

— Каго?

— Цеплавентылятар твой! Амаль атрымалася, але ноўт здох! Вентылятар, напэўна, паляцеў.

— А, — сказаў тата абыякава.

— Але я, у прынцыпе, разумею, як там павінна быць! — Ян спрабаваў казаць сур'ёзна і пераканаўча. — Давай я да тваіх маркетолагаў падыду і ўсё патлумачу! Можа, яны падкажуць што... Ці я нейкіх вашых патрабаванняў не ведаю.

Бацька не рэагаваў.

— Дык што, — Ян узняў голас, быццам размаўляў з глухім, — я з імі пагутару? З маркетолагамі?

Тата зноў зрабіў над сабою намаганне, наморшчыў лоб і спытаў:

— Навошта?

Ян страціў цярплівасць:

— Ты ж сам казаў: трэба рэкламную кампанію планаваць! Бюджэт зацвярджаць! Ты ж людзей напружыў...

— Які бюджэт? — у голасе бацькі чуліся стома і прыкрасць. — Якая кампанія? Ты што, рэальна думаеш, што я стану будаваць кампанію на роліках нейкіх тынэйджараў?

— Але ж ты казаў...

— Я матываваць цябе, ёлупня, хацеў! — адрэзаў бацька.

Ян адчуў, што ў яго стукае ў скронях.

— Я не ёлупень! Я грошы зарабіў! Ты ж сам... сто даляраў...

Тата пахітаў галавой. Цяпер голас быў проста стомлены:

— Ты б хоць у сваю адмінку рэкламнай сеткі зазірнуў, ці што... І ўвогуле! У нас тут бізнесменаў аднаго за адным саджаць пачалі... Можа, давядзецца з краіны з'язджаць. А ты са сваімі... мульцікамі!

Ян кінуўся ў свой пакой, схапіў тэлефон і ліхаманкава адкрыў асабісты кабінет у рэкламнай сетцы.

«Баланс $21,04. Апошні плацеж $0,00».

Увечары зайшла маці. Ян ляжаў на пасцелі, гледзячы ў столь — прыблізна гэтак жа, як тата гадзіну таму ўзіраўся ў тэлефон.

— Сынуля, — сказала маці, — можа, у панядзелак у школу пойдзеш?

— Пайду, — адказаў Ян роўным голасам.

— Вось і добра. А то кіснеш тут...

Маці пастаяла яшчэ трохі і сышла.

* * *

Чынгіз і Ліза заселі надоўга. Размова пайшла сур'ёзная і зусім нецікавая — прававая база, падаткі, кансультацыі са знаёмымі юрыстамі...

Гэля трохі пасядзела з імі, а потым паціху ўцякла ў свой пакой.

Дзядзька Чынгіз, вядома, упарты, але маці не здасца. Вось бы ён дапамог і справу, якой пагражаў следчы, закрылі без хабару! Тады можна было б...

— Ды ён не сабе! — гучна тлумачыла маці. — Ён мне ўсё расказаў. Ён проста заплаціць камусьці там і...

— Ліза! — усклікнуў Чынгіз. — Дзяўчынка мая, колькі табе гадоў? Ну колькі можна верыць усім без разбору?

— Ну не можа ён так нахабна хлусіць, седзячы ў мяне на кухні!

— І пасля гэтага ты хочаш, каб я адчапіўся ад вас з Гэляй? Ты яшчэ завучыху сваю ідзі пашкадуй, бо яна стамілася вельмі, пакуль скаргі на цябе пісала.

— Але яе таксама можна зразумець...

— Стоп! — сказаў Чынгіз. — Усё! Сціхні!

Геула пачула, як пакрыўджана засапла маці і як зацокаў мышкай Чынгіз.

* * *

Калі маці праз гадзіну зазірнула да Яна, ён ляжаў у той жа позе.

— Янчык! — сказала яна. — А ты ўрокі будзеш рабіць?

— Так, — безуважна адказаў Ян.

— Дык ты хоць даведайся якія, — уздыхнула маці.

І не сышла, пакуль Ян не ўстаў і не ўзяў у рукі тэлефон.

Ён гартаў «УКантакце» і млява думаў, у каго б даведацца, што адбываецца ў школе. Дамашкі як

такой ужо не было, але давалі нейкія заданні для падрыхтоўкі да іспытаў. Ян спыніўся на Жанне Кароціч, яна была анлайн. Напісаў у асабістыя: «Здароўкі! Што на наст. тыдзень задалі?»

Жанка чамусьці адразу ператэлефанавала.

— Прывітанне, Ян!

— Чаму тэлефануеш? — няветліва адказаў ён. — Дыктаваць мне будзеш? Напісаць у асабістыя цяжка?

— Я напішу, — заспяшалася Жанна, — не хвалюйся! Але ў мяне да цябе просьба! Ты можаш мяне зняць, як у цябе на юцюбе?

— Чаго?!

— Ну, — слухаўка зацурчала ялеем, — можаш зняць відэа, дзе я буду такая ж прыгожая, як у тым роліку... Ну ў якім тая дзяўчына... якая сэксі... яна яшчэ спіць у канцы!

Ян ледзьве ўцяміў, што размова пра ролік з Гэляй — праз які канал заблакавалі.

Кароціч зразумела ягонае маўчанне як знак згоды і падбадзёрылася.

— Ты ж можаш! Ну так, я не ідэальная мадэль... — какетліва сказала яна.

Ян са здзіўленнем зразумеў, што яго ў гэтым жыцці яшчэ можа нешта насмяшыць. Жанка была не толькі «не ідэальная», яна ўвогуле... Калі яна прыйшла да іх у сёмым класе, нават класная цэлую чвэрць не магла вывучыць яе прозвішча, бо тады Жанка ўдавала з сябе спявачку Нюшу. Але рабіла гэта настолькі няўдала і выглядала пры гэтым так недарэчна, што выклікала прыступы смеху ўва ўсёй школы. Паводзінамі яна болей нагадвала Нюшу са «Смяшарыкаў». З таго часу Жанка змяніла некалькі аблíччаў, але для аднакласнікаў засталася Нюшай.

Не дачакаўшыся камплімента, што, маўляў, мадэль яна ідэальная, Жанка працягвала:

— ...Але ж тая дзяўчына... я на паўзе яе разглядала. Таксама нічога такога! Гэта ты так файна зняў! І мантаж зрабіў... І... я не ведаю, як у цябе гэта атрымалася! Можаш і мне гэтак? А то я з хлопцам у сеціве перапісваюся, ён просіць фотку. Але я лепей відэа дашлю... калі ты здымеш!

Ян здушана адказаў:

— Пакуль.

Кінуў слухаўку і пачаў рагатаць. Як можна параўноўваць жывую Геулу і штучную Нюшу?

Маці спалохана зазірнула, але ён толькі замахаў на яе рукамі. Маці знікла. Ян адчуў, што жыццё стала наладжвацца. Ён нават напісаў «Дзякі!» Жанцы, якая даслала спіс заданняў.

Яна адказала шэрагам смайлікаў. Ян не стаў іх разглядаць.

Нечакана для сябе ён разгарнуў матэматыку, зверыўся з тэлефонам і пачаў чытаць параграф.

* * *

«Трэба рэчы да пераезду разабраць», — падумала Геула і адчыніла шафу.

На двары па бетонавай палі бухала чыгунная баба.

Гэлі на галаву зваліўся пакет.

А з пакета выпаў велізарны «сіямскі» швэдар.

«Трэба ж яго памыць са змякчальнікам!» — згадала Гэля, шпурнула швэдар у бок ваннага пакоя і ў той жа момант зразумела, што болей ён ніколі ёй не спатрэбіцца.

Раптам Гэлі зрабілася да слёз сумна. З гэтым швэдрам было звязана столькі ўсяго смешнага... Як яна яго вязала — гэта наогул асобная гісторыя. Гэля прыгадала свой запыт на адным з форумаў — «як звязаць швэдар з дзвюма гарлавінамі» — і тое, як яе ледзь не забанілі, падумаўшы, што яна злосны троль.

Гэля засапла, зусім гэтак жа, як на кухні цяпер сапла яе маці, акуратна падняла швэдар з падлогі, запхнула яго ў пакет і зноў схавала на верхняй паліцы шафы.

* * *

Ян з задавальненнем закрыў беларускую і пацягнуўся па фізіку, паралельна правяраючы ў тэлефоне, што задалі. З фізікай было няпроста. У Яна ў журнале стаяла самотная сямёрка, а фізік — дзядзька прынцыповы, яму за чвэрць трэба як мінімум тры адзнакі. Самы просты спосаб вырашыць праблему — зрабіць даклад. Ян разгарнуў падручнік.

На законе сусветнага прыцягнення.

Дакладней, на фотаздымку Геулы, які незразумелым чынам трапіў паміж старонак падручніка па фізіцы. Ян са здзіўленнем пакруціў фотку ў руках. Яна была старая. Здаецца, з тых часоў, калі яны пазнаёміліся ў «Калекцыі прыгод». Яны тады выпадкова апынуліся ў адной камандзе, ім трэба было прыдумаць і зняць казку. Ян і Гэля ўдваіх усё зрабілі. Ян толькі пачынаў казаць, што трэба зняць, а Геула ўжо расстаўляла рэквізіт і акцёраў на пляцоўцы.

Ён злавіў сябе на тым, што ўсміхаецца, раззлаваўся і запхнуў фотку ў стол. Падручнік загарнуў,

узяў тэлефон, загугліў: «Фізіка рэферат дзявяты клас». Адкрыў першую ж спасылку і пачаў чытаць.

* * *

Гэля не разумела, чаму яе стол дагэтуль не абваліўся. На ім можна было весці археалагічныя раскопкі, абавязкова знайшліся б прапісі за першы клас ці нават малюнкі часоў дзіцячага садка.

Гэля выцягнула стосік кружэлак, якія даўно трэба было выкінуць. Хто ж сёння інфу на іх захоўвае? Зверху ляжала кружэлка з ярка-жоўтай налепкай. На ёй рукой Яна было напісана: «Сіямцы-1. Мегахіт».

Гэта быў іхні самы першы ролік.

«Гэта нельга выкідаць», — падумала Гэля.

Рука ў яе тарганулася ў бок дыскавода.

«Але і пераглядаць гэта цяпер нельга! — падумала Гэля. — Пайду лепей касметыку разбяру!»

* * *

Бацькі на кухні напаўголаса пра нешта гутарылі.

Калі ўвайшоў Ян, яны адразу змоўклі — пэўная прыкмета, што размова ішла пра сына. Але Ян вырашыў не дурыць сабе галаву.

— Слухай, тата, — сказаў ён, — я даклад па фізіцы раблю і не магу разабрацца з тэрмаядзернай рэакцыяй.

— А што там разбірацца? — пацепнуў плячыма бацька. — Два ядры злучаюцца, лішкі энергіі вылучаюцца, паўкраіны ў руінах...

— Пачакай! — Ян пахітаў галавой. — Са звычайнай ядзернай рэакцыяй як? Там ядро падзяляецца на кавалкі — і энергія вылучаецца. Значыць, калі кавалкі назад сабраць, энергія павінна паглынацца.

— Не! — бацька пахітаў галавой гэтак жа, як сын. — Гэта ад ядра залежыць, ад ягонай энергетычнай структуры. Часам энергетычна больш выгадны распад, часам — сінтэз.

Зразумеўшы па твары сына, што ўсё гэта гучыць непераканаўча, тата разахвоціўся.

— Гэта як у людзей! Бывае, размаўляеш з чалавекам, а потым ён сыходзіць — і ў цябе проста фізічная палёгка. Значыць, сістэма распалася — энергія вылучылася.

Ян кіўнуў. Гэта ён разумеў і без татавых прыкладаў.

— А бывае, — працягваў бацька, — наадварот. Калі разам з чалавекам працуеш — і ў цябе, і ў яго сілы не падвойваюцца, а... ну не ведаю... удзесяцяраюцца! Во як у вас з Геул...

Тут тата чамусьці не дагаварыў, войкнуў і паглядзеў на маці. Твар у яе быў нязвыкла сярдзіты.

— Карацей, — скончыў бацька, — калі людзі разам, энергія вылучаецца. А калі яны разыходзяцца... Авой!

Тата пацёр галёнку і незадаволена спытаў:

— Барбара! Ты што, зусім ужо?!

— Я зразумеў, — буркнуў Ян і пайшоў да сябе.

Вырашыў усё ж такі пачытаць падручнік, разгарнуў яго — і са здзіўленнем убачыў, што ніякіх ядзерных рэакцый там няма. Пагугліў. Ну так, гэта ў расійскай школьнай праграме.

* * *

У ванным пакоі Гэля натрапіла на цюбік з аранжавай фарбай. Неяк яны з Янам пафарбавалі сабе грыўкі — атрымалася проста чума як прыгожа. І відэа было файнае, яны апавядалі пра тое, як важна заставацца самім сабою, а не капіяваць іншых. Пры гэтым казаў толькі Ян, а Гэля ўвесь час падтаквала.

Гэля раздражнёна кінула фарбу ў пакет для смецця.

* * *

Ян намагаўся не думаць пра Геулу, але яна ўперта лезла ў галаву. Аўтаматычна Ян уключыў ноўтбук і, пачуўшы звыклы шум вентылятара, млява ўзрадаваўся: ну хоць ноўт не давядзецца рамантаваць.

Працягваючы дзейнічаць бяздумна, адкрыў браўзер, клікнуў па закладцы «Сіямцюб».

Нечакана канал адкрыўся як нічога ніякага. Ян праверыў пошту, якую не правяраў зранку, — і сапраўды, яшчэ абедам прыйшло паведамленне, што «Сіямцюб» разблакаваны. І першым жа відэа, якое аўтаматычна запусцілася, аказаўся той самы ролік, дзе Геула была «сэксі».

* * *

— Мама, я пагуляю!

— Ідзі, ідзі, — адказаў Чынгіз, — хоць ты мазгі праветры. А ты, Ліза, сядзі і чытай свае правы!

Гэля выйшла.

На вуліцы, проста ў іхнім двары двое хлопцаў запускалі дрон.

Гэля заглядзелася. Хлопцы былі засяроджаныя, сыпалі незразумелымі словамі і ледзь не аблізвалі свайго механічнага сябра. І хоць «сябар» выглядаў як жахлівы жалезны павук, а павукоў Гэля вельмі не любіла, яна загарэлася энтузіязмам і падышла бліжэй.

Адзін з хлопцаў усміхнууся, паляпаў дрон па «лапцы» і ганарліва сказаў:

— Глядзі заўтра свой двор на «Мінскдрондвор». Мы штодня выкладаем. У нас ёсць такія фоткі — самім зайздросна! І відэа крутое з Верхняга горада, і...

— Ты давай не адрывайся, — абсек яго напарнік.

— «Мінскдрондвор», — па літарах прадыктаваў хлопец, — «і» беларускае. Ды мы адразу пасля «Мінскдрон» высвецімся...

Гэля запусціла *YouTube*, але пошук запусціць не паспела, бо браўзер тэлефона адкрыў ёй «сіямцаў».

«Разблакавалі!» — узрадавалася Гэля.

А потым тэлефон загрузіў апошняе відэа канала, і думаць Гэля перастала. А хлопец побач нават дыхаць перастаў.

— Ваў, — сказаў хлопец. — Знаёмая твая?

— Сястра, — адказала Гэля, кепска разумеючы, што кажа. — Сіямская.

Хлопец рагатнуў:

— Зразумела. А хлопец у яе ёсць? Зрэшты, не мае значэння. Тэлефончык дасі?

Геула не адказала. Яна запусціла ролік нанова.

— Як хочаш, — не пакрыўдзіўся хлопец. — Сам знайду. Як канал называецца? Ага...

І ён адышоў убок, убіваючы ў пошукавік *YouTube* «Сіямцюб».

* * *

Ян быццам трапіў пад уладу супергіпнатызёра: ролікі «Сіямцюба» запускаліся нон-стоп, а ён мог толькі сядзець і як зачараваны глядзець на экран.

І яшчэ адна дзіўная рэч: кліпы мусілі круціцца па коле, але ролік, у якім Геула спала, паўтараўся ледзь не праз адзін. Пры гэтым Ян кожны раз бачыў апошні каментар: «Ну, дзяцюк, ты даеш... Вы даяце!»

— Янчык! — голас маці над самым вухам прымусіў яго здрыгануцца і сутаргава націснуць на прабел. Відэа замерла. — Прабач, — прамовіла маці, — у цябе дзверы былі адчыненыя, я цябе паклікала, але ты не чуў... Я што хачу сказаць...

Яна села на краёчак канапы і ўзялася бязмэтна разгладжваць ражок коўдры.

— Тое, што тата сказаў... ну пра тое, што людзям часам лепей паасобку, а часам разам... гэта праўда! Ты прыслухайся да сябе! І ўвогуле... можа, гэта лёс? Часам ён дае нам знакі.

Ян, які ўвесь гэты час пільна ўзіраўся ў экран, перапыніў яе:

— Мама, я зразумеў. Сапраўды зразумеў! І пра лёс, і пра знакі! — ён павярнуўся да маці з пераможнай усмешкай. — І я ўсё прыдумаў!

Мінск з надзеяй зашамацеў дрэвамі.

* * *

— Спадарыня, на кані пакатацца не жадаеце?

Гэля сцепанулася і зразумела, што яе занесла ў лясок паміж Чырвоным Борам і Сухарава.

«Трэба навучыцца сябе кантраляваць, — сумна падумала яна, — наступным разам прачнуся ў Літве. Мяне будуць дапытваць, як я прамінула дзяржаўную мяжу, а мне не будзе чаго адказаць».

— Дык як? — спытала вершніца.

Геула пагладзіла каня па меланхалічнай храпе і адмовілася. З цяжкасцю знайшла лаўку, не акупаваную матулямі з дзецьмі, і паспрабавала думаць.

«Трэба проста ўцяміць, чаго ад мяне хоча лёс. Ён напэўна ж дае мне нейкія знакі».

Гэля ў думках прыгадала ўсё, што сёння з ёй адбывалася. Зразумела, што цэлы дзень усё круцілася вакол блога. Прыслухалася. Наўкол панавала цішыня. У горадзе такой цішыні наогул не бывае. Геула патрэсла галавой і працягнула думаць.

«Неабходна тэрмінова рабіць "Сталічную штучку", — пастанавіла яна. — Відаць, мне нельга сядзець без справы. Заўтра паеду ў Маладзечна!»

І раптам зусім побач з Геулай у ліхтары трэснула лямпачка. Гэля здрыганулася. Недзе заплакала дзіця. Засігналілі машыны. Працокалі па сцежцы капыты пракатнага каня.

Павеў ветру сарваў з клёна зялёны ліст і кінуў яго на ліхтарны слуп. Ліст павіс на слупе, нібы яркі фэйспалм.

* * *

Маці чытала каля таршэра, калі ў гасцёўню ўвараваўся Ян. Вочы ягоныя, здавалася, гарэлі ў паўзмроку.

— Ты мела рацыю! — сказаў ён так энергічна, што маці зашыкала.

— Ціха! Бацька спіць ужо, у яго канец тыдня быў цяжкі.

— Ты мела рацыю, — паўтарыў Ян цішэй. — І пра распад... пра тое, што трэба расставацца!

— Я не пра тое казала... — паспрабавала паправіць маці, але Ян не слухаў.

Ходзячы па пакоі, ён прамаўляў:

— І пра знакі таксама! Ты казала, а я на манітор глядзеў... А там — рэклама старога фільма. «Раён нумар дзевяць»! Бачыла?

Маці пакруціла галавой.

— Неістотна! Мегаблокбастар! А спачатку ж двое фацэтаў у ПАР* знялі файную кароткаметражку. Я павінен сваё кіно зняць! Без Гэлі! Без анікога! І не на замову таты... пагатоў і замовы ніякай не было... Карацей! Я напішу сцэнарый!

— Які сцэнарый? — уздыхнула маці.

— Забойны! Я ўжо напампаваў падручнікаў па сцэнарным майстэрстве... Нават чытаць пачаў... Але там каламуць! Я і так напішу! Як тыя фацэты, што «Раён нумар дзевяць» знялі. Яны спачатку кароткаметражку замуцілі, а ўжо потым жонка Джэксана... які «Уладар пярсцёнкаў»! Вось ягоная жонка кароткаметражку ўбачыла і бабосаў ім дала! І я гэтак зраблю!

— Што менавіта? — на гэты момант маці канчаткова згубіла сутнасць аповеду.

— Здыму сваё кіно! Сам, разумееш?

— Але тыя людзі, — удакладніла маці, — якія спачатку кароткаметражку знялі, іх жа было двое?

* Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка.

— Ат, якая розніца! — махнуў рукой Ян. — Іх двое, я адзін. У падручніках адна бязглуздзіца! Я і так усё без іх ведаю! Я прыдумаю во такую гісторыю! Мяне Спілберг пакліча, пабачыш! І без усялякіх Геул! І тата даведаецца...

Ян убачыў, што маці з сумневам хітае галавой, і абурыўся:

— Ды ну цябе! Не каб падтрымаць!

— Я падтрымліваю, Янчык, але...

Ян выскачыў з гасцёўні. Праз секунду маці пачула ляпанне дзверцаў лядоўні і бразганне накрывак рондаляў, устала і пайшла разаграваць вячэру.

* * *

Электрычка была цудоўная. Новая, прыгожая і пустая.

Геула села, выцягнула ногі, падключыла тэлефон да разеткі, каб зэканоміць батарэю, і ўрубіла ў навушнікі *One Republic*.

За акном было вельмі пазітыўна — усё, што не ярка-зялёнае, шыкоўна квітнела. Агароджы пафарбаваныя, зімовае смецце з узбочын даўно прыбранае, агародчыкі ў цюльпанах, бульба пасаджаная, буслы пазіруюць на палетках, толькі паспявай фатаграфаваць.

У Геулы ўзнік дысананс карцінкі з музыкай, і яна знайшла ў плэйлісце N.R.M.

*Каб любіць Беларусь, нашу мілую маму,*
*Трэба ў розных краях пабываць.*
*Зразумееш тады — пад тваімі нагамі*
*Тры сланы нерухома стаяць.*

*Хэй, ла-ла-ла-лай,*
*Ты не чакай, сюрпрызаў не будзе.*
*Хэй, ла-ла-ла-лай...**

Маладзечна аказаўся вельмі прыемным горадам. Проста ад чыгункі пешаходная вуліца, паветра духмянае, людзі не бягуць, а ідуць усе такія разняволеныя. Да парку пешшу пятнаццаць хвілін, у парку хараство.

Геула злавіла сябе на тым, што ёй хочацца скакаць, быццам яна першакласніца перад днём народзінаў. Яна села на лаўку над сажалкай і стала марыць пра тое, што будзе тут жыць, будзе бегаць у гэтым цудоўным парку штораніцы, сядзе на дыету, схуднее на пяць кіло, стане прыгажуняй і абавязкова сустрэне сваё каханне.

— Можна мне сесці побач?

Сімпатычны. Трохі падобны да Кастуся, але ніжэйшы. Затое шырэйшы ў плячах.

Гэля ўсміхнулася, хлопец узрадавана сеў.

— Кавы? — спытаў ён.

Так, у Маладзечне, як выявілася, была кава. Праўда, пірог давялося выкінуць, есці яго было немагчыма, затое кава была сапраўдная. Слава стараўся як мог — апавядаў Геуле мясцовыя байкі, тлумачыў, што «тут крута ў школе, бо адзнакі не шкадуюць», але «паступаць усё адно ў Мінск», запрасіў да сябе дахаты «во зараз жа», атрымаў рашучую адмову, аднак не пакрыўдзіўся, а паабяцаў, што, калі яна прыедзе наступным разам, пазнаёміць яе з сябрамі і сястрой.

* Словы з песні Лявона Вольскага «Тры чарапахі».

Геула ціха млела. Ей падабаўся Слава, падабаўся гэты спакойны гарадок, падабалася тое, што на дварэ сонца. Яна ўжо ў думках пачала абіраць дом, у якім хацела б жыць. Бадай што вунь той, высокі. Каб з вокнаў від на парк.

Слава праводзіў Гэлю да вакзала.

— Ты так і не сказала, як цябе завуць, — сказаў ён.

Геула агледзелася. Гэтае месца ідэальна пасавала, каб пачаць усё з нуля.

— Галя, — сказала яна, — поўнае імя Галіна. Галіна Вегірэйка.

— Дзе цябе шукаць? — спытаў Слава і палез па тэлефон.

— У інстаграме, — адказала Гэля. — Але калі я з'еду, добра?

Слава здзівіўся, але тэлефон схаваў.

У вагоне Гэля перадусім палезла мяняць імя ў профілі.

* * *

— Мама, я была ў Маладзечне! — паведаміла Геула.

— Угу, — сказала маці.

— Мама, там файна! Там парк! Табе спадабаецца!

— Угу...

— Мама, я нават прыгледзела дом. Я скажу табе адрас, там так прыгожа! У нас вокны будуць выходзіць на высачэзныя дрэвы.

— Угу...

— Мама, напэўна, гэта лёс! І ўсе гэтыя непрыемнасці былі дзеля таго, каб мы туды пераехалі! Я думаю, ты неўзабаве знойдзеш там працу...

— Угу...

Апошняе маміна «ўгу» было значна маркотнейшым за папярэднія.

— Мама, і я хачу змяніць імя, — сказала Геула, — калі ўжо мы пачынаем новае жыццё, я хачу, каб Геула памерла, я хачу... Мама! Ма, ты чаго?

Ліза ў гэты момант мела такі выгляд, што Гэля не на жарт спалохалася.

— Не! — сказала Ліза.

— Але...

Геула якраз збіралася сказаць, што ёй надакучыла тлумачыць новым знаёмым, як яе завуць, дыктуючы імя па літарах, але не паспела. Маці насоўвалася на яе жахлівай раскудлачанай пачварай з белымі вуснамі.

— Ніколі, — хрыплым шэптам сказала маці, — не смей. Нават казаць. Такое.

— Якое? — разгубілася Гэля.

— Вунь тое, што ты сказала. Што Геула пам... пам...

Вымавіць слова «памерла» яна так і не здолела.

Гэля ніколі не бачыла маці такой. Мама ніколі не ўзнімала голас і калі ўжо плакала, дык наўзрыд, як дзіця. А вось гэтая жанчына, з вачыма, поўнымі роспачы, і скрыўленымі вуснамі, была ёй незнаёмая.

— Ты чаго? — толькі і спытала Геула.

Маці спрабавала супакоіцца. Было бачна, як ёй цяжка. Як дрыжаць рукі, як мітусліва яна спрабуе ўздыхнуць, каб размаўляць нармальна, як адкашліваецца, каб голас стаў падобны да чалавечага.

— Гэтае імя — тваё жыццё, — сказала яна.

— Чаго? — здзівілася Гэля.

— Баба Ада дала табе яго.

— Гэта я ведаю, — сказала Гэля, — я вельмі люблю яе і памятаю, і ўсё такое, але...

— Ніякіх «але», — абарвала яе маці, — ты памірала...

— Мама, я ведаю, ты казала...

— Ты не ведаеш! — перапыніла яе маці. — Ты не ведаеш, як гэта — чакаць, што тваё дзіця памрэ. І больш за ўсё на свеце я хачу, каб ты ніколі гэтага не зведала.

— Мама, калі ласка, не трэба...

Але Лізу ўжо было не спыніць.

— Геула, мне амаль чатыры тыдні казалі, што ты памрэш з дня на дзень. Дваццаць шэсць дзён. Штораніцы. Казалі, што надзеі няма. Што лепей не будзе. Казалі, што я маладая і здаровая, што ў мяне яшчэ будуць дзеці...

— Мама, не трэба...

— Не, Геула, зараз слухай і маўчы. Толькі Ада верыла. Яна брала мяне за руку, і мне рабілася лягчэй. Яна апавядала, што калі ты вырасцеш, то будзеш прыгажуняй. У цябе, казала яна, будуць цёмныя валасы, і яны будуць кучаравіцца ад вільготнага ветру. Яна казала, што...

— Матулечка, калі ласка...

Геуле невыносна было глядзець на такую маці. Але Ліза толькі адмахнулася.

— А потым, калі надзеі ўжо не было зусім, яна падышла да мяне і сказала, што дала табе імя. І што ты будзеш жыць, пакуль цябе завуць Геула.

— Мама! — ахнула Гэля.

— Удзень у табе нешта перашчоўкнула. Неанатолагі кажуць, што так бывае. Дзіця, асабліва недано-

шанае, можа ляжаць, ляжаць паміж жыццём і смерцю. А потым раз... і вырашыць, што яно будзе жыць.

Ліза ледзь усміхнулася і зрабілася падобнай да сябе. Да звычайнай, спакойнай, усмешлівай маці.

— Мы яшчэ месяц праляжалі з табою ў шпіталі. Калі ты першы раз ела сама, медсёстры пляскалі табе ў ладкі. Я дрэнна памятаю той час, гэта было нейкае бязмежнае шчасце... Жывое дзіця. Маё жывое дзіця... Што, тэлефануюць?

— Не, проста тэрмінова трэба нешта выправіць, — сказала Геула, з цяжкасцю трапляючы па кнопках дрыжачымі пальцамі.

Інстаграм. Рэдагаваць. Уф...

* * *

Ян усё ж такі прагартаў пару падручнікаў па сцэнарным майстэрстве. Сёе-тое (усялякія «аркі», «біты» ды іншыя «перыпетыі») ён нават не спрабаваў запомніць. Але сутнасць зразумеў. Патрэбны канфлікт. Гэта значыць, герой нечага хоча, а яму не даюць. Не проста хоча, а яму ну проста кроў з носа трэба. Пачаў пераглядаць любімыя фільмы, каб праверыць іх на канфлікт.

«Хардкор» давялося пераглядаць ледзь не па кадры. Гэтае кіно навучыла яго большаму, чым усе падручнікі.

Ян усе выхадныя знаходзіўся пад уражаннем, яму вельмі хацелася прыдумаць такі ж канфлікт, як у «Хардкоры». Каб пытанне жыцця і смерці. Каб не было часу на ўсялякія бла-бла-бла. Або ты зараз жа выцягнеш кардыястымулятар вунь з таго фацэта, або памрэш.

Па інэрцыі перагледзеў яшчэ пару фільмаў. А за адным махам і стары чорна-белы «Гамлет» (на яго актыўна спасылаўся аўтар аднаго з падручнікаў). «Гамлет» нечакана торкнуў.

У панядзелак пайшоў у школу, але думаць працягваў пра сваё. Настаўнікі яго, на шчасце, асабліва не тузалі, толькі на літаратуры Рэгіна Сяргееўна вырашыла патрэціраваць:

— Марыніч! Ці не падзелішся з намі сваімі думкамі па тэме ўрока?

Ян заміргаў, спрабуючы вярнуцца да рэальнасці.

— А што за тэма?

Клас грымнуў. Русічка пагрукала ўказкай па крэсле і адказала:

— Ды бог з ёй, з тэмай. Апавядзі пра кнігу, якую цяпер чытаеш. Ты ж нешта цяпер чытаеш?

— Ага, — кіўнуў Ян. — «Гамлета».

Настаўніца нават пытанне не здолела задаць, але Ян прачытаў яго па твары.

— Не-не, я не здзекуюся! — ён прытуліў руку да грудзей дзеля пераканаўчасці. — Рэальна чытаў! І кіно старое паглядзеў! Крутая штука! У Шэкспіра ж там канфлікт на канфлікце! І ўсе такія... правільныя! Не паміж добрым і дрэнным, а паміж двума дрэннымі!..

Яна панесла. Ён нават засмуціўся, калі Рэгіна яго спыніла:

— Дастаткова... Дзесяць. Во бачыш, Ян, можаш, калі захочаш!

Выраз твару ў яе пры гэтым быў дзіўны. Ян злавіў на сабе некалькі зацікаўленых позіркаў. У тым ліку Жанны. «Здаецца, — рассеянна падумаў Ян, — я нешта ёй абяцаў». Але адразу забыўся на гэта.

Разенкранц і Гільдэнстэрн натхнілі яго на адну ідэю, якая магла стаць суперскай.

* * *

— А што гэта ты малюеш? — пачуўся над вухам Яна голас Жанны.

— Схему, — адказаў Ян, не ўдаючыся ў дэталі.

— Якую?

Ён не адказаў. Да канца перапынку заставалася тры хвіліны, а потым — фізра, там асабліва не памалюеш. А Яну вельмі хацелася дамаляваць схему сюжэта, пакуль не забыўся. Двое сяброў, адзін з якіх памірае, а другі цягне яго на сабе.

— Ну не хочаш казаць — не трэба, — пацепнула плячыма Жанна. — А калі фотасесію... дакладней, відэасесію будзем рабіць?

Цяпер Ян згадаў, што абяцаў Кароціч. Нават не абяцаў, а...

Зрэшты, на разборкі часу не было. Каб адчапіцца, ён сказаў:

— Я не магу! У мяне канал заблакаваны!

— Дык не абавязкова ж на тваім канале! — Жанна не збіралася адступаць. — Ты проста здымі і мне аддай. А я ў сябе выкладу.

Ян пакутліва намагаўся не згубіць думку і прыдумаць адмазку для Жанны.

— А ўвогуле «Сіямцюб», — працягвала яна, — круты! І гэтая ідэя пра сіямскіх брата і сястру файная...

І тут у яго галаве нешта выбухнула.

— Кароціч! — сказаў ён з пачуццём. — Я цябе абажаю! І скажы Пятровічу, што ў мяне... я нагу пацягнуў!

Ян скамячыў схему, шпурнуў у сметніцу і кінуўся сходамі ўніз. Новую схему неабходна было скласці ў ціхім бязлюдным месцы. Напрыклад, дома.

* * *

Лізе зрабілася дрэнна. Яна бадзёрылася, казала: «Нічога, нічога, я проста паляжу...», але Гэля бачыла — нешта не так.

Твар у маці стаў шэры, а калі ёй спатрэбілася ўстаць, паднялася яна з цяжкасцю і потым ішла, хістаючыся, быццам падлога знікала з-пад ног.

Геула патэлефанавала Альбіне. Тая прыбегла праз паўгадзіны.

Маці, вядома ж, абурылася, што Гэля турбуе людзей праз глупствы, аднак Аля адразу ацаніла сітуацыю і выклікала хуткую.

— Можам пакуль без шпіталізацыі, — сказаў лекар, — стрэс, ціск. Болей спаць, меней нервавацца.

Пасля ўколу Ліза заснула, а цётка Аля і Геула сядзелі на кухні і пілі гарбату.

Альбіна дала заспакаяльнае і Геуле і паведаміла, што застанецца ў іх начаваць. Гэля не спрачалася. Заставацца адной з хворай маці ёй было страшна.

— Ты ведала пра маё імя? — спытала яна Альбіну.

— Ведала, — сказала яна, — я казала Лізе, што трэба табе расказаць. Але яна не любіць успамінаць.

— Я зразумела, — прамовіла Гэля, — але я хацела б ведаць пра гэта раней.

— Гэта не проста імя, — сказала Альбіна, — гэта вельмі магутнае імя.

— Я ведала, што ў перакладзе з іўрыта «Геула» — «выратаванне», але я ніколі не думала, што...

Я думала, што Ада назвала мяне ў гонар кагосьці. Я заўсёды лічыла яе роднай бабуляй... Я ведала, што яна не родная, але...

— Мы ўсе яе любілі, — усміхнулася Альбіна, — у яе руках сціхала любое немаўля, уся радзільня на яе малілася. У Ады ўсе дзеці елі, спалі і папраўляліся. Яна калі ў палату заходзіла — быццам вядро спакою разлівала. Грудзі расцэдзіць, рукой па шве правядзе, быццам ужо і не баліць. Сядзіш уся ў слязах і соплях, Ада паўз цябе пройдзе, праз хвіліну думаеш, чаго я тут надрываюся? Добра ж усё! Я неяк спытала ў яе, колькі дзяцей прайшло праз яе рукі.

— А яна?

— Сказала нешта на ідыш. Патлумачыла, што любові хопіць на ўсіх.

Гэля шмат ведала пра бабулю Аду, маці апавядала.

У яе была вялікая сям'я, але падчас вайны выжыла толькі яна. Усіх забілі, а Аду схаваў хлопец-сусед. Закаханы быў вельмі. Бацькі, калі даведаліся, што ён схаваў габрэйку, выгналі з хаты абаіх. Яны збеглі ў партызаны, хлопца неўзабаве забілі, а Ада засталася. Яе бацька быў лекар, яна шмат ведала і ўмела, таму была нарасхват — у яе была вельмі лёгкая рука, раны быццам самі загойваліся. Але сама яна моцна застудзілася ў лесе і сабе дапамагчы не здолела, таму ўласных дзяцей у яе ніколі не было і быць не магло.

Вучыцца на акушэрку Ада пайшла адразу, як толькі вызвалілі Мінск. Нейкі яна дала сабе зарок. Маўляў, павінна дапамагчы нарадзіцца столькім людзям, колькі памерла ў яе на руках. І дапамагла. Працавала да апошняга дня. У «сямёрцы» адпраца-

вала сорак гадоў — з дня заснавання. Спачатку акушэркай, потым сама захацела перайсці медсястрой у аддзяленне нованароджаных. У яе не было родных, не было сям'і. Але было шмат удзячных мацярок і дзяцей. Многія, як і Геула, называлі яе баба Ада. На могілках у яе амаль заўсёды жывыя кветкі.

— Ліза ляжала ў асобнай палаце, — расказвала Альбіна, — яна ж была без цябе, яе, каб не траўміраваць выглядам дзяцей, перавялі ад усіх. Але яна заўсёды на кармленне прыходзіла да мяне. Ада прывозіла дзяцей, Ліза прыходзіла разам з ёю. Ліза казала, што ёй лепей, калі яна бачыць немаўлят. А ў мяне была процьма швоў, сядзець нельга, гемаглабін ніжэй за дзевяноста, я ўстаць не магла — хісталася. Дык Ліза Кастусіка і мыла, і слупком насіла...

Альбіна перапынілася.

— Твая маці не сказала нам, што ты... карацей, яна сказала, што ў дзіцяці жаўтушка. І што яна ходзіць карміць цябе сама. Яна ў цябе ўвогуле цудоўная.

Альбіна надоўга замаўчала, утаропіўшыся ў акно.

— Цётка Аля, можна я табе яшчэ адно пытанне задам? — сказала Геула.

Альбіна кіўнула.

— Ты ведаеш, хто мой бацька?

Альбіна сцепанулася.

— Не, — ціха прамовіла яна.

— А калі б ведала, сказала б? — спытала Гэля.

— Не, — шчыра адказала Альбіна.

* * *

Схему Ян так і не склаў. Прыбег дахаты і кінуўся да ноўта. Адразу загрузіў *Word* і адкрыў шаблон для

напісання сцэнарыяў. Напярэдадні ён ужо спрабаваў у ім працаваць, і прынцып нават падабаўся — ніякіх табе апісанняў прыроды і ўнутраных маналогаў, суцэльны экшн, — але ніводная ідэя не гарэла, таму працэс не ішоў.

Затое цяпер словы быццам самі паліліся, Ян ледзь паспяваў запісваць.

Ачуўся ад паху кавы.

Дакладней, ён ужо хвілін пятнаццаць не пісаў, а сядзеў, утаропіўшыся ў экран, — героі трапілі ў такі тупік, што незразумела было, як іх адтуль выцягваць. А тут яшчэ кава.

І бутэрброды на талерцы.

І маці, якая прынесла ўсё гэта, але чамусьці не сышла, а ціхенька сядзела на тахце.

Ян узяўся за бутэрброды. Выявілася, што ён паспеў згаладацца. Скасавурыўся на гадзіннік у куце экрана — уга, палова на адзінаццатую!

— А што далей будзе, — спытала маці, — ты ўжо прыдумаў?

— Не, — з прыкрасцю адказаў Ян. — Трэба было, напэўна, усё ж такі план скласці, як у кнігах раяць.

— А ты мне раскажы, — папрасіла маці. — Раптам нешта ў галаву прыйдзе.

— Ну там такая гісторыя, — пачаў Ян, сёрбаючы каву. — Жывуць два браты, сіямскія блізняты. Яны адзін аднаму абрыдлі як горкі перац, але аперацыю па раздзяленні зрабіць не могуць. Грошай няма. І ўрэшце яны знаходзяць грошы і едуць да хірурга. Але аднаго брата, Германа, выпадкова раняць! Атручанай стралой! І другі разумее, што трэба ратаваць брата, бо атрута трапіць і ў яго!..

Ян расказваў, усё болей захапляючыся. Гісторыя яму па-ранейшаму падабалася, асабліва моманты, калі Герман ачуньваў і спрабаваў дапамагчы брату.

— І во цяпер яны ляжаць у калодзежы... — уздыхнуў Ян. — І я не ведаю, як яны адтуль выберуцца.

— Але ж ты ведаеш, чым усё скончыцца? — спытала маці.

— Вядома ж! Герман выжыве... хоць глядач будзе думаць, што ён памёр... Сіямцаў падзеляць... Яны зразумеюць, што ўсё адно будуць жыць побач. Таму што... ну...

— Таму што яны самыя блізкія ў свеце людзі, — ціха сказала маці.

— Так, кшталту таго.

— А ты не хочаш іх зрабіць не братамі, а братам і сястрой?

Ян задумаўся.

— Я там хацеў зрабіць любоўны трохкутнік. Быццам яны кахаюць адну дзяўчыну... Але, ведаеш, калі брат і сястра — нават круцей! У брата будзе дзяўчына, у сястры — хлопец, і яны будуць блытацца пад нагамі... Ці не! Дапамагаць! Во хто іх з калодзежа... Дзякі, ма!

Ян зноў кінуўся да клавіятуры.

— Ты ж, здаецца, збіраўся план скласці, — нагадала маці, устаючы.

— Ай! — адказаў Ян.

— Добра, апошняе пытанне: што будзем з тваім днём народзінаў рабіць?

— Ма! — Ян паспешліва гартаў файл, выпраўляючы аднаго брата на сястру. — Яшчэ месяц! Паспеем прыдумаць!

— А вы з Гэляй не будзеце аб'ядноўваць?

Ян секунду падумаў над мамінай прапановай. У іх з Геулай розніца ва ўзросце трошкі меней за месяц, яны звычайна ездзілі ў чэрвені ў «Калекцыю», адзначалі разам, было весела... Але тут ён ачуўся і выгукнуў:

— Ма! Усё! Забудзься! Няма ніякай Гэлі! Я забыўся на яе і табе раю! Халера...

Ён замёр перад экранам, наморшчыўшы лоб.

— Не, трэба ўсё ж такі план скласці, заблытаюся...

— Я табе яшчэ бутэрбродаў прынясу, — сказала маці.

* * *

Абедам Геула вырашыла, што вар'яцее.

Ёй здавалася, што ў яе адключылася памяць, а ў галаве плюхціць кісель.

Яна знайшла ў мікрахвалёўцы кашу, але так і не згадала, калі яе туды паставіла. Яна ўбачыла сябе ў ванным пакоі, але не памятала, ці мылася сёння. Яна адкрыла ноўтбук, але так і не зразумела навошта.

Маці спала. Але спала спакойным, нармальным чалавечым сном, шчокі ў яе былі ружовага колеру, і мама нават усміхалася ў сне. Альбіна зранку збегла на працу, паабяцала ўвечары заскочыць і праверыць, ці ўсё добра.

Славаў званок заспеў Гэлю за вельмі важнай справай. Яна глядзела, як у рондалі закіпае вада.

— Я ў Мінску па справах, можа, сустрэнемся?

Геула выключыла канфорку.

— Буду на «Купалаўскай» праз паўгадзіны, — рашуча сказала яна.

І ледзь не выйшла з дома ў пантофлях.

Слава хацеў на Зыбіцкую, але Геула пераканала яго ў Верхні горад не хадзіць, чамусьці ёй гэтага страшэнна не хацелася.

Мінск хваляваўся, але намагаўся трымаць аблічча. Нервова круціў хмарамі, як круцяць у руках аловак, пастукваў пальцамі-дрэвамі, дыхаў няроўна і рэагаваў не заўсёды адэкватна. Насельнікі горада ціснуліся да сцен, пакутавалі ад галаўнога болю і наракалі на магнітную буру.

Гэля са Славікам пайшлі праспектам уніз (каля цырка іх ледзь не здзьмула) і збочылі ў сквер, да фантана, дзе дзяўчаты апускаюць у ваду вяночкі*.

Бедны Слава. Ён проста хацеў пабавіць час з дзяўчынай, якая яму спадабалася. Ён разы тры намякнуў на тое, што Купалле — гэта, маўляў, каханне і ўсё такое. І нават пяшчотна ўзяў Гэлю за руку. Але Геула не мела настрою на флірт, яна была ўнутры сябе, на пытанні адказвала недарэчна і на кантакт не ішла. Руку не забірала, але і ніяк іначай не рэагавала.

— Пра што ты думаеш? — не вытрымаў Слава.

— Пра бацьку, — выпаліла Геула і сама здзівілася свайму адказу.

— Пасварыліся? — спагадліва спытаў Слава.

— Я б з радасцю... — уздыхнула Гэля. — Я ніколі яго не бачыла. Я нават не ведаю, як яго завуць.

— Я думаў, так толькі ў кіно бывае, — сказаў Слава. — Ты хочаш яго знайсці?

* У скверы Янкі Купалы ў Мінску ёсць фантан са скульптурнай групай, якая адлюстроўвае адну з традыцый Купальскай ночы: дзяўчаты пускаюць вянкі па вадзе, каб знайсці свайго нарачонага.

Геула кіўнула.

— Ну давай знойдзем, — прапанаваў Слава. — Паразмаўляй з мамай.

Гэля згадала белую маці з дрыжачымі вуснамі і катэгарычна адмовілася.

— Тады з бабуляй паразмаўляй.

— Яна памерла за год да майго нараджэння, — уздыхнула Геула.

— А дзядуля?

— Я ніколі яго не бачыла.

— Тады трэба сябровак маміных знайсці. Яны напэўна ж ведаюць.

Геула задумалася.

— Але ж гэта старыя сяброўкі патрэбныя, з якімі мама вучылася... Дзе я іх знайду?

— Слухай, ну ты як маленькая! У «Аднакласніках». Зайдзі на маміну старонку, пачытай...

— Але ж нельга лазіць па чужых старонках, — нясмела сказала Гэля.

Слава закаціў вочы.

— Ну не лезь у перапіску, проста паглядзі, з кім вучылася.

Слава правёў Геулу, на развітанне прыціснуў да сябе, цмокнуў у шчаку — і адразу ж войкнуў, бо джып, які праязджаў побач, абліў яго вадой з лужыны.

— Галя, я табе заўтра патэлефаную, — сказаў Слава, абтрасаючыся.

— Мяне Геула завуць, — выправіла яго Гэля. — Галя — гэта была хвілінная слабасць.

Ёй падалося, ці горад сапраўды абняў яе цёплым ветрам?

* * *

Ян сядзеў і злаваўся на сябе: «І чаго затупіў? Навошта павалокся на заняткі? Дома сцэнарый недапісаны!» Але сысці пабаяўся — пятым урокам была англійская мова, якую вяла класная.

А яшчэ Жанка круцілася каля яго ўсе перапынкі. Пытанняў не задавала, але рабіла выразныя вочы.

На інглішы класная выклікала Яна і сказала доўгую прамову, у якой ён разабраў «Шэйкспіа» і «Хэмліт». Відаць, русічка данесла пра неверагоднае захапленне дзевяцікласніка Марыніча класікай брытанскай літаратуры.

Ян адказаў адзінае, што ведаў на тую тэму па-англійску:

— Ту бі о нот ту бі, — і нечакана для сябе гаротна дадаў: — Зэт із зэ куэсчэн...*

Класная была ўражаная да глыбіні душы.

— Eight!** — выгукнула яна, хоць звычайна адзнакі Яна не падымаліся вышэй за «six»***.

Ян сеў, працягваючы здзіўляцца сваёй памяці. Адкуль усплыло гэтае «зэт із зэ куэсчэн»? У кішэні завібрыравала. Праверыў: гэта Жанка даслала ў асабістыя паведамленне, якое цалкам складалася з захопленых смайлікаў. Ён павярнуўся да яе і зрабіў страшны твар.

Пасля англійскай з чыстым сумленнем збег.

* «To be or not to be, that is the question» (*англ.*; «Быць ці не быць, пытанне вось у чым») — цытата з трагедыі Уільяма Шэкспіра «Гамлет».

** Восем! (*англ.*)

*** Шэсць (*англ.*).

Дома нікога, акрамя Норы, не было. Ён спешна абудзіў ноўт і пачаў чытаць.

Гэта быў нейкі жах!

Тое, што ўчора здавалася бліскучым сцэнарыем, сёння выглядала несусветным глупствам.

— Нора, — у роспачы сказаў Ян. — Як жа так?!

Котка мяўкнула нешта ў адказ і чмякнулася дагары жыватом.

— У цябе адно пажэрці ў галаве, — засмучана сказаў Ян.

І тут зазваніў тэлефон. Ян адказаў, не адрываючы вачэй ад экрана:

— Алё?

Са слухаўкі пачуўся здушаны голас Дарыны:

— Ян! Ты чаму мне не тэлефануеш?! Ты...

— Слухай, прывітанне, — перапыніў яе Ян. — Ты прыехаць да мяне можаш?

— Гэтак проста?! Прыехаць? Пасля таго...

— Ага, — сказаў Ян, — дапаможаш мне тут з сімтым даць рады. Давай, пакуль...

Да прыезду Дарыны ён паспеў яшчэ раз перачытаць напісанае, накарміць котку і падсілкавацца сам.

Здавалася, Дарына была нечым засмучаная, але Яну было не да яе праблем. Ён схапіў яе за руку і пацягнуў у пакой.

— Слухай уважліва! — загадаў Ян і стаў чытаць.

Чытаў і моршчыўся, як ад зубнога болю. Уголас гэтая бязглуздзіца гучала ўвогуле агідна. Але Дарына слухала ўважліва, і гэта трохі супакоіла Яна. Дачытваў ужо амаль без нерваў.

— Ну як? — спытаў ён.

— Гэта ўсё? — здзівілася Дарына. — А далей?

— Далей пакуль не напісаў. Ты лепей скажы: зусім дрэнь?

— Чаму гэта дрэнь? Нармуль. Цікава, што далей. А ты скуль спампаваў... Аёй! — скеміла Дарына. — Няўжо ты гэта сам напісаў?

— Сам! — адмахнуўся Ян. — Але мне не даспадобы... Ці нішто так?

— Дык супер! — горача сказала дзяўчына. — А ты дапішаш?

У Яна канчаткова адлягло ад сэрца, але адказаць ён не паспеў — у дзверы пазванілі.

За дзвярыма стаяла незнаёмае размаляванае дзяўчо ў топіку, шортах і ботах вышэй за калена. Відаць, паводле задумы ўсё мусіла выглядаць шыкоўна, але глядзелася смешна. Дзяўчо абаперлася на вушак і сказала назнарок хрыплым голасам:

— А давай зробім гэта сёння!

— Нюша! — скеміў Ян. — Кароціч! Я цябе не пазнаў! Чаго табе?

— Ты мне абяцаў! — капрызліва сказала Жанка.

— Ну дык папярэджваць трэба! Я ўвогуле вельмі заняты! — узлаваўся Ян.

— Табе шкада, га? Ты...

Жанка злосна паглядзела на Дарыну, якая выйшла з пакоя.

— Ну чаму ў цябе заўсёды нейкія дзеўкі таўкуцца, га? Я што, так шмат прашу?

— Дзеўкі? — удакладніла Дарына.

— Гэта... гэта... — паспрабаваў штосьці сказаць Ян.

— Неістотна, — ганарыста прамовіла Дарына, — захочаш патлумачыць — патэлефануеш.

І сышла, кінуўшы праз плячо:

— А сцэнарый твой — чухня поўная!

— Які сцэнарый? — зацікавілася Жанна.

— Мой, — прызнаўся Ян. — Слухай, а што гэта з ёй?

— Не ведаю, — пацепнула плячыма Кароціч. — А дасі пачытаць?

Ян заўважыў, што аднакласніца схітрылася цішком пратачыцца ў вітальню, і здаўся:

— Хадзем...

* * *

Геула пачувалася злачынкай. Пароль ад мамчынага ноўтбука яна ведала, але ніколі раней не залазіла ў яго без дазволу.

Не так і шмат у маці сяброў у «Аднакласніках»... Гэля перабрала некалькі чалавек, але неўзабаве стамілася лазіць па чужых старонках. Пагатоў маці выйшла ў краму і магла вярнуцца ў любы момант.

«Добра, пойдзем іншым шляхам», — падумала Гэля і зайшла на старонку Мінскага кулінарнага тэхнікума 2000-га года выпуску...

«Гэтая ў Варонежы, гэтая ў Баранавічах, гэтая на Кіпры... Аёй, да гэтай я дакладна не паеду... Мужчына? Зразумела, бармен. Ваў! Шэф-кухар у рэстарацыі ў Познані...»

Геула перабірала маміных аднакурснікаў і здзіўлялася рознасці лёсаў.

«Уга! Алена Васілеўна Іванова. Мінск. Месца працы — сталовая Мінскага УП... І недалёка...»

Гэля запісала на аркушыку імя і прозвішча, хвіліну падумала, варта чысціць гісторыю альбо маці

нічога не заўважыць, плюнула, вырашыла, што маці ў наладкі не палезе, і проста закрыла браўзер.

* * *

Сталовая была як сталовая. І пахла ў ёй, як у сталовай.

— Абедаць будзеш? — спытала ў Гэлі касірка. — Калі будзеш, давай хутчэй, мы праз паўгадзіны зачыняемся на спецабслугоўванне.

— Мне гарбату, калі ласка, — папрасіла Гэля.

Побач з тытанам стаяў дзясятак шклянак з неймавернай колькасцю цукру ў кожнай.

— Кіпень налівай, вунь там у сподку лімон, калі трэба.

— А можна без цукру? — нясмела спытала Гэля.

— У меню гарбата з цукрам, — адрэзала касірка.

— Добра-добра, — хутка пагадзілася Гэля, — я заплачу за цукар, толькі можна я куды-небудзь яго высыплю?

Касірка скрывілася, быццам толькі што ёй у рот запіхнулі ўвесь сподак з лімонам.

— Васілеўна! — зараўла яна. — Прынясі чыстую шклянку!

З кухні выйшла незадаволеная Васілеўна.

На бэйджы было напісана «Алена Іванова».

Усе пытанні заселі ў Гэлі ў горле. Гэтая жанчына выглядала гадоў на пятнаццаць старэйшай за маці. Яна была вялікая і стомленая. Кінула на Геулу нядобры пагляд і сказала, што праз дзесяць хвілін усё зачыніць.

Гэля заплаціла за гарбату і села пры століку ў куце.

Прыбіральшчыца ўзялася выціраць сталы, размазваючы па іх ваду. Пасля пачала з грукатам пераварочваць крэслы. Потым прыцягнула вядро вады.

Геула сербанула гарбату.

— Васілеўна, колькі сталоў пакідаем?

— Ды... — адказала Васілеўна, і ў Гэлі вушы скруціліся ў трубачку, — наступным разам... самі будуць сваіх алканаў паіць.

Гэля папярхнулася гарбатай.

Вывальваць на гэтую грозную бабу падрабязнасці мамінага жыцця было немагчыма. Гарбата была гарачая і не лезла ў горла. Гэля акуратна паставіла шклянку на ражок бліжэйшага стала.

— У нас самаабслугоўванне! — гыркнула прыбіральшчыца.

Геула зацкавана азірнулася, рука яе тарганулася, і трошкі гарбаты выплюхнулася на падлогу.

Прыбіральшчыца загырчэла. Гэля выскачыла са сталовай.

* * *

«Трэба адсочваць, куды я іду, — падумала Геула. — Трэба навучыцца сябе кантраляваць!»

Гэля павярнула ў бок цэнтра горада, але раптам падзьмуў моцны вецер, а ісці супраць ветру не хацелася. Гэля пайшла так, каб вецер дзьмуў у спіну.

Праз пару метраў Гэлю абагнала дзяўчынка гадоў дзесяці на ровары.

— Та-а-та, даганяй! — выгукнула яна.

Тата на вялікім спартыўным ровары дагнаў, ледзь не ўрэзаўшыся ў Гэлю. Тата быў мокры і цяжка дыхаў.

Геуле зрабілася крыўдна да слёз. На ровары яе вучыў катацца Чынгіз. Вучыў іх абаіх, разам з Кастусём.

Плаваць Гэлю вучыла маці. Маці гэтаксама вучыла яе рамантаваць краны, карыстацца шрубакрутам і прачышчаць засоры.

— Та-а-та, давай хутчэй! — крыкнула дзяўчынка.

— Усё, я здаюся, ты хвацкая раварыстка, — сказаў мужчына.

Дзяўчынка шчасліва засмяялася, саскочыла з ровара і кінулася на шыю бацьку, якому таксама давялося рэзка затармазіць.

— Не, ты самы хвацкі! — сказала яна, ледзь не паваліўшы і тату, і ягоны ровар.

Гэля ўсхліпнула. І наступныя два кварталы амаль бегла.

Калі б у яе дзяцінстве быў бацька! Калі б яна магла ім ганарыцца! Калі б магла сказаць, што ён самы хвацкі!

Гэля ўсё дзяцінства забараняла сабе марыць пра бацьку, а цяпер запруду прарвала. Яна плакала, што тата не заводзіў яе ў школу, што ён не забіраў яе са шпіталя пасля злоснага ротавіруса, што ён не абараняў яе ад хлапчукоў, што не хваляваўся праз яе тройку па фізіцы.

Цікава, які ён цяпер?

Геула азірнулася па баках, вышукваючы вачыма мужчын гадоў пад сорак. Вунь сядзіць адзін такі за стырном «аўдзі», па тэлефоне размаўляе, курыць.

— Ды ідзі ты лесам! — зароў мужык. — Не тэлефануй мне больш! Дастала!

А во тры алканы каля крамы.

А во лысы дзядзька ў паношанай куртцы.

Якназнарок, менавіта ў гэтым месцы ўсе мужчыны сярэдняга веку былі нейкімі брыдкімі.

Гэля затрымала погляд на мужчыне ў чорнай куртцы і спартыўнай шапцы. Ён непрыстойна зацмокаў языком, падміргнуў ёй і кіўнуў у бок машыны. Гэля спалохалася, прыбілася да незнаёмай жанчыны і разам з ёю спусцілася ў падземны пераход.

Толькі праз скрыжаванне сэрца стала біцца ў звычайным рытме.

«Значыцца, так, — сказала Гэля немаведама каму, — я не маю ўяўлення, хто мой бацька і які ён. У дзяцінстве яго не было. А цяпер ужо ўсё адно. У мяне ёсць мама. Калі б яна магла расказаць, яна б расказала. А не кажа, значыць, так трэба. Мае права. Лепей я не буду ведаць пра яго нічога. А то выявіцца, што ён, напрыклад, людзей у аўтазакі пакуе...»

* * *

Бацькі Яна вярталіся з гіпермаркета, абмяркоўваючы апошнія навіны.

— Карацей, — казаў бацька, праскокваючы скрыжаванне на жоўтае, — нічога страшнага. Садзяць толькі буйняк. Ну, як садзяць... грошы выбіваюць у бюджэт. А з мяне што возьмеш? Але, з іншага боку... слухай, можа, карту паляка зробім і з’едзем? У нас абаіх дзяды фармальна ў Польшчы нарадзіліся... Барбара! Ау!

Жонка сцепанулася і адказала:

— Так, можна... Я за Янчыка хвалююся.

— А што з ім зноўку?

— Сядзіць сцэнарый свой піша.

— Які дзень, — рагатнуў тата, — другі? Супакойся, заўтра што-небудзь іншае пачне рабіць!

— Не ведаю, — пакруціла галавой Барбара, — відэаблог яны з Гэляй вельмі доўга вялі.

— Дык гэта з Гэляй!

— Яму Геулы вельмі не стае, — працягвала Барбара.

— Папругі яму не стае! — адказаў тата Яна. — Хоць цяпер ужо позна, раней трэба было.

— Мне здаецца, для яго Гэля вельмі шмат значыць.

— Закахаўся ці што? — пацепнуў плячыма Станіслаў. — Дык яму шаснаццаць! Сёння закахаўся, назаўтра раскахаў...

Але Барбару было не збіць з тропу. Яна расказала, як сустрэла ў пад'ездзе раз'юшаную Дарыну: «Уяўляеш, зрабіла выгляд, быццам не заўважыла мяне!», а потым знайшла ў кватэры шчодра размаляваную Жанну.

— Карацей, — скончыла Барбара, — трэба іх з Геулай памірыць. Можа, ты з сынам паразмаўляеш?

— Ага, — развесяліўся муж. — «Дарагі Ян, вакол цябе тут дзяўчаты круцяцца, дык ты гані іх у карак і бяжы мірыцца з Геулай». Дарэчы, а чаму яны пасварыліся?

— Не мае значэння, — суха адказала жонка і больш не вымавіла ні слова.

Дома яна перш-наперш адасобілася, знайшла ў тэлефоне абанента «Іра СІТРА» і набрала нумар.

— Ірачка, прабачце, што так позна. Гэта мама Яна, мы ў вас на праграмах пару разоў былі... Ага... Вельмі прыемна... А вы памятаеце такую дзяўчынку Геулу?..

* * *

Ліза вярнулася дахаты з крамы і заспела на сходах Альбіну, чый погляд не абяцаў нічога добрага.

— Мне трэба было праветрыцца, — пачала апраўдвацца Ліза.

Альбіна закаціла вочы.

— Я танометр прывезла, зараз будзем мераць, — сурова сказала сяброўка.

Тут вочы закаціла Ліза.

— Я здаровая, — паведаміла яна, адчыняючы дзверы.

— Я не сумняюся, — сказала Альбіна, уклаўшы ў гэтыя словы ўвесь сарказм, на які была здольная. — Ты таблетку зранку выпіла? І ўвогуле, скажы дзякуй, што я Чыне не сказала пра хуткую. Ты б ужо была ў шпіталі ў асобнай палаце. І кансіліум вакол цябе. Ты ж яго ведаеш...

Ліза ўздыхнула і падставіла Альбіне руку.

— Мерай! — здалася яна. — Таблетку выпіла. Каву выкінула. П'ю гарбату з рамонкам. Яшчэ нешта?

Яны ўладкаваліся пры кухонным стале.

— Сто дваццаць на восемдзесят, — сказала Альбіна, — жыві пакуль...

Сяброўкі расслабіліся і ўсміхнуліся адна адной.

— Ліза, у мяне Гэля спытала пра бацьку, — прамовіла Альбіна, — я адказала, што нічога не ведаю. Я ж сапраўды нічога не ведаю. Але я хачу, каб ты ведала, што яна цікавіцца.

Ліза ўздыхнула. Потым уздыхнула яшчэ раз.

— А выпіць мне нельга? — сумна спытала маці. — Набубеніцца гарэлкай і забыцца на тое, што ты мне сказала.

— Ну прабач, — абурылася Альбіна, — я магла не казаць.

— Не магла, — сказала Ліза, — добра, давай гарбатай з рамонкам набубенімся.

А потым Альбіна маўчала, а Ліза гаварыла. Напэўна, ёй трэба было хоць каму расказаць гэтую гісторыю.

Жыццё Лізу не песціла. Бацьку яна не памятала, маці казала, што ён з'ехаў у іншы горад, калі ёй было два гады. Больш ніколі не вяртаўся. З маці былі цудоўныя стасункі, але ёй дыягнаставалі рак, калі Ліза была ў дзявятым класе. Маці была вельмі практычным чалавекам, таму зрабіла ўсё слушна — Ліза не пайшла ў старэйшыя класы, а паступіла ў кулінарны тэхнікум. Адвучылася, і калі маці праз некалькі гадоў барацьбы з хваробай усё ж такі памерла, была са спецыяльнасцю і ўжо працавала. Ёй вельмі падабалася быць кандытарам. Яна працавала ў прыватнай кавярні, узялі яе перадусім праз жаданне дапамагчы чалавеку ў складаным становішчы, незадоўга да мамінай смерці, але гаспадары ні разу не пашкадавалі пра сваё рашэнне. У Лізы быў талент. У яе з'явілася шмат добрых знаёмых і ўдзячных замоўцаў. У яе была маміна кватэра. Ёй было дзевятнаццаць гадоў.

— Ведаеш, мяне накрыла не адразу, а месяцы праз тры пасля мамінай смерці. Я вельмі добра памятаю дзень, калі ўсвядоміла, што зусім адна, разумееш? Я выйшла з працы і быццам растала ў горадзе. Гэлька так часта робіць: калі яна вельмі засмучаная, дык шыбуе пешкі праз увесь горад, пакуль галава не праветрыцца. Вось і я тады ішла як без памяці. Адзінота — гэта жахліва. Ты як мёртвы, але жывы, разумееш?

Альбіна кіўнула.

— Я нават не памятаю, дзе мы пазнаёміліся. Ён быў вялікі. Утульны. У яго паліто было такое мяккае, не куртка, а менавіта паліто. Мы размаўлялі, ён узяў мяне за руку, у яго былі цёплыя далоні. Мы прыехалі да мяне позна ўвечары, дагэтуль гулялі па горадзе. Я ўвогуле не ведаю, як так атрымалася. Я мала што памятаю. Памятаю, як было цёпла ад таго, што побач жывы чалавек. Калі б не ён, я б, напэўна, дахаты ў той дзень не вярнулася. Не ведаю, што б я рабіла. Я не магла думаць, я была пустая ўнутры.

— Як яго звалі? — спытала Альбіна.

— Мне здаецца, што я нават гэтага не памятаю, — сказала Ліза. — Сяргей? Раніцай ён з'ехаў, мы неяк хутка развіталіся, мне было няёмка ды ўвогуле... Ведаеш, я з радасцю расказала б Геуле, што яна народжаная ў каханні. Няхай бы гэта была проста жарсць на тыдзень, але такая, што дах знесла. Але тут нават жарсці не было. Проста холад унутры. І самота. Я не ведаю, як пра гэта казаць. А хлусіць не хачу.

Альбіна шморгнула носам.

— З іншага боку, — сказала Ліза, — нехта зверху пачуў запыт. Мне было самотна. Праз два тыдні я даведалася, што цяпер мне не будзе самотна... Дарэчы, ён засцерагаўся. Таму гэта ўсё містыка чыстай вады. Відаць, Геула вельмі хацела нарадзіцца якраз тады.

— А калі б не нарадзілася? Страшна падумаць, што было б з намі, — уздыхнула Альбіна, — давай я табе яшчэ раз ціск замераю. Бо ты зноўку бледная.

Ліза ўздыхнула і падставіла руку.

* * *

Барбара яшчэ раз зверылася з цыдулкай. Той тэлефон Геулінай маці, што ёй далі ў «СІТРА», выявіўся неактуальным, але адрас, здаецца, быў дакладны. Аднак Барбара ніяк не наважвалася набраць нумар кватэры на дамафоне. Яна вырашыла пачакаць, пакуль пад'езд адчыніць хто-небудзь з жыхароў. І тады ўжо Барбара зойдзе і пазвоніць проста ў дзверы. Чамусьці гэты спосаб здаваўся ёй больш правільным.

Доўга чакаць не давялося. Дзверы пад'езда расчыніліся, і з'явілася засяроджаная жанчына гадоў пад сорак.

— Выбачайце, — спытала яе Барбара, — а трыццаць сёмая кватэра на якім паверсе?

— А вам навошта? — насцярожылася жанчына.

— Мне трэба паразмаўляць з дзяўчынай, якая там жыве.

— Геулы няма дома.

Барбара прыгледзелася, і ёй падалося, што жанчына нечым нагадвае Гэлю. «Маці? — падумала Барбара. — Ну, можа, яно і лепей».

— А можна я з вамі пагутару?

Жанчына пацепнула плячыма і прамовіла:

— Я збіралася выпіць кавы. Тут побач ёсць невялікая кавярня...

Праз дзесяць хвілін яны сядзелі пры пластыкавым століку, і Барбара блытана тлумачыла:

— Разумееце... гэта не вельмі лагічна... і муж кажа, што нелагічна... Але мне здаецца, ім трэба памірыцца!

— Каму? — спытала суразмоўніца.

— Геуле і Яну! Яны разам стварылі канал на юцюбе. «Сіямцюб». І тое відэа, за якое канал заблакавалі, гэта ж Ян пра Гэлю здымаў!

Жанчына ледзь не папярхнулася кавай.

«Няўжо ёй Гэля не паказала? — здзівілася Барбара. — Можа, не паспела, канал раней заблакавалі...»

— Але вы нічога такога не падумайце! — заспяшалася Барбара. — Нічога... эратычнага... Я маю на ўвазе... Ды гэта ўвогуле неістотна. Не, істотна!

Пераскокваючы з аднаго на другое, яна выдала ўсё. І што Ян ніколі не мог на чымсьці засяродзіцца, а з Геулай ён мог месяцамі здымаць «Сіямцюб». І што той ролік — хоць там не было ні сантыметра аголенага цела! — атрымаўся вельмі... пяшчотным. І што цяпер Яна кідае туды-сюды: то адна дзяўчына, то другая, то ён спрабуе зняць нешта самастойна, то сцэнарый фільма піша...

Жанчына слухала, не перапыняючы. Барбара пакрысе супакойвалася.

— І ўвогуле... мне здаецца, тут... прабачце за гучныя словы... усё гэта вельмі невыпадкова. Я маю на ўвазе Яна і Гэлю. Ян, ён жа сам... вельмі не... выпадковы. Мы з мужам яго некалькі гадоў планавалі. Дыета, вітаміны, фоліевая кіслата, кансультацыі з лекарамі... Нават, — Барбара ўсміхнулася, — па святых месцах ездзілі. У Кіева-Пячэрскую лаўру. Не дапамагло.

Яна раптам зразумела, што спавядаецца зусім незнаёмай жанчыне, але адступаць было позна. Адным глытком дапіла астылую каву і працягвала:

— Мы ўжо рукой махнулі... А ён узяў — і вырашыў нарадзіцца. Быццам яму трэба было менавіта ў гэты

дзень нарадзіцца, бліжэй да Геулы. У іх жа розніца меней за месяц.

— А вы ведаеце, — прамовіла суразмоўніца, — што ёсць іншы хлопчык, які нарадзіўся не проста «бліжэй», а ў той жа дзень?

Барбара замерла, яна не чакала ўдару ў сонечнае сплячэнне.

— І праз вашага Яна Гэля з Кастусём пасварыліся. Гэта таксама лёс, га?

Жанчына ўсхапілася, кінула некалькі капеек на стол і рашуча накіравалася да выхаду. Барбара засталася сядзець. Яна не ўбачыла, як яе суразмоўніца выйшла з кавярні, набіраючы нумар.

— Ліза, — сказала нядаўняя суразмоўніца Барбары ў слухаўку, — як ты?.. Не, у мяне ўсё нармальна... Проста калі ад цябе выходзіла, сутыкнулася з адной... дзіўнай асобай... Не, усё нармальна. Не забывайся піць кроплі Зяленіна!

Альбіна адключыла тэлефон і пайшла да сваёй машыны.

* * *

Чынгіз абудзіў Лізу і Геулу званком у дзверы.

— Вы яшчэ спіце?! — абурана ўсклікнуў ён.

— Ты не мог з дому патэлефанаваць? — спытала Геула, з цяжкасцю разляпляючы вочы.

— Раніца! Усе ўжо на працы! Пад'ём! Будзі маму, паедзем ёй новае месца працы паказваць!

— Чаго? — спытала Ліза.

— Потым пытанні, потым удзячнасці, усё потым! — урачыста абвясціў Чына. — Я вару вам каву, вы збіраецеся за пятнаццаць хвілін!

Геула перазірнулася з маці. Абедзве пацепнулі плячыма, пагаджаючыся адна з адной, што супраціўляцца марна, і пацягнуліся на кухню...

— Карацей, Ліза, тут такая штука, — Чынгіз экспрэсіўна руліў і яшчэ больш экспрэсіўна расказаў, — у мяне праз тыдзень адкрываецца летнік, ты ж ведаеш, што мы другі паверх пад гэта ўзялі? Не ведаеш яшчэ? Дык во, ведай. Набіўся поўны цэнтр — шэсць груп, і, баюся, гэта не мяжа. Малых не бяром, ужо не лезуць. Карацей, трохі зашываемся. Я табе хваліўся, што ў мяне ўжо набор на верасень закрыты? Во, хвалюся. А трэці паверх мы пакуль не пацягнем. Напэўна. Я яшчэ не лічыў проста, не да таго пакуль. Дык во, летнік. У іх па два заняткі да абеду, потым гуляюць, потым зноў усялякія робаты-шмобаты. Але ты разумееш, якая неспадзяванка, дзяцей карміць трэба. Зараз, чакай...

Чына адказаў на тэлефанаванне і праз хвіліну працягваў:

— Мы спачатку думалі, што будзем у кавярні замаўляць, але дорага выходзіць. Калі прасіць, каб ссабойкі давалі, таксама не вельмі добра. Усім будуць даваць рознае, камусьці чыпсы дадуць, а камусьці тушаную капусту, а гэта захоўваць недзе трэба, разаграваць. Лета, горача... Яшчэ атруціцца хто. Карацей, тут мы згадалі, што ў нас падрыхтаваная кухня стаіць. Вялікая, абсталяваная. І я падумаў, што ў цябе дыплом, у цябе санкніжка, ты ж можаш кухарам працаваць? Я цябе афіцыйна вазьму ўлетку на працу, пакуль у нас сезон, а далей ты як хочаш — можа, што лепшае знойдзеш, можа, застанешся. Мае юрысты там цяпер пытанне з санстанцыяй вырашаюць, але я падумаў спачатку табе

працоўнае месца паказаць, раптам не спадабаецца, тады кагосьці іншага буду шукаць.

Чына спыніў машыну і азірнуўся.

— Як табе ідэя? — спытаў ён.

— Колькі дзяцей? — спытала Ліза.

* * *

На ўваходзе ў рэпетытарскі цэнтр Чыну апанавалі адразу некалькі чалавек. І пакуль ён адбіваўся адначасова ад новай настаўніцы рускай мовы («Давайце яшчэ адзін курс для пяцікласнікаў!»), маці аднаго з дзевяцікласнікаў («Чаму вы так шмат задаяце, мой хлопчык не дае рады!») і сямікласніка («Я рашыў вашу задачу, давайце мне шакаладку!»), Ліза і Геула падняліся на другі паверх.

У адным пакоі наладжвалі трасу для лега-робатаў, у другім юныя хімікі, мяркуючы па хітрых фізіяноміях, збіраліся нешта падарваць, у трэцім пакутавалі над бланкамі ЦТ адзінаццацікласнікі.

— А дзе кухня? — шэптам спытала Ліза ў дзяўчыны ў навушніках, якая ўладкавалася з кнігай проста на падлозе, паміж фікусам і крэслам.

— Кухня? — здзівілася дзяўчына. — Тут няма кухні...

— Чына ж сказаў, што ёю не карысталіся, — згадала Гэля.

— Ды няма тут кухні, — упэўнена сказала дзяўчына.

— Цяпер ёсць, — паведаміў працаўнік, які праходзіў міма, — асабісты рэкорд. Мы яшчэ ніколі так хутка не рабілі мантаж. Дзе гаспадар?

— Гаспадар унізе, — Геула паглядзела на маці.

Ліза сціснула вусны ў тонкую палоску.

— Хадзем паглядзім! — радасна сказала дзяўчына. — Кухня — гэта добра! Бо сядзім тут суткамі, жэрці хочацца.

* * *

— Дзве духоўкі, пліта, як і прасілі, лядоўня самая вялікая, выцяжка прамысловая... А паглядзіце, якая стальніца! А во тут крэсла можна павярнуць і сюды падкаціць, і ў вас будзе...

Геула не заўважыла, як Ліза знікла. Тэлефон яна ігнаравала.

— Дзядзька Чына, авой, Чынгіз Ахматавіч, вы маю маму не бачылі?

— А куды яна... — пачаў Чынгіз.

— Яна зразумела, што вы адмыслова дзеля яе гэтую кухню зрабілі, — выпаліла Гэля, — і збегла. Дзядзька Чынгіз, вы ж ведаеце, што яна крыўдуе, ну навошта вы? Яна зноўку будзе плакаць, што вы ёй так шмат дапамагаеце. Давайце мы ўжо з'едзем спакойна ў Маладзечна, і ўсім будзе добра! Мама ўвесь час кажа, што яна не можа быць вінная, а вам мы ўжо столькі вінныя...

— Вінная, кажа, — змрочна прамовіў Чынгіз, схапіў Гэлю за руку і павёў да сябе ў кабінет. — Я заняты для ўсіх! — сказаў ён дарогаю. — Альбіна мяне потым заб'е, але я табе раскажу, хто каму вінен...

У кабінеце ён нервова схапіў са стала шакаладны батончык, адкусіў, спахапіўся:

— Хочаш?

Геула пакруціла галавой. Чынгіз знішчожыў батончык, уздыхнуў:

— Лішнія паўгадзіны ў трэнажорцы...

Потым сеў на сваё месца, кіўнуў Гэлі на крэсла насупраць. Яна села, не зводзячы вачэй з гаспадара кабінета. У такім бязладным настроі яна ніколі яго бачыла.

— Ат! — махнуў рукой Чынгіз. — Хай яно перуном! Слухай.

* * *

Ад жончынай цяжарнасці Чынгіз псіхаваў болей за яе саму. Нават адмовіўся ад высвятлення полу дзіцяці на УГД*. Альбіна толькі пасмейвалася. Сама яна цішком у доктара спытала, і той супакоіў — хлопчык. Вядома ж, Чыне патрэбны быў менавіта хлопчык. Ён жа ўсходні чалавек, яму нашчадка давай.

І толькі напярэдадні родаў, калі Чынгіз вёз жонку ў «сямёрку», ён раптам прызнаўся, што марыць пра дзяўчынку. Альбіне ў той момант было ўсё адно, але ў памяць інфармацыя запала.

Нарадзіла яна ўдала, сама, без кесарава.

Але нешта ў гэты момант разладзілася ў гармanальнай сістэме Альбіны.

— Прагестэрон у яе панізіўся, уяві! — Чына быў не ў стане ўседзець на месцы, пачаў катацца ў офісным крэсле туды-сюды. — Я пасля таго выпадку ўсе гармоны вывучыў... А тады...

А тады ён быў малады і гарачы. Даведаўся, што сын нарадзіўся, — адразу ж забыўся, што марыў пра дачку. Пачаставаў усіх сяброў. І знаёмых. І малазнаёмых. Раніцой выйшаў на вуліцу, лавіў выпад-

* Ультрагукавое даследаванне.

ковых мінакоў, якія спяшаліся на першую змену, — налівау ім. Яго спрабаваў затрымаць міліцэйскі патруль — напаіў і міліцыянтаў.

Заскочыў дахаты, каб памыцца і пераапрануцца. Сеў на секунду ў фатэль, каб перадыхнуць... і ўсхапіўся ў халодным поце ўжо на пачатку дванаццатай! А прыёмны час ў шпіталі пачынаўся аб адзінаццатай! У тэлефоне ўбачыў восем прапушчаных ад Альбіны, спрабаваў перазваніць — жонка кідала слухаўку.

Чынгіз на таксоўцы (хапіла глуздоў на сваёй не ехаць) даімчаў да радзільні, дарогаю купіўшы букет памерам з дырыжабль.

Альбіна ў прыёмны пакой спусціцца адмовілася, толькі перадала нейкія непатрэбныя рэчы. Званкі па-ранейшаму скідвала.

— Ну, я перакана́ў мяне прапусціць, — сказаў дзядзька Чынгіз, гледзячы ўбок. — Не, нікога не забіў, хоць думкі такія ўзнікалі. І вось уваходжу я да сваёй нарачонай...

...Нарачоная сустрэла яго халодным маўчаннем. Чына быў жанаты ўжо не першы год, ён ведаў, што трэба прасіць прабачэння і прызнавацца ў бязмежным каханні. Упаў на калені, папрасіў, прызнаўся. Альбіна — у слёзы.

«Ты з ёю ноч правёў, так? — крычала яна, не саромеючыся суседак. — Скарыстаў момант, калі нікто замінаць не будзе?»

У Чынгіза ад здзіўлення мову заняло. У яго, акрамя Альбіны, ніводнай жанчыны не было... У кожным разе, пасля вяселля. Ён спрабаваў гэта патлумачыць.

«Гэта ты мне адпомсціў так? — працягвала псіхаваць Аля. — Таму што я табе не дачку, а сына нарадзіла?»

Пачуўшы шчырую бязглуздзіцу, Чынгіз зрабіў стратэгічную памылку — раззлаваўся на жанчыну, якая толькі што нарадзіла. Нешта такое рэзкае сказаў. Нават голас узняў. Пачалася істэрыка: «Ты мяне ніколі не кахаў! Ты мне хлусіш!» Ён спрабаваў супакоіць, абняць — Альбіна рыдала і адбівалася, як дзікая котка.

Тады ён ужыў жалезны, як яму здавалася, аргумент. Сказаў: «Супакойся, гэта для дзіцяці шкодна». У адказ ён пачуў жахлівае: «Гэта не тваё дзіця! Пакінь мяне! Ненавіджу цябе».

У гэтым месцы аповеду Геула здзіўлена страсянула галавой: Кастусь быў выкапаны тата. Не такі дужы, але рысы твару, рухі, хада...

— Ды хлусіла, вядома ж, — уздыхнуў Чынгіз, працягваючы мучыць крэсла. — Але ў той момант мяне бы малатком па галаве жахнулі. Карацей... я сышоў.

Наступныя суткі ён не памятаў. Не, ані кроплі не выпіў, проста чалавечая памяць літасцівая. Праз дзень набраўся смеласці, пайшоў расстаўляць усе кропкі над «і». Альбіна сустрэла яго нежывым паглядам. На ўсе пытанні адказвала: «Так», «Не», «Не ведаю». Самае галоўнае — што Кастусь не ад яго — пацвердзіла.

— Я сядзеў, — апавядаў дзядзька Чына, — і прыкідваў, дзе жыць буду. Кватэру, вядома ж, я б Алі з дзіцём пакінуў. Нешта такое сказаў... А Альбіна раптам: «Я ад дзіцяці адмаўляюся».

Чынгіз спрабаваў угаварыць яе аддаць сына яму. Альбіна паўтарала як заведзеная: «Гэта не тваё дзіця, у цябе няма на яго правоў».

— Я плакаў, абяцаў азалаціць яе. Нырку прадаць збіраўся, — казаў дзядзька Чына, і амплітуда ягоных

паездак у крэсле рабілася ўсё большай. — Можаш сабе ўявіць?

Геула не магла. Дакладней, уявіць дзядзьку Чыну, які прадае дзеля цёткі Алі нырку, — лёгка. Але дзядзьку Чыну, які плача...

— Ішоў ад яе калідорам як п'яны. Нічога не бачыў... І тут мяне даганяе Ліза.

Ліза як нічога ніякага ўзяла яго пад руку, папрасіла правесці да палаты: «Бо мне цяжка». Ён, вядома ж, правёў. А яна завабіла яго ў пакой і паказала Кастуся. Чынгіз яго адразу пазнаў. І Ліза сказала, што ён выкапаны бацька. І што Альбіну зараз слухаць не варта, яна пасля родаў не ў сабе. У яе шок. І прагестэрон панізіўся. І трэба трохі пацярпець і падтрымаць. Сказала, што будзе ўстаўляць Алі глузды на месца, што будзе трымаць Чыну ў курсе. Мабільніка ў яе тады яшчэ не было, яна штовечар тэлефанавала з паста медсястры і дакладвала, што і як.

— Тыдзень яна была для нас як маці Тэрэза, — казаў Чынгіз. — А праз тыдзень у Альбіны глузды на месца вярнуліся. І прагестэрон, каб яго, трохі падвысіўся...

Дзядзька Чына з пачуццём адштурхнуўся ад стала, крэсла ўрэзалася ў падаконне і з грукатам развалілася. Геула спалохана ўскочыла.

— Усё нармальна, — пракрахтаў Чынгіз, устаючы, — даўно хацеў гэную ламачыну замяніць. Дык во... Мы, вядома, паміріліся. Лізе дзякавалі як шаленыя. Прапаноўвалі ёй... што заўгодна, яна толькі адмахвалася. Я да лекара пайшоў, каб даведацца: можа, дачцэ яе чым дапамагчы. Тут нам лекар і сказаў пра цябе... Што ты не жылец... прабач.

Дзядзька Чына бязмэтна пабіў нагой абломкі крэсла і сказаў, пазіраючы на іх:

— А яна нас мірыла, разумееш? У яе дзіця памірае, а яна з намі носіцца, соплі нам выцірае. Я ніколі раней не думаў, што так увогуле бывае... Я больш ніколі ў жыцці такім дурнем не пачуваўся. Я пытаюся ў яе, чым, маўляў, дапамагчы. А яна маўчыць. Чым дапамагчы... Чым дапамагчы чалавеку, у якога дзіця пры смерці... Гэта такая бяссільнасць, ты не ўяўляеш. І такое шчасце цяпер ведаць, што я дапамагчы магу! І буду!

Геула прамаўчала.

— Тупай адсюль, карацей, — прабурчаў дзядзька Чына. — Мне прыбрацца трэба, крэсла замовіць. Процьма спраў!

Гэля пайшла да дзвярэй.

— І запомні, — сказаў Чынгіз, — калі хтосьці табе нешта робіць, дык гэта не дзеля цябе, а дзеля сябе.

Геула спынілася, здзіўлена паглядзела на дзядзьку Чыну.

— Ці ён ад цябе нешта хоча атрымаць... — працягваў ён. — Тады гэта авансавы плацеж. Ці расплачваецца за тое, што ты для яго зрабіла. Тады гэта адсоткі па крэдыце. Па крэдыце заўсёды плаціць болей даводзіцца.

— А мая мама? — спытала Гэля. — Калі яна вас мірыла, чаго яна ад вас хацела?

— Нічога! — злосна адказаў Чынгіз. — Вось таму я ёй свой доўг яшчэ доўга выплачваць буду. Усё, тупай!

— Я хацела... — пачуўся раптам голас Лізы.

Чынгіз і Гэля сінхронна азірнуліся. У дзвярах стаяла заплаканая маці.

— Я хацела развеяцца. Калі б не вы, я б тады звар'яцела.

— Не дуры мне галаву! — сказаў Чына. — Развеяцца яна хацела... Усе б так рабілі! Ты працаваць збіраешся?

Ліза кіўнула.

— Тады руш на працоўнае месца! А ты чухай дахаты, няма чаго тут пад нагамі блытацца.

* * *

Гэля ўвайшла ў пад'езд і ўбачыла, што ад рэкламы іхняя паштовая скрынка распухла, адчыніла яе, выцягнула ўсю кучу і ўжо збіралася выкінуць, але ў апошні момант заўважыла паперку з пячаткай.

«З'явіцца... а 13-й гадзіне... у пракуратуру...»

«Халера!» — падумала Геула і схапіла тэлефон.

— Патрэбна ваша дапамога, — сказала яна ў слухаўку.

Павісла секундная паўза, а потым Чына выпаліў:

— Ты ў небяспецы? У міліцыю тэлефанавала? Хутка дыктуй адрас, я зараз буду.

— Не-не-не, не трэба ехаць, — стала тлумачыць Геула, — са мной усё добра, проста прыйшла позва, і я...

— Геула, табе пагражаюць?

— Дзядзька Чына, я дома, са мной усё добра!

— Дакладна? — падазрона спытаў Чына.

— Клянуся, — адказала Гэля, — прабачце, не хацела напалохаць.

— Уф, — шчыра выдыхнуў Чына, — проста ты ўпершыню ў жыцці папрасіла ў мяне дапамогі, я ўжо думаў, цябе забіваюць.

Гэля патлумачыла пра позву. Чына запатрабаваў яе сфатаграфаваць, паглядзеў на здымак і адразу сказаў, што гэтую «паперку» можна смела выкінуць.

— Там увогуле нічога не напісана, нават у якасці каго Лізу выклікаюць. Я ўжо не кажу пра тое, што такія рэчы ўручаюцца асабіста ў рукі. А калі не ўручаюцца, дык гэта не ваша праблема.

— Дык што мне рабіць? — спытала Гэля.

— Нічога, — адказаў Чына, — зрабі выгляд, што ты яе выкінула разам з рэкламкамі, як збіралася. І не кажы нічога маме, таму што яна пойдзе і будзе спрабаваць размаўляць, бо ўпэўненая, што «ўсюды людзі» і «з усімі можна дамовіцца».

* * *

Ліза пабачыла Гэлю на кухні ў позе мысляра над няшчаснай паперкай. Позву Геула так і не выкінула, але пачала хутка пераказваць маці ўсё, што ёй сказаў Чынгіз.

— Добра, што не выкінула, — сказала Ліза, — я пайду.

— Ты аддасі грошы? — спалохалася Гэля.

— У мяне няма такіх грошай, — сказала Ліза, — я проста паразмаўляю з ім. Як з нармальным чалавекам. Таму што ўсюды людзі...

— І з усімі можна дамовіцца... — працягнула Геула.

Потым маці пайшла спаць, а Гэля яшчэ доўга думала пра тое, што маці непапраўная ў сваім аптымізме і што не вельмі зразумела, як з гэтым жыць і што рабіць.

* * *

Ян чарговы раз перачытаў сцэнарый і зразумеў, што гэта дакладна не ягонае. Першыя старонкі яшчэ ніштаватыя, але чым далей у лес... Ён закрыў файл і пераключыўся на браўзер. На першай жа ўкладцы натрапіў на «Сіямцюб».

Які ён акурат збіраўся заблакаваць.

Зрабілася зусім моташна. Яну вельмі не хацелася знішчаць уласны твор. Іхні з Геулай твор.

«Не магу ж я без яе дазволу канал закрыць, — падумаў Ян. — Трэба хоць спытаць».

Ён адкрыў тэлефонную кнігу, дакрануўся да кантакта «Гэля» — і слухаўка адразу загаварыла:

— Вітанкі, Ян! Прабач, што тэлефаную...

— Гэта ж я тэлефаную, — здзівіўся Ян. — Наконт канала... Закрыць яго трэба было б...

— Давай пакуль не закрываць! Ён мне патрэбны! Тэрмінова!

Праз паўгадзіны Гэля нацягвала на сябе і Яна «сіямскі» швэдар і адначасова тлумачыла свой план:

— Трэба ўсім расказаць! Гэтыя следчыя, яны такія смелыя, пакуль ніхто не ведае! А мы скажам, што ён у мамы хабар вымагае!..

— Слухай, — сказаў Ян, паморшчыўшыся, — а давай паспрабуем без істэрык і без нападаў.

— У сэнсе? — спытала Геула.

— Цяпер і так у сеціве зашмат рознай жуды. Давай здымем што-небудзь пазітыўнае.

— Што? — спытала Геула.

— Ну я не ведаю, — адказаў Ян, — лета на вуліцы. Прыгожа. Давай здымем пра каханне. У тваёй маці ёсць інстаграм? Ці яшчэ нешта, дзе фоткі яе торці-

каў і свят? Давай спампуем, зробім калаж пад файную музыку і раскажам гісторыю пра тое, якая яна малайчына. І прыгажуня. Вы, дарэчы, падобныя.

Геула паглядзела на Яна. Цяпер, калі абое былі ў швэдры, іхнія галовы аказаліся зусім побач. Час спыніўся. Яны спешна адвярнуліся ў процілеглыя бакі і паспрабавалі адсунуцца, хоць унутры швэдра гэта было праблемна.

— Ты чаго такая чырвоная? — буркнуў Ян.

— Горача ў швэдры, — адказала Геула. — Цудоўная ідэя. Я спампую фоткі.

* * *

— І навошта гэта ўсё? — спытала маці, тыцкаючы ў экран, на якім двухгаловы вядоўца распавядаў пра складаную сітуацыю, у якую трапіў добры чалавек і выдатны кулінар.

— Не ведаю, — шчыра сказала Геула, — проста не здолела маўчаць.

— Я збіралася пайсці і нармальна паразмаўляць, — уздыхнула маці, — а зараз нармальна не атрымаецца. Яшчэ абвінавацяць у паклёпе...

— Ніякага паклёпу! — Гэля перасунула паўзунок амаль на фінал роліка. — Усё вельмі акуратна! Мы пра хабар увогуле нічога не казалі, сказалі, што табе давядзецца плаціць штраф.

З дынамікаў данеслася: «Ну, вы ж разумееце...»

Маці працягла ўздыхнула і закрыла ноўтбук.

— Выдаліць ролік, я так разумею, можна і не прасіць?

Маці і дачка аднолькавымі жэстамі скрыжавалі рукі на грудзях.

* * *

Геула прачнулася ад тэлефоннага званка.

— Пяць тысяч праглядаў, — сказаў Ян. — Нехта спасылку даў на тутбаі. Дзвесце пяцьдзясят каментарыяў.

Гэля села на ложку і паспрабавала сканцэнтравацца.

— І што цяпер рабіць? — спытала яна.

— Цяпер — нічога, — усміхнуўся Ян. — Мы хацелі пагалоскі. Мы яе атрымалі.

Пачуўся званок у дзверы.

— Гэта я званю, — сказаў Ян, — давай разам паглядзім каменты, там ёсць такія, што адказваць трэба.

* * *

За дзень Ліза зараджала тэлефон тройчы. Пісалі аднакласнікі і аднакурснікі, тэлефанавалі старыя кліенты, пісалі знаёмыя знаёмых. Мэсанджары разрываліся, апарат гудзеў і награваўся.

Першыя пару гадзін маці Геулы шчыра намагалася адказваць, потым толькі ставіла падабайкі і смайлікі.

Скончылася гэта ўсё слязьмі. Геула і Ян прыехалі ў цэнтр, каб параіцца з Чынам, і заспелі Лізу, якая рыдала ў ягоным кабінеце.

— Што? — усклікнула Гэля і кінулася да маці.

— Гэтыя людзі... — галасіла Ліза, — яны мне столькі добрага за сёння нагаварылі. Я нават не ведаю іх... А яны...

Апошнім акордам была Алена Васілеўна Іванова, якая ўварвалася ў пакой Чынгіза. Яна ледзь не задушыла Лізу ў абдымках.

— Я як фотку ўбачыла, дык адразу і пазнала! Лізка! Дзе ж ты была? Я ж за цябе галовы паадрываю!

Геула, якая памятала грозную цётку ў сталовай, знямела і паспрабавала бачком выйсці з кабінета.

— Дачка твая? Дай абдыму! — зрэагавала на варушэнне Алена Васілеўна. — Ды мы з тваёй мамкай якраз былі як ты цяпер! Я па размеркаванні з'ехала, інакш бы нізавошта не рассталіся. Твая мамка — гэта агонь! Моц! Яна ўвогуле ў цябе — ух! У курсе?

Геула ад здзіўлення магла толькі ківаць.

* * *

Следчы чакаў Лізавету пры стале — строгі, зашпілены на ўсе гузікі.

— Слухайце, — сказала яна перш-наперш, — шчыра кажу, я не збіралася шум уздымаць. Хацела проста прыйсці і паразмаўляць...

— Лізавета Сяргееўна, — перапыніў яе следчы драўляным голасам, — я вас выклікаў, каб афіцыйна паведаміць: справа адносна вас спыненая.

— Спыненая? — Ліза разгубілася. — Гэта вельмі добра...

Гаспадар кабінета працягваў усё тым жа афіцыйным да агіднасці тонам:

— Загадам Прэзідэнта «Аб рэгуляванні дзейнасці фізічных асоб» вытворчасць кандытарскіх вырабаў дома аднесена да відаў дзейнасці, якія не з'яўляюцца прадпрымальніцкімі.

«Ды ён рэпетаваў, — зразумела Ліза, — шпарыць як па напісаным».

— Такім чынам, абвінавачанне ў незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці адносна вас знятае. Вы павінны толькі заплаціць адзіны падатак у памеры...

— Дзякуй, — перапыніла Ліза. — Мне трэба недзе распісацца?

— Калі ў вас ёсць нейкія прэтэнзіі да працы праваахоўных органаў, — следчы працягваў выкладаць завучаны тэкст, — вы маеце права падаць скаргу...

— Ды якую скаргу? — махнула рукой Ліза. — Усё ж добра скончылася!

І тут у голасе следчага ўпершыню прамільгнула жывая эмоцыя, амаль дзіцячая крыўда:

— Напрыклад, калі вы лічыце, што ў вас нехта вымагаў грошы...

— Слухайце, — уздыхнула Ліза, — не збіраюся я ні на каго скардзіцца! А ролік гэты... Ну, дачка ў мяне падлетак. У яе максімалізм у галаве. Ды яшчэ каханне бесталковае... А ў вас дзеці ёсць?

Следчы, які ўвесь гэты час не адрываў вачэй ад наведвальніцы, нешта для сябе вырашыў і канчаткова перайшоў на чалавечы тон:

— Двое ў мяне. Старэйшай дзесяць, малодшаму пяць.

— Ну, значыць, у вас яшчэ ўсё наперадзе. Няма ў мяне ніякіх скаргаў. Магу распіску напісаць.

Гэтая прапанова на момант зацікавіла гаспадара кабінета, але ён адразу ўзяў сябе ў рукі і пахітаў галавой.

— Давайце вось без лішніх рухаў. Вы напішаце распіску, што няма прэтэнзій, а начальства ў мяне

пачне высвятляць, а што за прэтэнзіі маглі быць. І так ужо...

Следчы абарваў сябе і працягнуў руку.

— Давайце я вам позву адзначу.

Ён падпісаў позву і папрасіў:

— Дарэчы, магчыма, вас будуць розныя журналісты распытваць...

— Я скажу, што вы вельмі добры чалавек і што гэта было непаразуменне! — адказала Ліза.

Следчы ўсміхнуўся:

— Можна і так... Але было б лепей ім увогуле нічога не казаць... А хочаце, я пакажу, як выйсці з пракуратуры праз службовы пад'езд? Каб з журналістамі не сустрэцца...

Геула пачала ўжо хвалявацца, калі ёй патэлефанавала маці:

— Сустрэнемся каля метро. З журналістамі не размаўляй, добра? І, дарэчы, твая Аксана Віталеўна аказалася вельмі добрым чалавекам. Яна заяву сама забрала!

Гэля адключыла тэлефон у нейкім ачмурэнні.

— Ну што? — нецярпліва спытаў Ян. — Мы перамаглі?

— Я не зразумела... Аксана заяву забрала...

— Нас спалохалася! — запэўніў Ян.

* * *

Гэліна мама паехала ў рэпетытарскі цэнтр працаваць, а Геула і Ян гэтага і не заўважылі: балбаталі, як звар'яцелыя. Да іх дайшло, што небяспека прамінула, Лізавеце Сяргееўне нішто не пагражае, «Сямцы» сваім ролікам узнялі рэальную хвалю.

— Там праглядаў болей за дзесяць тысяч, — хваліўся Ян. — Але гэта чухня! Ты памятаеш хоць раз, каб пасля нейкага з нашых сюжэтаў людзі сапраўды нешта рабілі? Мы крутыя: я і ты! О! Я паэт!

— Ага, — кіўнула Геула, — шкада такі канал знішчаць.

У Яна ўмомант згаслі вочы.

— Ну так, — сказаў ён. — Але ж нельга не закрыць... Ты з'едзеш... Я застануся...

— Так, нельга.

— Трэба закрыць.

— Давядзецца.

Квартал прайшлі моўчкі.

— Слухай, — прапанавала Геула, — але шкада ж адмаўляцца ад такога раскручанага рэсурсу!

— Шкада, — у голасе Яна чулася надзея, — але ж ты з'едзеш...

— Давай падзелім канал! Запішам ролік, у якім сіямцы падзеляцца. Ты сабе пакінеш «Сіямцюб», а я адкрыю... ну... «Сіямкацюб»... ці нешта такое...

— Можна, вядома, — надзея ў голасе Яна імкліва згасла, — але гэта несправядліва. У мяне застанецца раскручаны канал, а ў цябе... Ды і не ў гэтым праблема. Не хачу так.

Гэля кіўнула. Яна і сама разумела, што прапанова недарэчная. Проста ёй таксама вельмі не хацелася закрываць канал.

— Але ролік пра раздзяленне сіямцаў мы здымем, — сказаў Ян. — Будзе эфектны фінал канала. Паехалі да мяне.

* * *

Ян апошні раз пераглёдзеў ролік, мантаж якога рабіў усю ноч.

— Мы зрабілі аперацыю па раздзяленні, — казаў Ян на экране, — гэта было складана.

— Але цяпер мы два розныя чалавекі, — упэўнена казала Геула.

— Цяпер мы можам жыць асобна...

— Нават у розных гарадах...

— Цяпер мы зможам весці два розныя блогі!

Далей на экране замільгалі смешныя фотаздымкі.

— Цяпер я магу танцаваць!

Здымак Геулы, якая танцуе.

— А я магу не танцаваць!

Здымак Яна, які спіць на пляжы.

— Цяпер я магу глядзець біятлон!

Здымак Яна перад тэлевізарам.

— А я — не глядзець біятлон!

Здымак Геулы на дрэве.

— Лекар кажа, што аперацыя прайшла паспяхова, але магчымыя некаторыя ўскладненні.

— Кажуць, калі мы будзем аддаляцца адно ад аднаго на адлегласць, большую за дзесяць кіламетраў, магчымае запавольванне сэрцабіцця, а ў цяжкіх выпадках небяспечнае для жыцця зніжэнне ціску.

Ян націснуў на кнопку «Дадаць відэа» і ўтаропіўся ў індыкатар загрузкі.

Апошні сказ роліка здаваўся яму цяпер залішне пафасным.

«Лухта якая, — падумаў Ян, — якое яшчэ запавольванне сэрцабіцця? Што за трагедыя? От вазьму

зараз і з'еду куды-небудзь! І ніякага запавольвання не будзе!»

Ян ускочыў і ўзяўся запіхваць падручнікі ў заплечнік. У пакой зазірнула маці.

— Ты куды? — здзівілася яна.

— Да бабулі! — адказаў Ян. — Буду да іспытаў рыхтавацца!

— А мы хіба замінаем?

— Вельмі!

Зачыніўшы за сынам уваходныя дзверы, Барбара вярнулася ў гасцёўню, дзе муж шчоўкаў каналамі.

— Ян да тваёй мамы паехаў, — сказала яна.

— А што здарылася? — насцярожыўся Станіслаў. — Маме дрэнна? А чаму яна мне не патэлефанавала?

— Ды ўсё ў яе добра, — Барбара села побач з мужам. — Гэта ініцыятыва Яна.

— Анягож? — здзівіўся муж.

— Кажа, яму там лягчэй да іспытаў рыхтавацца.

— Можа, і лягчэй, — пацепнуў плячыма Стас. — Бабуля цяпер, напэўна, на лецішчы тырчыць, ён у кватэры адзін будзе.

Барбара страпянулася:

— І сапраўды! Ілоны Эдуардаўны пэўна ж няма дома! Трэба ёй патэлефанаваць!

Муж злавіў яе за руку і пасадзіў на месца.

— Сам разбярэцца.

— А што ён там есці будзе? — не магла супакоіцца Барбара.

— Ад голаду памрэ! — Станіслаў пачаў траціць цярплівасць. — І ад смагі! Хопіць квахтаць над ім! Хлопцу праз месяц шаснаццаць стукне! Грошы на картцы ён мае! Крамы там працуюць!

— Але ўсё адно трэба патэлефанаваць Ілоне Эдуардаўне! — не здавалася жонка. — Ён прыедзе, а бабулі няма!

— Во няхай сам і вымяркоўвае! Тэлефон бабулі ведае? Ведае! Дасць рады!

Муж моцна абняў жонку за стан.

— А мы з табою хоць пажывём трохі ўдваіх.

У гэты момант на ягоныя калені ўскочыла Нора.

— Утраіх, — засмяялася Барбара і адразу ж пасур'ёзнела. — Але трэба ўсё ж такі пытанне з ключамі вырашыць!

— Ды мае ён ключы! — адказаў Стас. — Я сам яму на звязак павесіў. Як наконт паглядзець які-небудзь рамантычны фільм? Каб толькі ты і я... Нора! Годзе кусацца!

* * *

Мінск падбадзёрыўся і разгарнуў энергічную дзейнасць.

Супрацоўнікі раённай бібліятэкі вырашылі наладзіць буккросінг.

У расклад аўтобуснага маршрута 62э і электрычак «Маладзечна — Мінск» унеслі невялікія змены.

Пажылая эмігрантка, якая прыехала наведаць родны Мінск, у апошні дзень свайго візіту выйшла пашпацыраваць па цэнтры.

На рагу вуліц Якубоўскага і Адзінцова раптоўны парыў ветру падраў білборд.

* * *

Геула здолела паглядзець ролік «Развітанне сіямцаў» толькі раз. Яе душылі слёзы, і дзяўчына скарыстала выпрабаваны сродак — пайшла бадзяцца.

Думак ніякіх не было. А яшчэ яна чамусьці вельмі стамілася. Давялося сесці на лаўку на прыпынку. На краі лаўкі ляжала тонкая кніжка, на вокладцы якой быў цьмяна знаёмы мужчына, апрануты паводле моды XIX стагоддзя. У руцэ ён трымаў стары пісталет і намагаўся не глядзець на чэрап, што ляжаў перад ім.

Вецер дзьмухнуў, спрабуючы разгарнуць кніжку, але не змог.

І зноў Гэля адчула, што яе нехта або нешта падштурхоўвае. Ці просіць. Ці настойвае.

Геула ўзяла кнігу і неахвотна пагартала. «Паваражыць, ці што?» — падумала яна.

Спачатку трэба загадаць нумар старонкі. Гэля ўзняла вочы. Паўз яе, не спыняючыся, прамчаўся аўтобус № 62э.

«Значыцца, шэсцьдзясят другая, — зразумела Геула і адлічыла старонкі. — А радок...»

Яна пакруціла галавой і заўважыла працаўнікоў, якія наклейвалі свежы білборд на падраны.

«Зніжкі! — крычала рэклама. — 12 % толькі да 12 чэрвеня! Кошты — ніжэй не бывае!»

Дванаццаты радок знізу абвяшчаў: «...ён развярнуў каня назад на Маладзечна...»*.

«Рыхтык! — падумала Гэля. — Маладзечна... Хоць якое Маладзечна? У мамы праца ўжо ёсць... Ды і ад следчага мы адбрахаліся».

* З кнігі Уладзіміра Садоўскага «1813».

Яна перавяла погляд на суседнюю старонку і прачытала: «Граф хутка мінуў руіны Маладзечна».

Думкі закруціліся ў галаве.

Ці ўсё ж такі паехаць, калі лёс ёй падказвае?

Што трэба нарэшце даць пажыць і маці. Што час аддаваць пазыкі, што яна ўжо дастаткова дарослая, каб пачаць жыць самастойна, а не сядзець у маці на шыі.

Няхай маці застаецца ў Мінску, калі ўжо для яе знайшлася праца. Дзядзька Чына не дасць ёй прапасці, цётка Аля падтрымае. Урэшце, маці яшчэ маладая і прыгожая і можа выйсці замуж. Нават нарадзіць яшчэ адно дзіця можа. Калі Гэля не будзе блытацца ў яе пад нагамі.

«Дзе вучыцца ў Маладзечне», — прагугліла Гэля ў тэлефоне.

Знайшла, што там ёсць каледж мастацтваў, і страшэнна ўзрадавалася. Тое што трэба!

«Зняць пакой у Маладзечне», — прагугліла Гэля.

Як мінімум пяцьдзясят даляраў, сума не празмерная, але і немалая, з улікам таго, што яшчэ есці нешта трэба, а васямнаццаці пакуль няма, і на нармальную працу яе ніхто не возьме.

А калі інтэрнат?

У каледжы мастацтваў інтэрната няма, затое ёсць у гандлёва-эканамічным... Не мара жыцця, але таксама ніштаваты варыянт.

Гэля паспрабавала на сайце высветліць, якія дакументы трэба будзе падаваць, але неўзабаве страціла надзею нешта зразумець.

«Славік, я заўтра хачу прыехаць у Маладзечна, складзеш кампанію пагуляць?»

«Ды хоць сёння!» — адказаў Славік.

* * *

У маршрутцы Ян зашыўся на задняе сядзенне, начапіў навушнікі, запусціў медыяплэер. Нечакана пачуў «Паўла Каэльё. Алхімік». Здаецца, ён паўгода таму запампоўваў нейкія аўдыёкнігі, але так і не паслухаў. Паленаваўся пераключаць на музычку, а праз пару хвілін уцягнуўся.

На фразе «Калі нечага моцна захочаш, увесь Сусвет будзе садзейнічаць таму, каб жаданне здзейснілася» давялося прачнуцца — яго штурхаў у бок кіроўца.

— Канцавы, — сказаў ён. — Выходзіць будзеш?

* * *

Са Славікам Гэля сустрэлася на ганку каледжа. Інфармацыю здабыць аказалася не так і лёгка (краіна-партызанка!), але выпадкова сустрэтая ў калідоры маці былога аднакласніка Славы паведаміла ўсё, што трэба. І пра тое, калі і якія дакументы падаваць, і пра інтэрнат, у які няпроста трапіць, і пра сярэдні бал атэстата.

Геула загарэлася. Бал яе цалкам задавальняў.

Потым Славік частаваў яе марозівам і яны шпацыравалі ў парку. Гэля ўжо збіралася на вакзал, калі Славіку патэлефанавалі. Ён доўга моршчыўся і паўтараў «ага», а пасля націснуў адбой і сказаў:

— А ты з сабакамі ладзіш?

— З якімі сабакамі?

— З вялікімі... Я іх не вельмі, а тут трэба выгуляць... Карацей, давай ты наступную электрычку возьмеш, га?

* * *

— Бяшку чатырнаццаць гадоў, ён ужо зусім старэнькі, яму трэба гуляць тройчы на дзень, — хутка казала Славікава маці. — Мне патэлефанавала калега, Ілона Эдуардаўна, а ў мяне яшчэ чатыры ўрокі другой змены, я не магу цяпер, а ён там спаскудзіць усю кватэру. Яго выгуляць каля пад'езда, ён далей не ходзіць.

— А з гаспадыняй што? — змрочна спытаў Славік.

— Ды ўсё добра з гаспадыняй, сустрэла ў Мінску аднакласніцу на вуліцы, тая з Ізраіля на дзень прыехала, ну і вельмі просіць, каб нехта пагуляў з Бяшкам, а яны пакуль абдымаюцца. Яна вернецца раніцой. Вось ключы.

— А ключы ў цябе скуль? — здзівіўся Слава.

— Ды ў яе на працы заўсёды захоўваецца запасны камплект, ці мала што. Карацей, заняткі праз дзве хвіліны, я бягу. Аброжак і павадок ляжаць проста ў калідоры.

— А калі ён падумае, што мы зладзеі? — спытала Геула.

— Бяшка? — засмяялася Славікава маці. — Ён узрадуецца. Заліжа вас да смерці. Калі не палянуецца ўстаць.

* * *

З замком Славік пакутаваў доўга. Геула паспела знервавацца, што зараз іх арыштуюць за незаконнае пранікненне ў чужую кватэру.

— Бяшка! — нясмела паклікаў Славік, адчыніўшы дзверы.

У кватэры было ціха.

— Бяшка! Бяшка!

Слава і Геула акуратна зазірнулі на кухню, а потым і ў пакой.

— Можа, мы не ў тую кватэру ўвайшлі? — спытала Гэля. — Таму і ключ не пасаваў.

— Ён проста схаваўся! — упэўнена сказаў Слава. — Зараз знойдзем!

Яны яшчэ раз уважліва агледзелі кватэру.

— Можа, маме патэлефануй? — прапанавала Геула.

Славік выцягнуў з кішэні смартфон, але адразу схаваў яго.

— У яе заняткі, яна не возьме слухаўку.

Яны памаўчалі.

— Можа, яго скралі? — няўпэўнена зрабіў здагадку Славік.

Геула абвяла вачыма ідэальна прыбраны пакой.

— А можа, гэта знак лёсу? — Слава зрабіў крок да Гэлі і аказаўся залішне блізка.

Геула адступіла.

— Не, сапраўды, — працягваў Славік ненатуральна вясёлым голасам. — Гаспадыні няма. Сабакі няма. Мы тут зусім адны.

І зрабіў яшчэ адзін крок да Гэлі. Яна паспрабавала адсунуцца далей, але там была сцяна.

Слава падступіў усутыч і ўпёрся рукамі ў сцяну справа і злева ад Геулы. Гэля нарыхтавалася выцяць яго каленам, але не паспела. Расчыніліся ўваходныя дзверы, і ўвайшоў Бяшка — вялікі даберман са слязістымі вачыма. За ім стаяў Ян.

Здаецца, у п’есах гэта называецца «нямая сцэна».

Зрэшты, нямой яна была нядоўга. Ян ацаніў сітуацыю і закамандаваў:

— Фас!

Бяшка ўсміхнуўся і рушыў на Славу. Славік тарганууўся і ўпаў, паваліўшы за сабою і Геулу. Тут іх і нагнала страшыдла, якое ўзялося вылізваць здабычу з нечаканым для свайго веку энтузіязмам. Славік выкруціўся і рвануў з нізкага старту, пратараніўшы ўваходныя дзверы. Убачыўшы гэта, Гэля зарагатала. Праз секунду да яе далучыўся Ян.

— Фу! — спрабаваў ён спыніць ласкавага Бяшку. — Нельга!

Але ад смеху не мог сабрацца з сіламі і ссунуць сабаку хоць на міліметр.

Насмяяўшыся і адапхнуўшы ад сябе Бяшку, Геула ўбачыла, што ўся яе вопратка пакрытая слядамі брудных сабачых лап.

— І як я паеду ў такім выглядзе? — засмуцілася яна. — Замыць бы...

— Дык замый, — адказаў Ян. — У бабулі новая пралка.

— Гэта кватэра тваёй бабулі? — здзівілася Геула.

— Ну так. Я прыехаў, яе няма, а Бяшка пакутуе. Ну я і выгуляў яго. А ты як тут?

— Доўгая гісторыя.

Ян падазрона паглядзеў на яе.

— Ну дык што, — сказаў ён, — будзеш замываць? Ці бабулю пачакаем?

— А яна сёння не прыедзе, — паведаміла Гэля. — Яна ў Мінску старую сяброўку з Ізраіля сустрэла... Карацей, дзе тут пралка? Я рэчы закіну і ўсё патлумачу...

* * *

— Ян, можна ўзяць халат тваёй бабулі? — спытала Гэля з-за дзвярэй ваннага пакоя.

— Вядома ж, бяры, — дазволіў Ян.

На століку бразнуў тэлефон Геулы.

— Табе тут паведамленне прыйшло! — гукнуў Ян.

Геула выскачыла з ваннага пакоя і прачытала.

«Я чакаю цябе ўнізе», — напісаў ёй Славік.

Гэля доўга глядзела на экран мабільніка, разважаючы, ці варта адказваць. Тэлефон зноў бразнуў.

«Або цябе трэба ратаваць?» — удакладніў Славік.

«Усё ок, — набрала Гэля, — не чакай мяне».

Геула сустрэлася вачыма з насцярожаным Янам.

— У тваёй бабулі гарбата ёсць? — спытала яна.

Ян нервова пацепнуў плячыма.

— Пашукаем? — прапанавала Гэля.

* * *

— Ну чаму?! — абуралася Геула. — Чаму вы ўсе такія... заклапочаныя?! Калі дзяўчына апынулася з хлопцам у пустой кватэры, гэта што — нагода цягнуць яе ў ложак?

— Не нагода, — адказаў Ян, нервова сёрбаючы гарбату і касавурачыся на Гэлю.

Гэля перахапіла ягоны позірк і шчыльней захінула халат.

— І ты туды ж!

— Ды нікуды ж! — пакрыўдзіўся Ян. — Проста... нечакана ўсё.

— Ты дакладна не ведаў, што я сюды прыйду? — строга спытала Геула.

— Ну скуль я мог ведаць, — здзівіўся ён, — калі ты сама пра гэта не ведала?!

— Але такіх супадзенняў не бывае!

Ян уздыхнуў.

— Не бывае. Гэта... мактуб.

— Чаго? — перапытала Гэля. — Мак... што?

— Гэта арабскае слова, — Ян крыва пасміхнуўся, — азначае, што «так і павінна здарыцца». Кшталту лёсу.

Геула задумалася і наліла сабе яшчэ гарбаты. Напой быў нейкім неверагодна духмяным.

— Я разумею, — дадаў Ян, — што ўсё гэта лухта. Лёс, рок... Але ж якая была верагоднасць, што мы з табою тут сустрэнемся?

Геула не стала спрачацца. Ян натхніўся.

— Значыцца, мы сустрэліся не проста так, а дзеля чагосьці... З нейкай мэтай.

Тут ён заікнуўся і папрасіў:

— Слухай, а ты можаш пас тужэй зацягнуць?

Гэля перахапіла Янаў позірк і захінулася ў халат па самае горла.

— Прабач, — сказала яна, — слухай, але калі гэта праўда, калі сапраўды ў лёсу ёсць мэта, давай падумаем, навошта мы сюды прыехалі?

Павісла напружаная паўза.

Тут вочы ў Гэлі акругліліся.

— Я ведаю! — сказала яна.

— Ну? — спытаў Ян.

— Я прыехала сюды пачаць новае жыццё. Увогуле з нуля. А тут ты...

Гэля ўсхапілася, халат расхінуўся, яна паспрабавала закрыць калені, атрымалася толькі горш.

— У цябе маленькая бабуля, — патлумачыла яна, — я проста вышэйшая.

Ян кіўнуў і зглынуў.

— Ну вось, — сказала Гэля, — нам з табою трэба расстацца! І толькі пасля гэтага я змагу пачаць новае жыццё.

Вецер, які прыляцеў з боку Мінска, прымусіў ліпу, што расла пад акном, пастукаць галінкай па шкле. Сукаватая галінка нагадвала палец, якім стукаюць па лбе, прымаўляючы: «Вы што, зусім ужо?!»

* * *

Гэля казала яшчэ доўга і эмацыйна. Халат пры гэтым паводзіўся так правакацыйна, што Ян быў вымушаны адвярнуцца да акна. І заплюшчыць вочы, бо Геула добра адлюстроўвалася ў шкле.

Гэта дапамагло. Ён здолеў уцяміць яе аргументы. Гэля, як выявілася, вельмі горача пераконвала, што ім з Янам трэба разысціся.

— Ну як мы можам разысціся? — уздыхнуў Ян. — Каб «канчаткова» расстацца, трэба спярша… ну, не ведаю… сустракацца. Быць парай.

«Пераспаць», — хацеў развіць гэтую думку Ян, аднак стрымаўся.

— Але ж мы сустракаемся! Дакладней, раней увесь час сустракаліся, здымалі нешта…

— Гэта не тое! — Ян пачуваўся дурнем, седзячы з заплюшчанымі вачыма, але расплюшчваць баяўся. — Мы проста робім… рабілі агульную справу! Як на працы! Кшталту калег, нічога такога…

— Не разумею… — у голасе Геулы з'явілася напружанне. — Якога «такога»?

Ян уздыхнуў глыбей і выпаліў:

— Ну... сэксу...

Павісла паўза.

Геула глядзела ў акно. Так уважліва яна яшчэ не глядзела ў акно ніколі ў жыцці. У калідоры храпануў Бяшка, і Гэля сцепанулася, быццам у яе над вухам лопнуў балёнік.

— Ян, паслухай, — замармытала Геула. — Я разбяруся з аднакласнікамі, здам іспыты, з'еду з Мінска, каб не турбаваць маму. З Кастусём усё ўжо скончылася, з ім было проста... А ты... Ты ж вельмі вялікі кавалак майго мінулага жыцця. У нас з табою быў мільён магчымасцей... Калі б гэта быў лёс, мы б ужо даўно... Мы столькі разоў заставаліся сам-насам...

Геула казала ўсё хутчэй і ўсё цішэй.

Ян паспрабаваў паварушыцца, Геула зноў сцепанулася. Ян убачыў, што яна не проста напалоханая, яна сапраўды ў паніцы.

— Слухай, — сказаў ён, каб разрадзіць атмасферу, — ты не памятаеш, калі апошняя электрычка на Мінск?

* * *

— Мама, я застануся начаваць у Маладзечне. Прабач, так атрымалася... Уяўляеш, апошнюю электрычку адмянілі. Не, я тут выпадкова сустрэлася з Янам, у яго ў Маладзечне жыве бабуля. Не, бабуля цяпер у Мінску. Ма, усё нармалёва... Так, добра. Так, я на сувязі.

Геула паглядзела на Яна.

— Табе прывітанне ад маёй мамы, — сказала яна.

— Угу, — адказаў Ян. — Калі мы ўжо тут да раніцы, можа, згатуем якія макароны? Есці вельмі хочацца.

Ад ежы Гэлю размарыла. Яна скруцілася на канапе абаранкам, захінулася ў плед, каб не бянтэжыць Яна, і сцішылася.

— Ты дзе спаць будзеш?

Гэля не адказала.

— Ты не хвалюйся, — спешна дадаў Ян, — я чапіцца не буду! Лягу ціхенька ў суседнім пакоі. Ці на кухні. Проста трэба абраць, хто дзе.

Геула зноўку змоўчала.

Ян адарваўся ад манітора і ўбачыў, што Гэля спіць. Гэтак жа, як у ягоным роліку, скруціўшыся абаранкам і паклаўшы пад галаву локаць.

Яна была... Ян зноў зразумеў, што яму не стае слоў.

Геула нагадвала нейкую рыбку... ці вустрыцу... карацей, нешта такое пяшчотнае, што можа існаваць толькі ў панцыры. Але цяпер гэтае пяшчотнае скінула панцыр і ляжыць...

Безабаронная!

Ян зразумеў, што правільнае слова — «безабаронная». Без абароны.

Ён знайшоў у шафе яшчэ адзін плед, які пах бабуляй, накінуў яго на Геулу, падаткнуў з усіх бакоў і пачаў на яе глядзець.

* * *

Ліза глядзела ў столь. Калі Гэля з'язджала на вакацыі з любімай «Калекцыяй прыгод», калі яна начавала ў сяброваk, калі яна ездзіла на спаборніцтвы, застацца адной у кватэры было нават прыемна.

Цяпер было страшна. Самотна. Пуста.

Тэарэтычна яна ўсё ведала. Дачка вырасце і з'едзе. Гэта нармальна. Гэта слушна. Так і павінна быць. Нашмат горш будзе, калі не з'едзе. Нашмат горш, калі да трыццаці ў маці пад крыльцам. Геуле шаснаццаць, яна дарослая, яна мусіць мець сваё жыццё, сваё каханне, сваю гісторыю.

«Спіш?» — бразнуў паведамленнем тэлефон.

Ліза ўсміхнулася. Альбіна заўсёды ведала, калі трэба пагаманіць.

— Слухай, — ні села ні пала пачала Альбіна, — я тут падумала, можа, і добра, што Гэля з Кастусём пасварыліся. Няхай пагуляюць, няхай выпрабуюць свае пачуцці. А потым яны ўсё адно зразумеюць, што нікога лепшага не знойдуць. Зрэшты, лёс не можа хлусіць. Нездарма ж яны ў адзін дзень нарадзіліся. Дарэчы! Чына замовіў нашу кавярню на дваццаць восьмага траўня а шостай гадзіне. Кастусік пакуль, вядома ж, вырабляецца, але, калі ўбачыць Гэлю, нікуды не падзенецца, выкіне сваіх новых дзевак з галавы. Наша Геула самая прыгожая. Як яна, між іншым?

— Нармальна, — адказала Ліза, — спіць.

— Я не хацела табе казаць, — сказала Альбіна, — але я выпадкова сустрэлася з мамай нейкага Яна. І яна мне пачала казаць нешта пра лёс і пра тое, што ў дзяцей каханне. Ты яго ведаеш?

Ліза нешта прамыкала ў адказ.

— Вось і я сказала, што ўсё гэта лухта, — узрадавалася Альбіна, — мы яшчэ на вяселлі ведаеш як гульнём! Ух!

Праз паўгадзіны Ліза злавіла сябе на тым, што пяты раз пераглядае ролік з Геулай на «Сіямцюбе»

і плача так, што неўзабаве давядзецца ратаваць ноўтбук.

Яна проста зайшла паглядзець, што новага наздымалі Гэля з Янам. Гэтае відэа было ўдарам пад дых. Ёй раптам зрабілася шкада сябе. Вельмі захацелася, каб побач быў чалавек, які кахае. Які здольны любавацца тым, як ты спіш...

* * *

На досвітку Ян усё зразумеў.

Ён закахаўся.

У Геулу.

Даўно.

Думка была настолькі простая і бясспрэчная, што Ян узлаваўся на сябе. Як можна было быць такім целяпнём! Усе ж прыкметы навідавоку! Яму з ёю добра? Добра! Сэрца тахкае, калі Ян глядзіць на Гэлю? Яшчэ як! Асабліва калі ў яе халат імкнецца сам сабою расхінуцца...

Ян нервова хітнуў галавой і яшчэ больш старанна падтыкнуў беражок пледа на Гэлі.

Так, што яшчэ? Ці думае ён пра яе? Анягож! Увесь час?

Тут Ян завагаўся. Сумленне патрабавала прызнацца, што часам ён думае не пра Гэлю, а пра нешта іншае. Пра бацькоў. Пра сцэнарый. Пра іспыты. Але ж немагчыма заўсёды думаць толькі пра адно!

Ян меркаваў, што «думаць увесь час» — гэта такое мастацкае перабольшанне. Маецца на ўвазе «думаць увесь час пра Геулу, калі не думаеш пра іншыя справы». Таму і тут можна ставіць уяўную птушачку.

Ён паспрабаваў згадаць яшчэ якія-небудзь прыкметы закаханасці. Здаецца, ва «У Кантакце» ён бачыў нешта такое: «Побач з каханым чалавекам час бяжыць непрыкметна». Ну так! Штораз, калі яны з Геулай прыдумлялі і здымалі ролік, час знікаў невядома куды. Толькі пачалі — а ўжо тры гадзіны прамінула!

Ян падбадзёрыўся. Ён закахаўся, ніякіх сумневаў!

А Геула?

Ці добра ёй з Янам? Ды хто ж яе ведае. Здаецца, няблага. Але «няблага» не значыць «добра». І сэрца ў Гэлі пэўна ж не замірае, калі яна бачыць Яна. Наконт «думаць увесь час» таксама былі сумневы. Час з Янам пралятае непрыкметна? Ніколі Геула такога не казала.

Відаць, не кахае.

І, адпаведна, каханне ў Яна неўзаемнае.

Ён прыслухаўся да сябе. Думаў, што гэтая навіна разаб'е яму сэрца, але нічога падобнага не адчуў. Наадварот, зрабілася цягуча-салодка недзе каля сонечнага спляцення. Ян заганарыўся. Ён малайчына: мужна ўспрыняў такую горкую вестку! Трохі засумаваў... але ў істэрыку не кінуўся, плакаць не пачаў.

Мужчына.

Зноў пастукала галінка ў акно. Калі б Ян прыслухаўся, ён бы пачуў у стуку адценне безнадзейнасці. Але ён зразумеў толькі, што ягонай каханай дзяўчыне перашкаджаюць спаць. Таму адчыніў фортку, адламаў галінку і, задаволены сабою, сеў у фатэль насупраць Геулы, каб любавацца ёю...

* * *

Ляпнулі ўваходныя дзверы. Ян прачнуўся.

Шыя ў яго здранцвела, галава гудзела. Ён з цяжкасцю ўстаў з фатэля і спалохаўся: Геулы нідзе не было. Ян выскачыў у калідор. Бяшка ўзняў галаву і пару разоў ветліва матлянуў хвастом. Ян кінуўся на кухню.

На стале стаяла вазачка з сочывам, запараная гарбата, ляжаў пачак печыва, а побач цыдулка.

«Бяшку выгуляла, з’ехала ў Мінск. Пакуль!»

Ён схапіў тэлефон, але за ноч той цалкам разрадзіўся.

Ян выбег на плошчу ў той момант, калі маршрутка «Маладзечна — Мінск» збочвала за рог. На заднім сядзенні ён паспеў заўважыць Геулу.

* * *

Настрой у Гэлі быў цудоўны. Маршрутка пустая, да Мінска даляцела, заторы ў горадзе яшчэ не пачаліся.

Мінулая ноч у Маладзечне згадвалася як праз смугу. Быццам яна ўбачыла душэўны сон, калі дэталі не памятаеш, а засталося толькі пачуццё чагосьці вельмі добрага.

Гэлі не хацелася аналізаваць, чаму ёй так спакойна, але яна пастанавіла скарыстаць гэты стан. Заскочыла дахаты, хутка памылася, пераапранулася і пайшла ў школу.

Яна ішла, унутрана выбудоўваючы дыялог з аднакласнікамі. Яна ведала, што зараз на яе абрынецца плынь бруду і лаянкі, і рыхтавалася да таго,

што давядзецца пасміхацца, не злавацца, што мэта ў яе — здаць іспыты, атрымаць пасведчанне і з'ехаць. І трэба проста стрымацца.

У клас яна ўвайшла максімальна сабраная, зрабіўшы некалькі глыбокіх удыхаў.

— А, Гэлька, здароўкі, — сказала Смірнова, — пашанцавала табе, ты кантрольную па матэме прахварэла.

Геула, якая была гатовая да чаго заўгодна, але толькі не да спакойнага «здароўкі», замерла, не ведаючы, як адказаць.

— А, порназорка вярнулася, — млява сказаў Прысмакоў, — нешта ты спазнілася, нас учора на англійскай так усіх...

— Заторкніся, — адсекла Смірнова. — Заклапочаны. Геула, калі хочаш, сядай са мной, я сёння адна. Дарэчы, уяві, нам учора сказалі, што мы мусім на іспыты паляну накрыць. Скажы сваёй маме, няхай яна ім зноўку скандал зладзіць. Дасталі ўжо бабосы з бацькоў цягнуць!

— О, Вегірэйка, — сказала класная, якая ўвайшла ў кабінет, — з цябе фота ў дзяцінстве, адсканаванае, і грошы, калі пойдзеш на выпускны. Калі не пойдзеш, мне трэба пісьмовая заява ад тваёй мамы, што ты засталася дома пад яе адказнасць.

Гэля злавіла сябе на тым, што дагэтуль стаіць са сціснутымі кулакамі. Яна паставіла сумку на стол і выпрастала пальцы. Рукі трэсліся.

* * *

У школе Ян зразумеў, што рэсурсы арганізма вычарпаныя. Больш за суткі без сну (дзве гадзіны

ў фатэлі не лічацца), стрэс ад сустрэчы з Геулай, няшчаснае каханне...

Тры ўрокі ён тупіў, пакуль класная не накіравала яго да лекара — Яна відавочна вадзіла ў бакі, калі ён ішоў да дошкі. Медсястра сур'ёзна вывучыла зрэнкі, памацала лоб і спытала:

— Нешта піў?

— Каву, — адказаў Ян.

— І ўсё?

— Яшчэ гарбату. Бабуліну, — у Яна ставала моцы толькі на кароткія сказы. — Не спаў проста.

— У камп'ютар гуляў? — у голасе медсястры чулася пагарда.

— Дзяўчына. Я кахаю яе. Яна мяне не. Не спаў. Думаў.

Погляд медсястры пацяплеў.

— Ідзі дахаты, — сказала яна. — Напішу, што ў цябе харчовае атручэнне.

І адразу спахапілася:

— Але атруціўся ты дома, не ў нашай сталовай, зразумеў?!

Ян кіўнуў і выйшаў.

Потым ён неяк апынуўся ў сваім пакоі і паваліўся на канапу.

І яго адразу пабудзілі — тата трос за плячо.

— Вячэраць будзеш?

Ян паглядзеў у акно. Сапраўды, быў глыбокі вечар. Прыўстаў і ўбачыў, што Нора развалілася на ягоных грудзях — а ён нават не заўважыў. Паспрабаваў сабраць думкі ў кучу.

— Як да бабулі з'ездзіў? — спытаў бацька.

Магчыма, ён і не ўкладаў у свае словы ніякай іроніі, але Ян яе пачуў. Іываліў на тату ўсё

ўперамешку: і пра выпадковасці, якія не выпадковыя; і пра няшчаснае каханне; пра сваю пастанову не замінаць Геуле, якая пачынае ўсё нанова...

У гэтым месцы бацька перапыніў:

— Значыць, ты закахаўся ў дзяўчыну, але не збіраешся нават сказаць ёй пра гэта?

— Дык зразумела ж, — пацепнуў плячыма Ян.

— Ачмурэць! — вось цяпер іронія ў татавым голасе дакладна не падалася. — Ты сам толькі сёння ўначы гэта зразумеў, так? А Гэля твая мусіла што? Думкі твае чытаць?

Была ў словах бацькі нейкая крыўдная логіка, але Ян не збіраўся здавацца.

— Яна сказала, што жыццё пачне нанова. І хоча са мной расстацца! А я кахаю яе і таму павінен...

— ...узяць яе за каўнер, страсянуць і пацалаваць! — запатрабаваў тата. — Павер майму досведу!

— Ды якому досведу? — скрывіўся Ян. — У вас з мамай заўсёды ўсё проста і зразумела...

І тут тата сумеўся.

— Ну, не заўсёды...

Яну падалося, што бацька збіраецца сысці, але той толькі пакруціў галавой і працягваў:

— Добра, слухай... У нас з мамай ужо заява ў загсе ляжала, гасцей запрасілі, рэстарацыя, сёе-тое... А за два тыдні да вяселля яна раптам паведамляе: «Я перадумала... я не ўпэўненая... давай расстанемся». Зусім як твая Геула. А я во такі ж, як ты, быў... Нерашучы... І жанчын зашмат слухаў. «Калі, кажу, ты не хочаш, дык і не трэба. Гвалтам не будзеш любы».

Бацька тужліва ўздыхнуў. Па ўсім відаць, ён вельмі добра памятаў тыя падзеі.

— Пайшлі ў загс забіраць заяву. А там чарга жаніхоў з нявестамі. Усе такія шчаслівыя, за ручкі трымаюцца, цалуюцца. Я Барбары кажу: «Можа, усё ж такі?..» А яна такая: «Не, дакладна!»

Тата надоўга змоўк. Ян не вытрымаў:

— Ну?

— Гну! — адгыркнуўся бацька. — Прычакалі, зайшлі, і тут мяне як маланкай шыбанула. Аднекуль зразумеў, што трэба рабіць. Кажу: «Спадарыня, мы жаніцца праз два тыдні не будзем. Мы сёння будзем!» У Барбары ад здзіўлення мову заняло. Рэгістратар занатурылася, я завёўся, пачаў лёстачкі ёй падпускаць, потым пабег да нейкай начальніцы, напеў ёй пра палярную экспедыцыю! У Антарктыду! Уяві?!

Ян не стрымаўся:

— І гэты чалавек дакарае мяне за легкадумнасць!

— Дык я ж дзеля справы! — сказаў тата. — А ты так... без дай прычыны. Ну, карацей, нас там і распісалі. Барбара за ўвесь гэты час толькі адно слова прамовіла: «Ага», — калі ў яе спыталі, ці згодная выйсці замуж за спадара Марыніча. А калі наконт прозвішча спыталі, я адказаў, што яна бярэ прозвішча мужа, а Барбара толькі кіўнула.

Бацька рассмяяўся.

— А потым яна мне прачуханку зрабіла: маўляў, я мусіў яе неяк па-іншаму ўгаварыць, каб вяселле было паводле правілаў з сукенкай і шампанскім.

— Чакай, — здзівіўся Ян, — але ж у вас было вяселле? Вы ж відэа ўсім гасцям паказваеце!

— Вядома, было, — кіўнуў бацька, — ад рэстарацыі я адмовіцца не паспеў. Таму ў прызначаны дзень усё прайшло амаль паводле плана. Проста без

загса. Карацей, сын, не выдурняйся, ідзі да сваёй Геулы і пакажы, што мужчына!

— Але ў Каэльё сказана... — пачаў Ян.

— У Каэльё! Знайшоў пісьменніка!

* * *

Геула дагнала класную каля настаўніцкай.

— Святлана Фёдараўна, — сказала яна, — можна з вамі паразмаўляць?

— Так, хадзем, толькі давай хутчэй, у мяне заняткі, пяціклашкі мне кабінет разнясуць.

Гэля глыбока ўздыхнула і выклала ўсё: што ёй проста неабходна сысці з гэтай школы, што яна ўжо ўсё вымеркавала, але ёй трэба ўлагодзіць канфлікт з Аксанай Віталеўнай, бо тая не дасць ёй спакойна здаць іспыты, а ёй не патрэбны бліскучы сярэдні бал, дастаткова сапраўды сярэдняга.

— Чакай, — здзівілася класная, — чаго ты баішся? Як табе могуць перашкодзіць здаць іспыты?

— Ды яна заваліць мяне! — злосна выпаліла Геула.

— Гэля, супакойся! — упэўнена сказала Святлана Фёдараўна. — Аксана Віталеўна можа табе трапіцца ў камісіі толькі на адным іспыце, дый тое выпадкова. Нават калі яна паставіць табе шэсць, гэта нешта зменіць? Палічы свой сярэдні бал, мне здаецца, нават калі ты ўсе іспыты здасі на пяцёркі, у цябе ўсё адно будзе вышэй за сямёрку. Чаму ты панікуеш?

Гэля разгублена паглядзела на класную.

— Ідзі на заняткі, — сказала тая, — і не дуры мне галаву.

* * *

Заснуць Ян так і не здолеў. Ці то ўдзень выспаўся, ці то бацькавы словы надта яго ўсхвалявалі.

Ян сумленна ляжаў у цемры і разважаў, што ён зараз мусіць рабіць. Грандыёзныя планы змяняліся як у калейдаскопе.

Прызнацца ў каханні і панесці Геулу на руках у ружовы вечар.

Не прызнавацца, а самазабіцца проста ў Гэлі на вачах (тады яна дакладна здагадаецца).

Напісаць раманс і выканаць.

З'ехаць у іншую краіну, стаць там прэзідэнтам, а потым вярнуцца па Геулу.

Стаць прэзідэнтам і знесці яе ў ружовы вечар.

Застрэліцца і стаць прэзідэнтам.

Знесці Геулу ў ружовы вечар і там прызнацца, а ўжо потым з'ехаць.

У палярную экспедыцыю, як тата.

Цікава, у Антарктыдзе ёсць пасада прэзідэнта?

І ружовыя вечары?

* * *

Геула другі дзень спрабавала прызвычаіцца да думкі, што ніхто не збіраецца цкаваць яе далей. І завуча баяцца таксама не варта. Асабліва з улікам таго, што Гэля сабралася сысці ў маладзечанскі каледж. Ці не сыходзіць? Ці не ў маладзечанскі?

Паколькі дурыць галаву не было каму, Гэля працягвала грузіць сябе.

Пасля першага ўрока яе развагі былі перапыненыя з'яўленнем Яна.

Выглядаў ён дзікавата: позірк у адну кропку, ускудлачаныя валасы. Але калі Ян загаварыў, Геула забылася на ўсе дзівацтвы ягонага знешняга выгляду.

— Геула, — прамовіў ён голасам кібарга, — я кахаю цябе. Не перапыняй!

Геула не перапыняла, яна аслупянела.

— Я разумею, — працягваў Ян, — што ты абыякавая да мяне, таму не можаш адказаць узаемнасцю. Ну што ж... Гвалтам не будзеш любы...

Гэля хацела пераканаць сябе, што ўсё адбываецца насамрэч, але не атрымалася. У рэальнасці Ян ніколі не здолеў бы вымавіць «гвалтам не будзеш любы» — і не ўсміхнуцца.

— Галоўнае, — казаў няшчасны закаханы, — каб табе было добра. А я больш ніколі не абцяжару тваё існаванне.

«“Абцяжару існаванне”, — напружана разважала Геула, — ён што, дрэні нейкай накурыўся?»

А Ян ужо падыходзіў да фіналу сваёй прамовы:

— Абяцаю! Ты мяне больш ніколі не ўбачыш. Клянуся перад тваімі сябрамі!

Толькі тут Гэля зразумела, што за гэтым цыркам назіраюць аднакласнікі. У дзяўчат ад цікаўнасці вочы сталі як на малюнках пра базедаву хваробу. Хлопцы цішком курчыліся ад смеху.

Геула пачала збянтэжана апраўдвацца перад гледачамі:

— Гэта Ян! Мы з ім канал на юцюбе вядзём... вялі...

— А! — узрадаваўся Прысмакоў. — Дык во хто тую парнушку з Гэлькай здымаў!

Геула ўжо збіралася, як у старыя добрыя часы, ужарыць хама падручнікам, але яе апярэдзіў Ян.

Ён павярнуўся да Прысмакова і сказаў усё тым жа нечалавечым голасам:

— Во бачыш! І гэты юнак таксама ў цябе закаханы.

Клас нарэшце зарагатаў. Прысмакоў замёр з вырачанымі вачыма. Калі б яго абазвалі казлом ці дурнем, ён бы ведаў, як рэагаваць. Але «юнак» падраў усе шаблоны на дробныя шматкі.

— Ён проста маскіруе свае пачуцці пад насмешку, — не збочваў з каляіны Ян. — Гэта нармальна. Хто каго чубіць, той таго і любіць.

Некаторыя аднакласнікі ад смеху пачалі спаўзаць пад парты. Але Ян працягваў як нічога ніякага:

— Сябра! Не саромейся сваіх пачуццяў! Скажы ёй! Раптам табе пашанцуе!

Ян выйшаў. Рогат дасягнуў апафеозу. Не смяяліся толькі Геула і Прысмакоў.

— Афэлак! — крыкнуў Прысмакоў у дзверы, за якімі толькі што знік Ян.

* * *

Урокі Геула неяк даседзела, але, толькі трапіўшы дахаты, завалілася спаць.

Абудзіла яе маці дзіўным пытаннем:

— Ты каго-небудзь з сабою заўтра бярэш?

— Куды? — спытала, не расплюшчваючы вачэй, Гэля.

— Сонейка, у цябе дзень народзінаў заўтра.

— Га? — Геула села і паспрабавала ўключыцца. — Мама, а можна я не пайду?

— Куды? — спалохалася Ліза.

— Нікуды, — шчыра адказала Гэля. — Давай адзначым ціха і спакойна. Удзвюх.

— Гэля, ты ж ведаеш Чыну, ён ужо ўсё замовіў. Нашу кавярню. Я думала, ты кагосьці з сяброў возьмеш...

Геула павалілася на ложак.

— Слухай, ну ты ж ведаеш, гэта ненадоўга. Пасядзім, паядзім. Адзначым шаснаццаць гадоў знаёмства. Пасля да Ады заедзем. Трэба ж ёй вас паказаць. Гэткіх ласёў вялізных.

Гэля кіўнула. Колькі яна сябе памятала, усе дні народзінаў яны адзначалі аднолькава. Спачатку абед у кавярні. Яны з Кастусікам задзьмувалі свечкі на торце. Потым да Ады. Потым як атрымлівалася. Апошнія гады яны разам з Кастусём ішлі гуляць, а бацькі ехалі ў Тарасава і часта гулялі да раніцы, Альбіна і Ліза заўсёды пад раніцу плакалі, абдымалі адна адну і кляліся ў вечным сяброўстве. Чына не замінаў. Толькі падкладаў ім плоў, ці манты, ці яшчэ штосьці, што ён гатаваў проста неверагодна.

Потым, праз пару тыдняў, Геула яшчэ раз адзначала свой дзень народзінаў, ужо з Янам. Там усё было інакш: квэст ці яшчэ якая забава, сябры-«калекцыянеры», шум, тлум, стаянне на вушах. Але пра гэта думаць не хацелася, пра Яна пасля сцэны ў класе ўвогуле думаць было немагчыма.

Няхай Кастусь, з ім таксама цяжка сустракацца, але калі мамы найлепшыя сяброўкі, адно ад аднаго нікуды не падзецца.

Гэлі зрабілася сумна. Усё ж такі Кастусік вельмі добры. І яны ўсё жыццё разам. Ён прапанаваў ёй пажаніцца, калі яму было сем гадоў. Дарэчы, на дні народзінаў. Так і сказаў, маўляў, вырасту і ажанюся з табою! І кветкі падарыў. І на калена ўстаў. Насамрэч з тых часоў пытанне болей і не абмяркоўва-

лася. Яны былі афіцыйнай парай, Кастусік прыходзіў да яе ў школу на святы, яна ездзіла да яго на спаборніцтвы і заўзела за яго, у іх быў мільён спатканняў, паходаў у кіно ды іншых атрыбутаў заляцання. Бацькі з абодвух бакоў былі толькі за... А зараз трэба набрацца мужнасці і паведаміць бацькам, што яны болей не пара і гэта іхняя канчатковая пастанова.

Ці яны ўсё ж такі два ідыёты? Ну не дрыжаць у яе рукі, ну не трымціць сэрца ад позірку на Кастуся... А яно ёй трэба? Кастусь файны, высокі, яны з ім такая прыгожая пара! З ім спакойна. Тут Геула чамусьці прыгадала шалёныя вочы Яна і ягонае прызнанне ў каханні. Навошта гэты дурань усё сапсаваў? Напрыдумляў сабе... Лухта! Хай бы забыцца, зрабіць выгляд, быццам ніякага прызнання не было. І ўвогуле нічога не было. А ў яе проста чарговы дзень народзінаў, на якім яе сустрэне хлопец і яны пойдуць гуляць. І ўсё будзе спакойна.

Чаму нельга, каб было спакойна?

Гэля ўсхапілася і пайшла ў ванны пакой.

— Мама, можна я заўтра апрану тваю сукенку? — спытала яна.

— Безумоўна, — здзіўлена адказала маці, — а не занадта святочна?

— Я хачу быць прыгожай, — сказала Геула.

* * *

Ян бегаў па кватэры. Часам заміраў і быццам засынаў, але працягваў бачыць усё наўкол. Потым падскокваў і бег да тэлефона — праверыць званкі.

Таму што Геула павінна была патэлефанаваць і сказаць, што ўсё не так.

Яна таксама яго кахае.

Яна проста збянтэжылася і не сказала адразу.

Але званкоў не было.

Мама і тата нешта яму казалі, ён адказваў — і адразу забываўся. Галаву свідравала адна думка: «Зараз яна патэлефануе і скажа».

Ён нават ноч правёў у паўсне, уздрыгваючы і прачынаючыся ад кожнага гуку на двары, ад мяўкання Норы, ад лёгкага шоргату за сцяной — суседзі проці ночы нешта перацягвалі.

Толькі пад раніцу ён зразумеў, што ніякага званка не будзе.

А яшчэ Ян зразумеў, што ўсю гэтую гісторыю з прызнаннем ён прыдумаў, каб пачуць: «Дурненькі! Я таксама цябе кахаю».

Ён заснуў моцна і хутка. Нешта яго турбавала, Ян круціўся — калі прачнуўся, прасціна і коўдра былі вычварна скручаныя, — але ў свядомасці не засталося ніякага следу жахлівых сноў.

Ян зразумеў, што яму трэба прайсціся, каб ачомацца.

Гэля заўсёды так рабіла.

* * *

Чына сустрэў Геулу і Лізу на парозе кавярні.

— Гэты ёлупень недзе затрымліваецца, таму я за галоўнага, — сказаў ён. — Дарагія дзяўчаткі, са святам вас!

Чына ўручыў «дзяўчаткам» два шыкоўныя букеты, расцалаваў абедзвюх і накіраваў у малую залу за сервіраваны стол, а сам пайшоў рабіць апошнія распараджэнні па меню.

Афіцыянтка ўсміхалася і расстаўляла букеты, Альбіна адразу кінулася на шыю Лізе, а потым са словамі «Не магу чакаць, давай хутчэй прымярай» уручыла падарунак Гэлі.

— Нішто сабе, як ты з сукенкай патрапіла! — захоплена прамовіла Альбіна.

У скрыначцы быў кулон пранізліва блакітнага колеру ў тон сукенцы. Ён быццам свяціўся знутры.

Альбіна як дзяўчынка запляскала ў ладкі.

— Як табе пасуе! Глядзі, якая прыгажосць! Глядзі, як да сукенкі пасуе! О! Кастусь прыйшоў! Кастусь, ты паглядзі, якая Геула прыгажуня!

Альбіна са слязьмі замілавання кінулася абдымаць Гэлю і раптам замерла. Геула, якую ўвесь гэты тлум таксама расчуліў, здзівілася таму, што цётка Аля скамянела, і азірнулася.

У дзвярах залы стаяў Кастусь. У адной руцэ ён трымаў падарункавы пакет, а другой абдымаў дзяўчыну.

— Гэта Алеська, — сказаў Кастусь, — вітанкі ўсім. Мама, гэта Алеся мне падарыла, я тут пастаўлю.

У магільным маўчанні жанчын Кастусь пацягнуў Алесю да стала, пасадзіў яе і сеў побач.

— Ты б Гэлю з днём народзінаў павіншаваў, — скрозь зубы сказала Альбіна.

— Каго? — здзівілася Алеся. — Ты ж сказаў, што гэта ў цябе дзень народзінаў?!

— А мы з Гэлькай у адзін дзень нарадзіліся, — патлумачыў Кастусік, — дык і святкуем разам. Дарэчы, а чаму шампанскае не адкаркаванае?

Кастусь схапіў бутэльку, зухавата яе страсянуў, выцягнуў корак і...

Разам з гукам стрэлу ў залу зайшоў Чына. Ён імгненна ацаніў сітуацыю. І застылыя твары жанчын, і Алесю, і Кастуся, які паліваў шампанскім падлогу.

— Выйшаў да мяне! — сказаў ён.

Кастусь раптам замітусіўся, паспрабаваў кудынебудзь прыладзіць бутэльку, але так і пайшоў да бацькі, пакідаючы за сабою пеністую сцяжынку.

Чынгіз зацягнуў сына ў кут і спытаў вельмі нядобра:

— Гэта ўвогуле хто?

— Алеся, — буркнуў Кастусь.

— Бачу... што не Пятро! Ты навошта яе прыцягнуў?

— Алеська, — ганарыста адказаў Кастусь, — мая дзяўчына, а я...

— А ты, — перапыніў яго бацька, — дурань! Ты хоць разумееш, у якое становішча Геулу паставіў?! Ды ўвогуле ўсіх!

— Ды што тут такога?..

— «Што такога»? — твар Чынгіза пачаў налівацца малінавым. — Ты напраўду мой сын?

Кастусь не адказаў. Іхняе з татам партрэтнае падабенства не патрабавала каментарыяў.

— Ты з Гэляй збіраўся ў адным нумары жыць! У адным ложку спаць! Я ў цябе спецыяльна пытаўся!..

Выглядаў Чынгіз у той момант застрашліва. Кастусю давялося сабраць усю сваю мужнасць у кулак, каб абыякава запытаць:

— Дарэчы, тата, ты можаш перааформіць гатэль? Мы з Алеськай тады на мора паедзем...

Чынгіз пабарвовеў і сказаў як сякераю сакануў:

— Ніякага гатэля. Ніякай Алеські. Ніякага мора. Да бабулі Латыфы. У Талдыкарган! На ўсё лета!

Чынгіз пагрозліва наблізіўся да сына. Кастусь інстынктыўна высунуў перад сабою бутэльку.

— Дай сюды! — Чына адабраў шампанскае і агледзеўся, куды б яго паставіць.

Толькі тут Чынгіз з Кастусём убачылі, што перагародка, за якой яны стаяць, шкляная. І па той бок шкла за іміназіраюць жанчыны, што засталіся ў зале. Кастусю гэты малюнак нагадаў фота сурыкатаў, якое нядаўна гуляла ў сеціве. Ён не вытрымаў і чмыхнуў. Чынгіз даў яму ў карак. Геула першая ачомалася і кінулася да выхаду з залы.

— Дагані і папрасі прабачэння! — загадаў Чынгіз.

Кастусь апусціў галаву, але з месца не скрануўся.

* * *

Гэтым разам падзеі разгортваліся так імкліва, што ў Мінска не заставалася часу на складаныя камбінацыі. Таму ён абмежаваўся адной простай рэкламнай акцыяй.

* * *

Ян дайшоў да Лядовага палаца і пашкадаваў пра гэта. Адзін ён ніколі так доўга не гуляў, толькі з Геулай. Ён падумваў ужо пра тое, каб вярнуцца ці, прыкладам, забурыцца ў «Аўрору» на што-небудзь са стралянінай і спецэфектамі, калі да яго звярнулася прыгожанькая дзяўчына:

— Добры дзень! Парк высокіх тэхналогій прапануе вам бясплатна пракаціцца на ровары новага пакалення! Убудаваны джыпіэс-трэкер захоўвае ваш маршрут на серверы! Айчынная распрацоўка!

— А не баіцеся, — спытаў Ян, — што я ровар скраду?

— У вас твар сумленны, — адказала дзяўчына, — а яшчэ мы ўсіх удзельнікаў акцыі фатаграфуем. І да таго ж джыпіэс-трэкер, памятаеце? Ну што, паедзеце?

— Давайце, — пагадзіўся Ян. — Потым сюды ровар вярнуць?

— Не, — пакруціла галавой дзяўчына, — сэнс акцыі ў тым, каб маладыя людзі праехалі дзесяць кіламетраў. Таму здасце каля крытай коўзанкі ў парку Горкага.

Ян сеў на ровар, усміхнуўся ў камеру, дачакаўся, пакуль яго сфатаграфуюць, і стартаваў.

Ехаць было нашмат весялей, чым ісці.

* * *

Гэля сядзела на парапеце на беразе Свіслачы і думала, што, калі б яны з Янам здымалі сюжэт пра дзяўчыну, якую кінулі, яна б зняла яго менавіта гэтак. Прыгожая, юная, у цудоўнай блакітнай сукенцы, сядзіць уся такая няшчасная і адлюстроўваецца ў вадзе. Казачная Алёнка нервова курыць ад зайздрасці.

Гэля ўявіла сабе Алёнку, якая курыць, і нават усміхнулася.

«Насамрэч усё не так і дрэнна, — пачала пераконваць сябе Геула. — Горш было б, калі б мы з'ездзілі ў Балгарыю, а разышліся потым. Толькі было б больш балюча і крыўдна».

* * *

Ян ішоў у бок метро і ўсміхаўся. Ён праляцеў да парку Горкага меней як за гадзіну. Ногі прыемна гулі, і ўвогуле настрой палепшаў. Калі ён здаў ровар і выйшаў на набярэжную, адразу заўважыў танюткую дзяўчыну ў блакітнай сукенцы, якая сядзела пад рэкламным шчытом «Маё першае слова “каханне”». Дзяўчына глядзела ў ваду.

«Ат, пайду і пазнаёмлюся!» — вырашыў Ян.

Ён прыспешыў крок.

Дзяўчына ўзняла галаву і папраўіла валасы.

Ян ледзь не грымнуўся на асфальт. Але ўсё ж такі набраўся смеласці і падышоў.

— Чаго ты тут? — спытаў ён Геулу.

— Ты што, сочыш за мной? — суха спытала Геула.

— Я? — збянтэжыўся Ян. — Ды я тут увогуле выпадкова...

— Ты заўсёды выпадкова! Куды ні прыйду, паўсюль ты!

Ян узлаваўся.

— Ды гэта ты паўсюль! Прайсці па горадзе немагчыма, усюды на цябе трапляю!

— Дык сядзі дома! — адрэзала Геула. — Гэта мой горад!

Побач з імі ўтварылася невялікая віхура, узняла з асфальта смецце, шпурнула Геуле ў вочы пясок. Яна пачала церці вочы. Ян скамянеў.

— Зараз дождж пойдзе, — сказаў ён.

— Ну і няхай.

— Прамокнеш.

— І што?

— Ну... я ўсё ж такі цябе кахаю.

Геула абурылася:

— Ян, ты здзекуешся? Ты адмыслова ўсё псуеш? Якое на халеру каханне? Ідзі праспіся!

Вакол Гэлі і Яна спешна эвакуіравалі дзіцячыя электрамабілі, гандляры ўсялякай кітайскай драбязой згортвалі свае вітрыны. Ян адвярнуўся. І таксама пачаў церці вочы, быццам і яму туды трапіў пясок. Геуле зрабілася балюча.

— Паслухай, — працягвала яна, — ты проста прыдумаў гэтае каханне. Мы столькі гадоў сябруем... У цябе былі дзяўчыны, у мяне Кастусік... быў. Навошта ўсё ўскладняць? Мы маглі спакойна таварышаваць далей, усё магло быць як раней, навошта ты ўсё сапсаваў?

Геула злавіла сябе на тым, што крычыць. Ян паспрабаваў узяць яе за руку, але яна вырвалася.

— Гэля, пойдзем у метро, зараз...

Аб асфальт ударылі першыя кроплі. Вялізныя, цяжкія кроплі першай травеньскай залевы.

Недзе грукнула, і адразу хвастанула так, што ні пра якое метро гаворкі ўжо не было. Схаваліся пад мостам цераз Свіслач і нават за тую хвіліну, што беглі, паспелі прамокнуць да ніткі.

Геула рыдала. Ян глядзеў на дождж.

— А я не хачу як раней, — сказаў ён.

І сышоў, пакінуўшы Геулу пад мостам.

Ён ішоў не разбіраючы дарогі, ішоў, не сціраючы з твару кроплі дажджу. І не бачыў, як клапатліва горад хавае яго пад галінамі дрэў. І не разумеў, што там, дзе ён ідзе, дождж замірае, і не адчуваў, што горад плача разам з ім.

* * *

Ян вярнуўся дахаты здранцвелы. У літаральным сэнсе.

Год таму ў яго раптоўна напухла дзясна. Каб лекаваць яе, стаматолагу давялося скалоць абедзве Янавы сківіцы абязбольвальным. Некалькі гадзін пасля аперацыі Ян не адчуваў палову сваёй сківіцы.

Цяпер «замарозка» авалодала ім цалкам.

Ён згадаў, што неўзабаве іспыты. Сеў рашаць задачкі па матэматыцы. Праз гадзіну зразумеў, што першы іспыт — беларуская мова, і папрасіў маці падыктаваць яму дыктоўкі. Маці далася дзіву, але пагадзілася.

Да прыходу бацькі ў яе сеў голас, маці папрасіла:

— А давай на сёння ўсё? Дый табе трэба адпачыць.

Ян паслухмяна адклаў асадку, маці ўсхвалявана паглядзела на яго і пайшла карміць мужа.

Ян пасядзеў трохі, прыслухоўваючыся да сябе.

Зубная замарозка за гэты час прайшла б ужо, і вярнуўся б тупы ныючы боль. Але цяпер ён па-ранейшаму нічога не адчуваў.

Ян нават задумаўся пра тое, каб легчы спаць, — але адразу скеміў, што так рана не засне. Ён агледзеў свой пакой і спыніў позірк на недабудаваным караблі.

* * *

Геула плакала так, што маці ўзялася паіць яе заспакаяльнымі, якія яшчэ нядаўна сама прымала на загад Альбіны. Гэля піла лекі, супакойвалася, але праз паўгадзіны пачынала рыдаць з новай сілай.

— А мне на працу, — уздыхала маці, — адпрасіцца я не магу, дзеці галоднымі застануцца. Ты без мяне адна выжывеш?

У адказ Геула рыдала з новай сілай.

— Ведаеш што! — вырашыла маці. — Збірайся! Паедзеш са мной! Дапаможаш на кухні і ўвогуле!

Сіл супраціўляцца ў Гэлі не было.

На кухні ёй сапраўды стала лягчэй. Раўці ў прысутнасці чужых было неяк няёмка, маці ўвесь час падкідвала заданні: то замясіць цеста, то пракруціць фарш. А калі набеглі дзеці і сталі з апетытам есці прыгатаванае, Геула нават пасміхнулася.

Калі плынь пражэрлівых вучняў схлынула і надышоў час гатаваць паўфабрыкаты на заўтра, маці асцярожна спытала:

— Гэта праз Кастуся?

Гэля апусціла галаву.

— Паслухай, — сказала маці, — калі гэта сапраўднае, то вы адно ад аднаго нікуды не падзенецеся. Не цяпер, дык праз пару гадоў.

Гэля ўсхліпнула.

— Ну а калі несапраўднае, дык не шкадуй, — працягвала маці, — недзе цябе чакае тваё каханне, твая гісторыя.

— А калі не? — спытала Гэля.

— Так не бывае, — сказала маці, — толькі трэба не баяцца.

Маці задумалася, зляпіла некалькі катлет, а потым з цяжкасцю прамовіла:

— Ведаеш, я тут падумала... Напэўна, табе сапраўды лепей паехаць у Маладзечна.

Геула замерла.

— У сэнсе? — спытала яна.

— Праўда, — працягвала маці, — Маладзечна — гэта неблагі варыянт. Мінск побач, калі захочаш, можаш хоць штодня дахаты ездзіць. Затое ў цябе будзе сваё жыццё. Воля.

Геула зразумела, што не дыхае. Акуратна зляпіла чарговую катлету і паклала на бляху.

— Чаму маўчыш? — спытала маці.

— Значыць, ты мяне гоніш? — сказала Геула.

— Гэля, ты што? — спалохалася маці. — Не хочаш, заставайся!

Гэля ледзь стрымлівала слёзы.

— Геула, прабач! — усхвалявалася маці. — Я хацела як лепей. Я проста не хачу цябе трымаць. Але ты не мусіш заставацца дзеля мяне, у цябе павінна быць сваё жыццё.

Тут Гэля зноў расплакалася.

— Я вельмі цябе люблю, — сказала маці, — але, ведаеш, я спалохалася, што калі ты надумаеш жыць са мной да смерці, каб мне не было самотна, дык я, бадай, цябе выганю. І годзе раўці, перасоліш катлеты.

Геула хлюпнула носам і паспрабавала выцерці вочы. Але рукі былі ў фаршы.

— Вось табе і маеш, — сказала маці, — нельга гатаваць і плакаць адначасова. Тэхніка бяспекі.

* * *

Ян прабавіў увесь дзень з тым жа пачуццём глыбокай замарозкі.

Зранку, праўда, было нейкае падабенства эмоцыі — калі ён прачнуўся і ўбачыў на стале скончаную мадэль лінкара. Але потым прыгадаў, што сам учора да ночы яе даклейваў, і абыякавасць вярнулася.

У школе дзейнічаў аўтаматычна. Казалі рашаць — рашаў. Дыктавалі — запісваў. Сказалі ісці дахаты — пайшоў.

Зноў убачыў лінкар на стале, і зноў нешта зварухнулася ў душы. Ян вырашыў, што пачуццё гэтае найхутчэй прыемнае. Нешта кшталту палёгкі. «Дарабіў нарэшце, — падумаў ён, — палепшала».

Калі маці вярнулася з рынку, яна ўбачыла сына пасярод пакоя. Паліцы і высунутыя шуфлядкі былі напалову пустыя. Побач з Янам грувасціліся дзве кучы рэчаў. І яшчэ адна маленькая, на тахце.

— Што ты робіш? — здзівілася маці.

— Во гэтыя рэчы даўно трэба выкінуць. Гэтыя пакінуць. А во гэта, — ён кіўнуў на тахту, — трэба дарабіць.

Маці прыгледзелася.

— Гербарый? Ты збіраешся дарабляць гербарый, які пачаў збіраць у пятым класе?

— Ага.

— А навошта?

— Я мушу.

Маці не прыдумала, што адказаць. Ян узяў з паліцы чарговую кнігу — «Зброя рымскай пяхоты», пагартаў і шпурнуў у кучу на выкід.

— Можа, кнігі не выкідаць? — прапанавала маці. — У бібліятэку аддадзім...

— Добра, — пагадзіўся Ян і ўзяўся выцягваць з кучы асуджаных рэчаў кнігі.

Маці назірала за гэтым з дзіўным пачуццём — быццам прысутнічала пры нейкім рытуале. Напрыклад, на пахаванні.

Яна спалохалася, страпянулася і прапанавала:

— Пакетаў прынесці?

Ян кіўнуў.

* * *

Гэля з маці размаўлялі паўночы. Мама невядома як раніцой прачнулася, а Геула праспала да апоўдня. Сядзець дома было нясцерпна. Яна сабралася і паехала да маці на працу.

На кухні было весела. Спачатку Геула ўвогуле не зразумела, што адбываецца, таму што чалавек дваццаць падлеткаў гадоў дванаццаці запоўнілі сабою ўсю прастору.

— У вас абед? — спытала Гэля.

— У нас гісторыя! — адказала нейкая дзяўчынка.

— А! — сказала Геула і паспрабавала адшукаць вачыма маці.

А маці тым часам вылезла з-пад стала. Выявілася, што там, на зэдліках, стаялі бляхі з кексамі, якія ўся гэтая плойма па чарзе ўпрыгожвала.

— Што здарылася? — спытала Гэля.

— Ды гісторык трапіў у ДТЗ*, не здолеў прыехаць на заняткі. А яны ўсе прыйшлі да мяне на кухню. І мы прыдумалі спячы кексы.

— Цётачка Ліза, а калі будзе гатова?

— Першая партыя праз пяць хвілін!

— Цётачка Ліза, а яшчэ пра цеста раскажыце!

— Цётачка Ліза, а можна я маме адзін аднясу?

— Цётачка Ліза, а кіньце рэцэпт у групу, мы дома таксама прыгатуем.

Бразнула духоўка, першыя кексы былі ўрачыста выцягнутыя, пастаўленыя на стол, і дзеці пачалі гіпнатызаваць іх вачыма.

* Дарожна-транспартнае здарэнне.

— Яны гарачыя не такія смачныя, — паспрабавала патлумачыць Геула, але яе перапыніў аднадушны крык.

— Ну мы толькі адзі-і-ін...

— Толькі кава-а-алачак...

У кухню ўварваўся ўзмакрэлы гісторык.

— Аёй, Ліза, дзякуй вам вялізны, вы ўсіх выратавалі, але цяпер мы можам пачынаць заняткі...

— Не! — аднагалосна сказалі дзеці. — У нас кексы! Мы іх рабілі самі! Яны яшчэ не гатовыя!

Скончылася ўсё тым, што гісторыя прайшла проста на кухні, кексы даваліся найлепшым выступоўцам, і ўсе пагадзіліся, што ў іх яшчэ ніколі не было такіх прадуктыўных заняткаў, хоць яны былі ўдвая карацейшымі, чым звычайна.

Геула сядзела ў куточку і назірала за тым, як міма яе праходзіць жыццё.

* * *

Замарозка не адпускала Яна. У нечым гэта было зручна: пакуль іншыя псіхавалі наконт іспытаў, ён быў як удаў. Не, да іспытаў ён таксама рыхтаваўся — паводле строгага графіка прасіў маці дыктаваць яму то рускую, то беларускую мовы, рашаў задачы.

Аднак уся гэтая падрыхтоўка, як выявілася, займае зусім няшмат часу, калі не псіхаваць.

Таму Ян метадычна дабіваў «хвасты».

Даклеіў гербарый са струхлелых лістоў — і выкінуў.

Дачытаў «Дон Кіхота» — і вярнуў у бацькоўскую шафу.

Дапісаў сцэнарый — і выдаліў файл, бо тэкст атрымаўся нудны.

Дайшоў да таго, што пачаў перапрасоўваць свае кашулі. Маці заўважыла гэта, у чарговы раз памацала лоб сына і нязвыкла цвёрдым голасам прамовіла:

— Ідзі пагуляй! Перад іспытамі трэба праветрыць галаву!

Ён моўчкі пайшоў — ад гэтага маці яшчэ болей захвалявалася.

Ужо на дварэ зразумеў, што надышло сапраўднае лета. Яшчэ не ліпень, калі горад распальваецца да тэмпературы духоўкі, але куртку з сабою ўзяў дарма. Куды ісці, Ян не ўяўляў. І тут яму на вочы трапілася групка аднакласніц, сярод якіх была і Жанна.

«Я ж абяцаў яе зняць», — згадаў Ян і пайшоў напярэймы дзяўчатам.

— Жанна! Хадзем са мной! — загадаў ён.

Аднакласніцы, якія да гэтага неразборліва гаманілі, умомант сціхлі.

— Але я не магу, — разгубілася Жанна. — Заўтра іспыт... дыктоўка...

— Пагатоў, — сказаў Ян. — Перад іспытам трэба праветрыць галаву!

Жанна жаласна паглядзела на сябровак. Яны адказалі позіркамі, у якіх здзіўленне змагалася з зайздрасцю. Жанна вагалася:

— Ну... я не ведаю...

Ян моўчкі ўзяў яе за руку і павёў за сабою.

Калі б ён азірнуўся, то ўбачыў бы, што ў позірках дзяўчат зайздрасць канчаткова перамагла.

— А што мы будзем рабіць? — спытала Жанна.

— Здымаць відэа. Я ж абяцаў.

— Аёй... Я касметыку не ўзяла.

Ян згадаў пласт тынкоўкі, які Жанна нанесла на сябе мінулым разам.

— Не трэба, — цвёрда сказаў ён.

Яны працавалі дзве гадзіны без перапынку. Толькі аднойчы Жанна адпрасілася ў прыбіральню. Калі Ян нарэшце сказаў: «Усё», — Жанна ледзь стрымала шчаслівы ўздых.

— Дзякуй, — сказала яна і нерашуча ўстала з камп'ютарнага крэсла.

Але чамусьці нікуды не пайшла.

— Далей я сам, — насупіўся Ян. — Ідзі ўжо.

— Ага, — адказала Жанна, потым набралася смеласці, пацалавала Яна ў шчаку і сышла.

Ян сеў праглядаць тое, што зняў. Ніякіх ідэй не ўзнікала. Жанна амаль увесь час намагалася пазіраваць, і выглядала гэта жахліва.

«Як я зрабіў мантаж таго роліка з Геулай?» — раптам задумаўся Ян.

І зразумеў, што ён не памятае. Усе ролікі пра аднакласніц, якія ён рабіў перад Гэліным, больш-менш засталіся ў памяці. Але апошні, Гэлін... Такое адчуванне, быццам ён сам зрабіўся, без асаблівага ўдзелу Яна.

«Можа, — падумаў ён, — усё дзякуючы музыцы? Я тады саўндтрэк падабраў удалы, кадры самі на яго ляглі».

Ён пачаў шукаць музыку, а мозг упарта намагаўся дакапацца: як жа быў зроблены мантаж таго нашумелага роліка? Замест гэтага згадвалася ўсялякае іншае: першае «сіямскае» відэа; ідэя зрабіць серыю; здымкі ў крамах і цырульні... і гэтак далей да апошняга інтэрв'ю з конямі ў Верхнім горадзе.

Пасля інтэрв'ю было нешта яшчэ, але тут мозг раптам заклініла, і Ян вярнуўся да рэальнасці.

Як выявілася, увесь гэты час рукі працавалі незалежна ад яго. Яны выдалілі тыя фрагменты, дзе Жанна «выяўляла пачуццё». Засталіся толькі самы пачатак, кавалак, дзе Жанна адпрошваецца ў прыбіральню, і дзясятак хвілін у самым канцы, калі «мадэль» стамілася вырабляцца.

Цяпер Ян усё зразумеў. З пакінутага матэрыялу выбудоўваўся даволі зразумелы вобраз. Жывы і сапраўдны. Толькі музычку трэба было знайсці сапліваю.

Да вячэры паўхвілінны ролік быў гатовы.

Жанна атрымалася вельмі арганічная: трошкі напалоханая і збянтэжаная. І яшчэ выявілася, што, калі яна ўсміхаецца, у яе з'яўляюцца вельмі сімпатычныя ямачкі на шчоках.

Ян заліў ролік на свой канал у рэжыме «Доступ толькі па спасылцы» і даслаў спасылку Жанне.

* * *

Іспыты падкраліся незаўважна.

Геула, напэўна, магла ўгледзець нешта падазронае каля школы, але не ўгледзела. Яна не заўважыла тэлевізійную машыну і не звярнула ўвагі на тое, што ніхто не тоўпіцца з цыгарэтамі за рагом.

І калі перад вахтай на яе накінулася здымачная група, гэта стала для яе неспадзяванкай.

— А вось і Геулачка, — зашчабятала Аксана Віталеўна, — давайце хутка яе здымем, бо ў яе іспыт праз паўгадзіны.

— Што? — збянтэжылася Геула.

Аператар засяроджана паглядзеў на дзяўчыну з мікрафонам.

— Святла не стае, — сказаў ён, — пастаўце яе каля акна.

— Як вы сказалі дзяўчыну завуць? — пацікавілася карэспандэнт.

— Геула — старажытнае беларускае імя, — вокам не змаргнуўшы, адгукнулася Аксана Віталеўна.

— Што? — зноўку спытала Геула.

— Значыць так, — паныла сказала дзяўчына, гледзячы ў аркушык, — я зараз спытаю ў цябе, ці прыходзілі ў ваш клас газеты па падпісцы, ты скажаш, што не, потым я запытаю, да каго ты пайшла з ідэяй, што трэба разумна распараджацца школьным бюджэтам, ты скажаш, што да... да...

— Аксана Віталеўна мяне завуць, — падказала завуч.

— Што? — спытала Геула, якая пачувалася ачмурэлым папугаем.

— Давайце спачатку вас здымем, — сказала дзяўчына і адвярнулася ад Геулы.

Аксана Віталеўна прамяніста пасміхнулася і ўстала ў святло.

— Пагналі, — закамандаваў аператар, — толькі вы ў камеру не глядзіце. Люся, адыдзі. Паспрабуй з іншага боку. Не лезь у камеру. Мікрафон ніжэй. Усё, пагналі.

— Распавядзіце пра вашу ініцыятыву, — прачытала Люся па аркушыку.

— Я намеснік дырэктара ўжо шмат гадоў, і я добра ведаю, як важна падтрымліваць ініцыятыву дзяцей і бацькоў. Таму, калі да мяне падышлі бацькі і прапанавалі разумна выдаткоўваць грошы нашай

школьнай апякунскай рады, я, безумоўна, выслухала іх вельмі ўважліва. Насамрэч праз тое, што класы дзейнічалі няўзгоднена, бо не было агульнай, так бы мовіць, палітыкі, выходзіла, што шматлікія друкаваныя выданні дубляваліся, а гэта непрадумана.

— Гэта вы кажаце пра так званую абавязковую падпіску? — удакладніла Люся.

— Менавіта «так званую», — сказала завуч. — Праблема ў тым, што за многія гады склалася меркаванне, быццам падпіска з'яўляецца абавязковай, але насамрэч мы здолелі, так бы мовіць, абараніць сваю пазіцыю, нават калі давялося дзесьці адстойваць свае погляды і нават у нечым супярэчыць непасрэднаму начальству...

— Так, во гэтага не трэба, — сказала Люся.

— Добра, — лёгка пагадзілася Аксана Віталеўна, — значыцца... м-м-м... трэба ўмець браць на сябе адказнасць і не баяцца ініцыятывы.

— Але ж вам давялося сутыкнуцца з супраціўленнем?

— Так, але мы былі перакананыя, што маем рацыю, і, як бачыце, праўда аказалася на нашым баку. І мы будзем спадзявацца, што рэформы школьнай адукацыі...

— Так, рэдактар прасіў пра рэформы не згадваць.

— Добра, — згадзілася завуч, — а пра станоўчую дынаміку ў развіцці можна?

— Пра дынаміку, напэўна, можна, — няўпэўнена сказала Люся, — але давайце не будзем. Так, Галіна, хадзі сюды.

— Я Геула, — скрозь зубы сказала Гэля, у якой ад абсурднасці таго, што адбывалася, пачало торгацца вока.

— Спадарыня, давайце хутчэй, нам яшчэ ў тры школы ехаць, — пакрыўдзілася Люся, — станьце каля акна. Пытанне: ці падабаецца вам навучацца ў такой прагрэсіўнай школе, дзе кіраўніцтва з гэткім захапленнем... Не. Давай яшчэ раз. Ці падабаецца вам навучацца ў школе, дзе кіраўніцтва з такой увагай ставіцца да ўсіх ініцыятыў знізу?

Геула ў думках далічыла да пяці.

— Я хачу сысці адсюль, — сказала яна.

— Куды? — спалохалася Люся.

— У тэхнікум, — адказала Гэля, — усё, у мяне іспыты пачаліся, я пайду.

— Ідзі, Геула, поспехаў табе, — праспявала ёй наўздагон Аксана Віталеўна. — Во бачыце, мы і тут на перадавой, нашы ўрокі працоўнага навучання, як і прасіў новы міністр адукацыі...

— Пра міністра не трэба.

— Добра. Мы адкрытыя ўсім новым павевам, і нашы ўрокі працоўнага навучання падштурхоўваюць дзяцей да таго, каб яны авалодвалі спецыяльнасцямі, патрэбнымі для народнай гаспадаркі...

Геула павярнула за рог і ўпялася лбом у сцяну. «Добра, спачатку напішу дыктоўку. А што гэта было, высветлю потым», — падумала яна.

* * *

Геула зайшла ў клас адной з апошніх, і спачатку ёй падалося, што яна трапіла не туды.

Вокны былі разнасцежаныя, а клас рагатаў, лежачы на партах.

Вялізны тэлевізар, па якім павінны былі абвясціць нумар дыктоўкі, паказваў «Смяшарыкаў». Дзевяцікласнікі дурэлі.

Настаўніца беларускай мовы кіўнула Геуле.

— Сядай. Яшчэ дзесяць хвілін.

Геула села. Ліміт здзіўлення на сёння быў вычарпаны.

Дыктоўка прайшла хутка і лёгка. Клас быў праветраны, настаўніца дыктавала цудоўна.

— Галоўнае — расслабцеся і слухайце, — сказала яна ў самым пачатку. — Мова сама пальецца вам у вушы. Калі нешта незразумелае, запытайцеся ў мяне, не чапайце суседзяў. І памятайце — усё будзе добра!

— Добра табе, на цябе за адзнакі не сварацца, — уздыхнула Смірнова, здаючы дыктоўку. — Хадзем у піцэрыю? Мы ўсе ідзём, будзем там чакаць, пакуль правераць.

— Я даганю, — сказала Геула і пайшла шукаць класную.

Святлана Фёдараўна сядзела ў сваім кабінеце.

— Што гэта было? — з месца ў кар'ер пачала Геула. — Тэлебачанне, падпіска, я нічога не зразумела.

Святлана Фёдараўна чмыхнула.

— Разумееш, — сказала яна, — учора выйшла чарговая пастанова аб барацьбе з карупцыяй і выявілася, што падпісвацца было не абавязкова, а прыдумалі гэта злосныя дзядзькі з упраўлення адукацыі. Цяпер дзядзькоў пакараюць, а Аксана Віталеўна ў нас герой і змагар за справядлівасць. Таму маме прывітанне.

— Ат халера! — выдыхнула Геула. — Значыць, яна цяпер яшчэ і герой!

— Ты не турбуйся, — сказала класная, — праз месяц выйдзе новая пастанова, і яшчэ нешта прыдумаюць. Але Аксана Віталеўна не загіне. У любым выпадку.

— Значыцца, — скеміла Геула, — яна сваю скаргу на маму не па дабрыні душэўнай забрала!

— А яна забрала? — здзівілася настаўніца.

— Так! Пару тыдняў таму!

— Ну так, — кіўнула Святлана Фёдараўна, — якраз тады пайшлі чуткі, што падпіску забароняць.

— Мама сказала: «Малайчына, добры чалавек», — працягвала Гэля, — а Аксана, відаць, проста спалохалася, што журналісты пранюхаюць — і як гэта будзе выглядаць.

— Ну, можа, і так, — пагадзілася класная. — У кожным разе ўсё добра, што добра сканчаецца.

* * *

Падчас іспыту Ян канчаткова ацаніў вартасць свайго цяперашняга замарожанага стану. Дыктоўка. Ян слухаў і пісаў. Наконт правілаў не пераймаўся — настаўніца старанна прамаўляла кожную літару. А гэта ж беларуская мова: як чуецца, так і пішацца.

Спакойна дапісаў, спакойна здаў працу — і больш іспыт для яго не існаваў. Ян падышоў да Жанны і спытаў:

— Ну як?

— Я, здаецца, напартачыла, — жаласна адказала тая. — Слухай, ці патрэбны мяккі знак у слове «булён»?

— Ды якая розніца, — пацепнуў плячыма Ян. — Ты ролік бачыла?

— Ролік? Ах, ролік! Не яшчэ.

— Пабачыш — свісні.

І сышоў. Адным вокам, праўда, заўважыў, з якой цікаўнасцю сочаць за ім дзяўчаты.

Дома паведаміў маці, што ўсё нармуль, і адразу папрасіў падыктаваць рускую мову.

— Янчык, — папрасіла маці, якая была вельмі занятая — чухала котку за вухам, — ты б адпачыў, га?

— Ды я не стаміўся. Чаго стамляцца? Дзве старонкі тэксту напісаў.

— Ну... хваляваўся ж.

— Не.

Маці ўздыхнула, зняла з каленяў вельмі незадаволеную Нору і пачала дыктаваць. Нора расчаравана забралася пад стол і, каб неяк прабавіць час, стала хапаць Яна за пяткі. Атрымала нагой па пузе, пакрыўдзілася і некуды сышла.

Праз паўгадзіны, маці на радасць, у Яна зазваніў тэлефон.

— Ян, — дзіўным голасам сказала Жанна, — гэта дакладна я?

Ян хутка праверыў *YouTube*.

— Дакладна. А што не так?

— Ну... — слухаўка ўздыхнула, — хіба я такая?

— Табе не даспадобы? — здзівіўся Ян, які запусціў ролік без гуку, але ніякіх праблем пакуль не бачыў.

— Не тое каб... Але я... Нічога, прабач, пакуль!

Ян паклаў слухаўку і спытаў маці:

— Скажы, падобная да Жанны?

— Я тваю Жанну мала ведаю... — адказала маці. — А запусці спачатку. Толькі з гукам.

Ян запусціў. Маці дагледзела да канца і пагладзіла яго па плячы.

— Янчык, — сказала яна, — скажы шчыра: калі здымаў, пра Геулу думаў?

Ян адчуў, што ледзяны панцыр, у які ён быў увесь гэты час закаваны, даў расколіну.

— Калі рабіў мантаж, — адказаў ён.

— Ты б ёй патэлефанаваў, га? Яна чакае...

Анестэзія ўмомант скончылася. Ян падскочыў і выгукнуў:

— Нічога яна не чакае! Ёй на мяне пляваць! Я ёй усё сапсаваў! А яна... бяздушная! І годзе ўжо лезці да мяне! Я, можа, адзін пабыць хачу!

Ян выскачыў у калідор, схапіў красоўкі і ціха заскуголіў — шнуркі былі пашкуматаныя кацінымі зубамі.

— Мраўзь! — зларадна сказала Нора з глыбіні антрэсоляў.

* * *

Іспыты праляцелі незаўважна. За чатыры гадзіны матэматыкі ўсе паспелі зрабіць абодва варыянты і некалькі разоў параўнаць адказы. Рускую мову дыктавалі цудоўна, а на месцы двукроп'я настаўніца зрабіла такія страшныя вочы, што памыліліся толькі тыя, хто паставіў там працяжнік.

Агулам усё прайшло ў працоўным рэжыме, семдзесят адсоткаў навучэнцаў пацвердзілі сваю гадавую адзнаку, дваццаць адсоткаў палепшылі, і толькі дзесяць пагоршылі, што шчасліва супала з дапушчальнай статыстыкай, якую даслалі яшчэ да іспытаў.

Геула ўсё ніяк не магла вызначыцца, ці пойдзе яна на выпускны. З аднаго боку, меркаваная пра-

грама з закупамі гарэлкі і патаемным пераносам яе на цэнтралізаваны пікнік не цешыла. З іншага боку, стасункі з аднакласнікамі нармалізаваліся, чаму не схадзіць, пагатоў піць супраць волі яе ніхто прымушаць не будзе, а з гэтымі людзьмі яна можа больш ніколі не пабачыцца. Геула дакладна пастанавіла з'ехаць з Мінска.

Яны некалькі разоў абмеркавалі ўсё з маці і выпрацавалі некалькі планаў на выпадак паступлення ці правалу.

Маці была вельмі лагодная. На новай працы яна гатавала такія абеды, што да яе панадзіліся хадзіць і выкладчыкі. Некаторыя бацькі, прыязджаючы па дзяцей, цікавіліся, ці не засталося чагосьці смачненькага. Чына бурчаў, што ён патаўсцеў на паўтара кілаграмы і што неўзабаве да яго ў цэнтр дзеці будуць запісвацца не дзеля рэпетытараў, а каб пажэрці.

Геула бачыла, што з маці ўсё добра, можна пакідаць яе адну. Але, вядома ж, Гэлі было страшна. Увесь час снілася дзіўнае. Сёння, напрыклад, што яна стаіць на «дзясятцы» і зараз скочыць. Некалі яна займалася скокамі ў ваду і больш за ўсё любіла глядзець на сінхрон. Як двое наскокваюць, штурхаюцца, ляцяць — і ўсё гэта ідэальна аднолькава. Сама яна, колькі ні скакала, не магла такой сінхроннасці дамагчыся ні з кім. Толькі ў сне поруч з ёю ўвесь час нехта быў. Яна бачыла яго бакавым зрокам, яна адчувала, што ён наскоквае побач з ёю, дакладна паўтараючы яе рухі. Ці яна паўтарала ягоныя? Але сон перапыняўся пры ўваходзе ў ваду, і ў яе не атрымлівалася падглядзець, хто ж вынырне каля яе ў басейне? І ці вынырне?

* * *

Ян збіраўся на выпускны засяроджана, можна сказаць, апантана. Паўгадзіны мыўся, адшукаў на шчоках валаскі, згаліў татавай брытвай (парэзаўся, вядома ж). Схадзіў у цырульню, кінуў:

— Пад нуль!

Дзяўчына з нажніцамі паглядзела на яго так жаласна, што ён злітаваўся:

— Добра, проста як мага карацей!

Дома знайшоў падраныя джынсы, якія ні разу не апранаў. Маці набыла іх летась, калі кожны трэці хадзіў, як элітны жабрак. Тады Ян прынцыпова адмовіўся быць як усе, а цяпер — прынцыпова паставіў пайсці ў падраных, а не ў маднявых у гэтым сезоне слаксах.

Норы порткі вельмі спадабаліся, яна ганялася за ніткамі, што тырчалі з іх, і падрапала Яну нагу.

З боку магло падацца, што Ян імкнецца на выпускны, каб сустрэцца з любымі аднакласнікамі (як мінімум — з якой-небудзь адной любай аднакласніцай), але насамрэч ён проста мусіў нечым сябе заняць. Той тыдзень «замарозкі» даў моцную аддачу. Падчас іспытаў ён скіроўваў неўтаймоўную энергію на падрыхтоўку, а цяпер — на зборы да выпускнога.

Але калі дайшоў да школы, выявілася, што мэта дасягнутая, і?..

Ужо ў сярэдзіне ўрачыстага сходу Ян зразумеў, што зараз яго разарве на часткі. Ён ціхенька пракраўся да выхаду з залы, дзе натрапіў на аднаго з настаўнікаў. Здаецца, з малодшых класаў.

— Мне ў прыбіральню, — шэптам сказаў Ян, хапаючыся за жывот.

— А сэнс? — ціха адказала настаўніца. — Усё адно на ўсіх выхадах са школы завучы.

Ян уздыхнуў і вярнуўся на месца. Ён пацішу выцягнуў тэлефон і ганяў шарыкі, пакуль побач не намаляваўся злосны фізрук. Давялося слухаць, як дырэктар прамаўляе пра «важны этап у біяграфіі» і «мы аддалі вам найлепшае».

«І нічога не пакінулі сабе», — у думках дадаў Ян.

* * *

Геула сядзела ў зале і глядзела на святочна апранутую Аксану Віталеўну. Тая ажно свяцілася ад гонару за школу, за сябе і за ўсё на свеце. Прычоска была старанна ўкладзеная ў цырульні, бровы не менш старанна намаляваныя, дзелавы гарнітур цёмнаружовага колеру дапаўняў ідэальны манікюр.

— Цікава, іх каліброўць ва ўпраўленні адукацыі? — з'едліва спытала маці. — Усе на адзін твар.

Геула пацепнула плячыма. Яна падумала пра тое, што павінна Аксану Віталеўну ненавідзець. А яна нічога не адчувае. Немагчыма ненавідзець чалавека, які пусты знутры. Стаіць лялька, пасміхаецца. Лялька абыякавая да навакольнага свету. Лялька заклапочаная толькі тым, як выжыць самой. Скажуць здрадзіць — яна здрадзіць. Скажуць любіць — будзе любіць. Скажуць, што можна быць вольнымі, — усім паведаміць, што можна быць вольнымі. А сама будзе занатоўваць і запамінаць на выпадак, калі вецер ізноў зменіцца. А потым першая скажа начальству, хто і што рабіў падчас волі. Складана ненавідзець асобу, якая не існуе. Складана ненавідзець гарнітур, бровы і манікюр.

— Дарагія дзеці! — сказала Аксана Віталеўна ў мікрафон. — Я вельмі радая, што на нашым сённяшнім свяце прысутнічае пачэсны госць — намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі нашага раёна...

— Я пайду, — сказала Геула маме.

* * *

Ян ледзь прычакаў канца ўрачыстай часткі, але паратунку не было: іхні дзявяты «Б» пад «канвоем» загналі ў аўтобус, дзе тройчы пералічылі па галовах. Адзіная радасць: пакуль ехалі, ніхто не замінаў таропіцца ў тэлефон. У Лагойску, нарэшце, падлеткам дазволілі разысціся па альтанках, але і там не давалі ім спакою.

Толькі пад вечар настаўнікі і сябры бацькоўскага камітэта разняволіліся, і Янавы аднакласнікі павыцягвалі з заначак пляшкі, якія адразу пайшлі па коле.

Ян раптам зразумеў, што гэтае баляванне нічым не адрозніваецца ад урачыстых прамоў і паказушнага канцэрта. Проста так прынята. Дырэктар кажа пра «важны этап», школьнікі кантрабандай прыцягваюць бухло і п'юць. Ані слова не кажучы, Ян павярнуўся і пайшоў прэч.

— Ты чаго, сябро?! — крыкнуў нехта яму ў спіну, але іншы, больш цвярозы, запярэчыў:

— Ды няхай ідзе! Нам болей застанецца.

Метраў праз дваццаць Ян пачуў трэск галля і азірнуўся. Ламаючы кусты, на яго бегла Жанна. Яна так расчырванелася ад свежага паветра і піва, што нават на адлегласці адчувалася гарачыня.

— Аёй! — ненатуральна здзівілася Жанна. — Ты тут? І я тут! Во супала!

Жанна зачапілася абцасам за броўку дарогі і паляцела проста Яну ў рукі. Ён яе, вядома ж, злавіў, але складзеныя ў трубачку вусны праігнараваў.

— Нюша! — сказаў ён. — Ты вельмі добры чалавек...

— Сам ты Нюша! — залямантавала Жанна. — Мог бы ўжо і вывучыць, як мяне завуць! Пасля ўсяго, што паміж намі было!

— А што было? — ачмурэў Ян.

— Ты... Як ты... — Жанка ад абурэння насупілася і стала страшэнна падобнай да мульцяшнай Нюшы.

Ян намагаўся не зарагатаць.

— Кароціч, ты ж прыгожая дзяўчына, а калі цябе памыць і прычасаць, дык увогуле агонь, — сказаў ён.

Жанна адштурхнула Яна, адбеглася на пару крокаў, але, зразумеўшы, што сцэна не завершаная, вярнулася і дала яму поўху. Пасля чаго ганарліва сышла. Ужо не праз кусты, а сцяжынкай.

Ян выцягнуў з кішэні тэлефон.

— Мама, ты на машыне? Забяры мяне адсюль, га?

* * *

Гэтым разам Мінск пастанавіў грунтоўна падрыхтавацца. Ён задзейнічаў дзясяткі людзей і мноства арганізацый.

* * *

На ўездзе ў горад Янавай маме патэлефанавалі з працы. Нечакана з'явілася праверка і патрабавала прысутнасці бухгалтара. Маці высадзіла Яна каля метро, а сама памчалася разбірацца.

Ян пачаў ужо спускацца ў пераход, але спыніўся.

Яму падалося, што ён ізноў сустрэнецца з Геулай. Больш за тое, яму прымроілася, быццам нехта спецыяльна хоча іх звесці.

«А трасцы табе! — сказаў Ян у думках. — Я вольны чалавек!»

На родны Захад ехаць было нельга. Там верагоднасць натрапіць на Гэлю павялічвалася. Ян выйшаў з перахода і пайшоў у бок ад праспекта. Ісці яму неўзабаве надакучыла, і Ян вырашыў пад'ехаць.

«На першым-лепшым транспарце, — падумаў ён, — да канцавога».

Побач якраз спынілася 91-я маршрутка, якая ішла проста да дома Геулы. Ян усміхнуўся і перайшоў на процілеглы бок, дзе паспяхова сеў у тралейбус, які ішоў у Зялёны Луг. Там Геула не магла з'явіцца ні пры якім раскладзе.

* * *

Геула пастанавіла сёння нікуды не хадзіць. Застацца дома. Каб ізноў не натрапіць дзе-небудзь на Яна.

Яна пратрымалася гадзіну. Потым зразумела, што яе зараз разарве на тысячу маленькіх аскепкаў. Арганізм патрабаваў руху, змены малюнка і свежага паветра. Але ісці гуляць было страшна. Менавіта сёння горад узмоцнена патруляваўся міліцыяй, адлоўлівалі выпускнікоў-бадзяк.

І тут Гэля прыгадала, што з суседняга пад'езда ёсць выхад на дах. Яна схапіла кофту, тэлефон і пайшла туды.

На свежым паветры стала лягчэй. Дах цёплы, вецер слабы, а від на горад — цудоўны. Гэля села, прыхілілася да нейкай трубы і замерла, разглядаючы, як плывуць, змяняючы колер, аблокі, як смешна мільгацяць унізе машыны, як змяняецца колер дрэў — ад чорнага да смарагдавага, калі на іх трапляе сонечны прамень.

— Я люблю цябе, Мінск, — ціха сказала Геула.

«Тады вер мне!» — прашапацеў вецер.

Геула сцепанулася і азірнулася.

— Не рабі гэтага! — сказала жанчына са спалоханымі вачыма.

— Чаго? — здзівілася Геула.

— Я твая суседка, — сказала жанчына, — давай мы разам паціху пойдзем уніз.

— Ды не хачу я ўніз! — сказала Гэля. — Я хачу тут пасядзець...

Жанчына напружылася, а Геула скеміла, чаго яна так баіцца.

— Я не збіраюся скакаць, — сказала яна, — праўда.

— Давай мы паціху, паволі пойдзем уніз...

Гэлі падалося, што суседка трохі не ў сабе.

— Ды я вам тлумачу... — пачала казаць Геула, але жанчына яе не чула.

Яна ўчапілася ў Гэліну руку і залямантавала:

— Калі ты будзеш скакаць, я скочу разам з табою!

— Божа мой! — спалохалася Гэля і паспрабавала адчапіць ад сябе пільную жанчыну, ды дзе там.

Давялося ісці разам з ёю назад у пад'езд. Павольна і акуратна, таму што цётачка ўвесь час паслізгвалася і вісла ў Гэлі на руках.

А калі яны спусціліся на першы паверх, у пад'езд уварвалася пара бадзёрых міліцыянтаў.

— Дзякуй, што прыехалі! — загаласіла суседка. — Вось яна! Ледзь угаварыла яе з даху злезці! Да чаго нашых дзяцей давялі інтэрнэтам, га?

Геула села на прыступкі і закрыла рукамі твар.

* * *

Як выявілася, у Зялёным Лузе быў сапраўдны лес. Ян тут ніколі раней не бываў, таму гуляў са шчырай цікаўнасцю. З нагоды добрага надвор'я на кожнай дзялянцы дымілася вогнішча, пахла шашлыком. Раз-пораз сустракаліся матулі з вазочкамі. Ідылія.

Ян разняволіўся, заўсміхаўся і здрыгануўся, пачуўшы выкрутасістыя мацюкі. Дужы дзязька, расчырванелы ад спіртнога, тлумачыў напалоханай дзяўчынцы, што ёй тут не месца. З прыстойных слоў Ян разабраў толькі «ты» і «дахаты».

— Не лайцеся! — папрасіў ён мужыка. — Тут дзеці, жанчыны...

Мужык умомант пераключыўся на Яна і выказаўся ў тым сэнсе, што Ян яшчэ малы крытыкаваць старэйшых.

Ян узлаваўся і паслаў «старэйшага» туды, дзе таму было самае месца.

На гэтым перамовы скончыліся, чырванаморды схапіў Яна за кашулю і пачаў трэсці. Ян паспрабаваў вызваліцца, але не ўтрымаў раўнавагу. Яны пакаціліся па зямлі, бязладна спрабуючы выцяць адзін аднаго.

Разнялі іх патрульныя.

Ян і дзядзька цяжка дыхалі і вінавацілі адзін аднаго:

— Гэты псіх на мяне накінуўся!

— Гэта ты накінуўся!

Сяржант крыкнуў:

— Ціха! Абодвух забіраем!

І тут падала голас дзяўчынка:

— Адпусціце тату, ён не вінаваты! Гэты хлопец тату біць пачаў.

— Выпускны адзначыў? — спытаў сяржант у Яна. — Ану дыхні!

Ян узнагародзіў дзяўчынку пагардлівым позіркам і дыхнуў.

— Дзівосы, — сказаў сяржант, — не пахне. Напэўна, дрэні якой наглытаўся. Значыць, спачатку ў наркалогію.

* * *

Калі ў дзверы прыёмнага пакоя ўвялі Яна, Геула не здзівілася. Не здзівіўся і Ян.

Яны сядзелі побач і глядзелі на пафарбаваную сцяну.

— Ну што, зноўку я за табою шпіёню? — спытаў Ян.

Геула пакруціла галавой. Размова не клеілася.

* * *

Потым іх везлі ў апорны пункт, каб перадаць бацькам. Тэлефон Гэлінай маці быў адключаны, а да бацькоў Яна ўвогуле немагчыма было дазваніцца. Іхнія тэлефоны не падавалі прыкмет жыцця. Міліцыянты не здзівіліся — сёння ў горадзе з мабільнай сувяззю з самага ранку рабілася нешта незразумелае.

Геула з Янам сядзелі поплеч і маўчалі. Гэля нават задрамала, але тут пачуўся трэск, машына

рэзка затармазіла, а потым данеслася неразборлівая лаянка.

— Кола прабіла, — здагадаўся Ян.

— Слухай, — сказала Гэля, — а табе не падаецца, што ўсё гэта немагчыма?

— Падаецца, — адказаў Ян.

— Памятаеш, я на цябе ў Верхнім горадзе натрапіла? Я туды адну польку везла. На вуліцы выпадкова сустрэла.

— А я, — прамовіў Ян, — цябе на беразе Свіслачы знайшоў, таму што мне прапанавалі бясплатна праехаць роварам да парку Горкага.

— Пра Маладзечна я ўвогуле маўчу, — уздыхнула Геула.

— І цяпер ізноў, — усміхнуўся Ян. — Змовіліся яны, ці што?

Гэля на жарт не адрэагавала:

— Не, яны не маглі. Столькі featрознага народу, у розны час... Не бывае так!

У гэты момант звонку данеслася:

— Дамкрат!.. Што за дзень такі?!

Ян і Геула мімаволі пасміхнуліся.

— Факт застаецца фактам, — сказаў Ян. — Нехта спрабуе нас звесці.

— Ці нешта...

— Ды пайшлі яны! — злосна адказаў Ян. — Мы што, сабачкі, якіх на вязку прывезлі?

Геула нічога не сказала, толькі моцна сціснула вусны.

— Ведаеш што?! — гучна прамовіў Ян, звяртаючыся ўверх. — Не чапіся да нас болей! Мы самі дамо рады, зразумеў?!

Адказу не было. Тады Ян загадаў Гэлі:

— І ты таксама ім скажы... Ці яму!

— Так, — папрасіла Геула, — не трэба нас зводзіць. Мы самі як-небудзь...

— Ура! — пачуўся голас кіроўцы. — Сувязь з'явілася! Зараз аварыйку выклічам...

* * *

Наступныя два тыдні мінчукі знемагалі ад задухі. Мінск быццам перастаў дыхаць. Горад вельмі перайамаўся праз свой правал. Яму было балюча. І крыўдна. Ён вельмі любіў гэтых дваіх маладых упартых дурняў, але цяпер, калі яны шчыра папрасілі не турбаваць іх, нічога не мог зрабіць.

* * *

Ян валокся вуліцай. Сёння, у свой дзень народзінаў, яму зусім не хацелася святкаваць.

Вакол нічога не адбывалася. Ніхто не прапаноўваў яму пакатацца роварам бясплатна. Ніхто не кідаўся на яго з кухталямі. І сувязь працавала нармальна — вось толькі тэлефанаваць не было каму. З бацькамі толькі што пагутарыў і папрасіў не чапіцца да яго са сваімі бязглуздымі днямі народзінаў. Аднакласнікі даўно раз'ехаліся хто куды.

Ян усё ж такі выцягнуў смартфон, каб пракруціць спіс кантактаў наўздагад. Трапіў у «галасавую пошту». І пошта была пустая, ніхто не пакінуў яму паведамлення на аўтаадказчык. І раптам Ян зразумеў, каму ён хоча патэлефанаваць.

Не, пагутарыць асабіста!

* * *

За акном зноў мільгацелі краявіды як паштоўкі, гэтым разам ужо зусім летнія. Яркія жоўтыя палі рапсу змяняліся пяшчотна-блакітнымі, з квітнеючым ільном.

Маладзечна, як і мінулым разам, сустрэў Геулу цудоўным надвор'ем. Ад вакзала да каледжа яна валаклася нага за нагу.

Гэля натрапіла позіркам на дом Янавай бабулі, пачула сабачы брэх, адчула, як ёй у нагу торкнуўся халодны нос.

«Бяшка!» — узрадавалася Гэля.

Але не. Гэта быў зусім не Бяшка, а незнаёмая аўчарка. Таксама старая, таксама прыязная, таксама з бабуляй. Але не Бяшка.

Гэля дайшла да каледжа і села на прыступкі. Ёй падалося, што яна сядзіць на ганку зусім адна, нікому яна не патрэбная. І навакольны свет абыякавы. Дрэвы шамацяць пра нешта сваё. Вецер дзьме куды хоча. І ніхто не спрабуе ёй нешта сказаць. І ніхто не дасць ёй знак, што яна робіць не тое.

Гэля ўстала і пайшла да ўваходных дзвярэй. Ніякага руху паветра. Цішыня. Гэля ўзялася за дзвярную ручку. Тая павярнулася ідэальна лёгка. Дзверы не рыпнулі, парог не падсунуўся Геуле пад ногі.

«Ды што ж я раблю! — пранеслася ў Гэлі ў галаве. — Я ж насамрэч уцякаю ад сябе! Навошта?»

Гэля зачыніла дзверы і вярнулася на ганак.

* * *

Ліза адчыніла дзверы пасля пятага званка.

— Ян? — здзівілася яна.

— Мне патрэбная Геула, — сказаў ён.

— А яе няма, — разгубілася Гэліна маці. — Яна ў Маладзечне, дакументы падае... А ты штосьці хацеў?

— Я да Гэлі, — сказаў ён яшчэ раз, — наконт дня народзінаў.

— Адкуль ты ведаеш? — спытала Ліза.

— Што? — здзівіўся Ян.

— Пра дзень народзінаў.

Нейкі час Ян і Ліза ўважліва глядзелі адно на аднаго.

— Ну я... мне мама сказала, — збянтэжыўся Ян.

— Чыя мама? — спытала Ліза.

— Мая, — разгублена адказаў Ян. — І ў пашпарце маім напісана.

Ліза нейкі час маўчала. Асэнсоўвала інфармацыю.

— Ян, у цябе сёння дзень народзінаў? — удакладніла яна.

Ян ледзь не спытаў, ці не на падпітку Ліза. Утрымаўся ў апошні момант. Але, відаць, у яго ным позірку гэтае пытанне прачыталася.

— А ты а якой гадзіне нарадзіўся, — хутка спытала Ліза, — а другой удзень?

— Я не памятаю, — адказаў зусім ужо агаломшаны Ян.

Ліза глядзела ў акно і кусала вусны.

— Я пайду, напэўна, — сказаў Ян.

Ліза кіўнула. Але раптам не стрымалася:

— Проста ніхто не ведае, што сёння другі Гэлін дзень народзінаў. Нават яна не ведае, я ёй не казала. Відаць, яна захацела жыць, калі нарадзіўся ты.

У вачах Лізы заблішчалі слёзы.

— Выбачайце, — сказаў Ян, — мне трэба ісці!

— Пачакай! — папрасіла Гэліна маці, і Ян замёр напаўпаварота ад яе. — Я... — пачала Ліза, перапыніла сябе, зноўку працягвала: — Словам, мне трэба табе пра нешта распавесці. Я гэтага ўвогуле нікому не казала. Нават не згадвала ніколі. Але ты мусіш ведаць...

Яну вельмі не спадабаўся такі пачатак.

— Мы з Гэліным бацькам былі знаёмыя толькі вечар, — працягвала гаспадыня кватэры. — Зранку ён сышоў. Раней, чым я прачнулася. І болей мы з ім не бачыліся.

— Вырадак ён! — не стрымаўся Ян.

— Рэч у тым, што якраз не, — пакруціла галавой Ліза. — Ён пакінуў цыдулку. Казаў, што я вельмі... — яна зноўку абарвала сябе. — Карацей, ён збіраўся вярнуцца. Але не хацеў набівацца. Прасіў патэлефанаваць, каб я сказала. Так ці не. Пакінуў нумар. Я падрала яго і выкінула.

Ліза казала кароткімі сказамі, бо на доўгія не ставала дыхання. Ян пакутліва чырванеў. Яму ўсё болей хацелася збегчы.

— А цяпер я думаю, — Ліза глядзела ў сябе і размаўляла больш з сабою, — а калі б я патэлефанавала? І ў Геулы быў бы тата. Мы маглі разысціся. Або жыць душа ў душу. Або катаваць адно аднаго ўсе гэтыя гады. Але я ніколі пра гэта не даведаюся. Таму што спалохалася...

— Навошта вы мне пра ўсё гэта кажаце? — спытаў Ян.

Ліза апусціла галаву і адказала, звяртаючыся да дывана ў вітальні:

— Я Геулу адпусціла, каб яна пазбавілася страху. Але ж яна яго з сабою ўзяла. І я не разумею, што

з гэтым рабіць. А ты... Я ваш апошні ролік паглядзела... І той, дзе Гэля спіць... Шмат разоў...

Ян моўчкі набраў нумар на смартфоне. У адказ завібрыраваў Гэлін тэлефон у кішэні яе курткі на вешалцы. Ян скінуў выклік і на момант задумаўся.

— У вас ёсць Гэліна фотка? — спытаў ён. — Каб на паперы?

* * *

Геула сядзела ўжо вельмі доўга, ногі здранцвелі, але ўстаць моцы не было. Вакол па-ранейшаму панавала ідэальная цішыня, быццам увесь свет замёр, каб незнарок не даць дзяўчыне які-небудзь знак.

«Я збіраюся з'ехаць з дому, вучыцца не там, дзе хочацца, а там, дзе ёсць інтэрнат. Я расстаюся з мамай, разышлася з Янам... Што я ўвогуле раблю?»

Геуле раптам захацелася, каб той невядомы, хто зводзіў іх з Янам, ізноў падштурхнуў у спіну. Ці наадварот, кінуў у твар прыгаршчы пылу. Каб яна зразумела, што рабіць.

І тут яе кранулі за плячо. Гэта была маладая жанчына, гадоў дваццаці пяці, не болей. Яе можна было б прыняць за студэнтку каледжа, каб не надзвычай сціплы макіяж і строгі гарнітур, якія выдавалі ў ёй настаўніцу.

— Прабачце, — сарамліва спытала яна, — гэта ж вы?

Яна паказала Геуле экран свайго смартфона. Там сапраўды была Гэля буйным планам. Леташняе фота, з Вільні, куды яны ездзілі з маці папіць кавы.

— Так, — збянтэжана адказала Гэля.

— Тады вам трэба гэта паглядзець, — яшчэ болей засаромілася жанчына, усунула Геуле смартфон і адышла ўбок.

Гэля прыгледзелася, зразумела, што перад ёю стоп-кадр відэароліка. Праматала на пачатак — ролік стартаваў з той жа вільнюскай фоткі. За кадрам гучаў голас Яна:

— Шаноўнае спадарства! Гэтая дзяўчына знаходзіцца ў Маладзечне! Яна забылася тэлефон дома, а мне трэба тэрмінова ёй нешта сказаць! Калі пабачыце яе, пакажыце, калі ласка, ролік!

Фотаздымак знік з фокуса, і Гэля ўбачыла самога Яна.

— Геула, калі ласка, — сказаў ён, — даслухай да канца! Потым — што хочаш! Але даслухай!

Гэля мімаволі кіўнула.

— Я ведаю, — працягваў Ян, — табе страшна. І ты хочаш схавацца ў «хатку». Ну, як у дзяцінстве — «цур, я ў хатцы». І ніхто цябе не кране. Там, напэўна, вельмі спакойна. І ніхто не пакрыўдзіць. Можна вокны ўсе пазачыняць і дзверы — тады ні дождж, ні вецер...

Ян казаў усё хутчэй, ён пэўна баяўся, што Геула выключыць ролік, не пачуе самае галоўнае.

— Але ж і сонца таксама не трапіць, так? І свежае паветра... Там... Не ведаю... Птушак не пачуеш, салют не пабачыш. Спакойна, так... Але жыццё — гэта не калі спакойна! Гэта калі то ўгару, то долу! То светла, то цёмна... а потым зноўку светла! То плачаш, то смяешся!

Малюнак пачаў торгацца, быццам аператару зрабілася цяжка трымаць камеру, хоць Гэля добра бачыла: здымалі на смартфон.

— І ты прабач, я цябе напалохаў... Я болей не буду казаць тое слова, шчыра! Калі табе страшна — не буду! Але ж не ў словах праблема! Проста... Ты памятаеш наш развітальны ролік? Нам трэба быць побач! Не «я хачу» і не «давай паспрабуем», а проста трэба! І я...

Геула зразумела, што болей не можа на гэта глядзець. Яна тыцнула на паўзу, падбегла да гаспадыні тэлефона, вярнула яго і пабегла прэч ад каледжа.

— Але там яшчэ... — хацела спыніць яе настаўніца, аднак Геула не слухала.

Маладая жанчына зірнула на экран і націснула на прайграванне.

— ...цябе нікуды не адпушчу! — сказаў Ян. — Стой дзе стаіш! Я еду да цябе!

* * *

Ян на пероне прытупваў ад нецярплівасці. Калі абвясцілі электрычку на Маладзечна, ён ужо шкадаваў, што не паехаў таксоўкай. Але, як на бяду, электрычку ўсё не падавалі.

* * *

Геула стаяла ў тамбуры яшчэ ад Ждановічаў і ў думках падштурхоўвала цягнік, які павольна каціўся паміж шматпавярховікаў.

Выскачыла на «Мінску-Паўночным», як толькі дзверы пачалі расчыняцца, і замерла. На суседнім пероне, аддзеленым ад яе чыгуначнымі рэйкамі, стаяў Ян.

Цэлую секунду ён стаяў з разяўленым ротам, а потым закрычаў:

— Стой! Я зараз! — і кінуўся цераз рэйкі.

Ян ускочыў на перон, і яны моўчкі ўчапіліся адно ў аднаго, быццам насамрэч збіраліся ператварыцца ў сіямскіх блізнят.

Грымнуў аркестр, які зусім выпадкова ішоў вуліцай Кальварыйскай.

У суседнім двары знянацку выбухнуў феерверк.

Мінск выдыхнуў з палёгкай.

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Жвалеўскі** Андрэй Валянцінавіч
**Пастэрнак** Яўгенія Барысаўна

# СІЯМЦЫ

Аповесць

12+

Адказны за выпуск *Андрэй Янушкевіч*
Рэдактар *Паліна Грынчанка*
Карэктар *Наста Анцімонік*
Камп'ютарная вёрстка *Андрэй Янушкевіч*
Дызайн вокладкі *Ганна Мельнікава*

Падпісана да друку 12.01.2020. Дата вырабу 29.01.2020.
Фармат 84×108/32. Папера Classic Stora Enzo.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 13,5. Ул.-выд. арк. 7,6.
Наклад 700 экз. Заказ 2851.

Індывідуальны прадпрымальнік
Янушкевіч Андрэй Мікалаевіч.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы і распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/218 ад 18.03.2015.
Вул. Шафарнянская, 3/135, 220125 г. Мінск.
https://januskevic.by

Таварыства з дадатковай адказнасцю «Новапрынт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы і распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 2/54 ад 25.02.2014.
Вул. Геалагічная, 59, к. 4, п. 10, 220138 г. Мінск.

**У выдавецтве «ЯНУШКЕВІЧ»**
**апошнім часам выйшлі**

*Дж. К. Роўлінг*
Гары Потэр і філасофскі камень

*Ірына Данеўская*
Багуслаў Радзівіл. Генерал караля

*Януш Леон Вішнеўскі*
Канец адзіноты

**У выдавецтве «ЯНУШКЕВІЧ»**
**рыхтуюцца да друку**

*Яраслаў Гжэндовіч*
Гаспадар Ледзянога Саду. Том 2

*Даніэль Кельман*
Тыль

*Сяргей Балахонаў*
Бог кахання Марс

Шукайце нашы кнігі
ў выдавецкай анлайн-кнігарні
**JANUSKEVIC.BY**

Калі двое шаснаццацігадовых людзей створаны адно для аднаго, але ўпарта не разумеюць гэтага, умешваюцца ірацыянальныя сілы. Родны горад Мінск намагаецца атуліць іх любоўю, зводзіць разам, падключае ўсё новых памочнікаў...

Аднак героі з дзіўнай упартасцю не хочуць бачыць відавочнае. Дачытайце гэтую гісторыю — і вы зразумееце, што ўсе містычныя супадзенні ў вашым жыцці былі невыпадковыя. Вас кахаюць, трэба толькі навучыцца не адштурхоўваць гэтае каханне.



JANUSKEVIC.BY

9 789857 210336

ЯНУШКЕВІЧ
выдавецтва

СІЯМЦЫ



Андрэй Жвалеўскі, Яўгенія Пастэрнак

Андрэй Жвалеўскі
Яўгенія Пастэрнак

# СІЯМЦЫ







Калі двое шаснаццацігадовых людзей створаны адно для аднаго, але ўпарта не разумеюць гэтага, умешваюцца ірацыянальныя сілы. Родны горад Мінск намагаецца атуліць іх любоўю, зводзіць разам, падключае ўсё новых памочнікаў...

Аднак героі з дзіўнай упартасцю не хочуць бачыць відавочнае. Дачытайце гэтую гісторыю — і вы зразумееце, што ўсе містычныя супадзенні ў вашым жыцці былі невыпадковыя. Вас кахаюць, трэба толькі навучыцца не адштурхоўваць гэтае каханне.



JANUSKEVIC.BY

9 789857 210336

ЯНУШКЕВІЧ
выдавецтва